К.С. Льюіс

# Хронікі Нарніі

## Пляменнік чараўніка



Добрая кніга

Серыя «Добрая кніга»

К.С. Льюіс

# ХРОНІКІ НАРНІІ.

# ПЛЯМЕННІК ЧАРАЎНІКА

Аповесць

Пераклад з англійскай мовы



Мінск
«Пазітыў-цэнтр»
2016

*Сям'і Кілмер прысвячаецца*

# Пра галоўнага героя гэтай кнігі

«... Спадзяюся, прачытаўшы гэта, ты ўбачыш, што ў кнізе схаваны больш глыбокі сэнс. Уся гісторыя Нарніі — пра Хрыста. Я запытаў сябе: «Калі б сапраўды існаваў свет, падобны да Нарніі, і калі б справы ў ім (як у нашым свеце) пайшлі кепска, і калі б Хрыстос пажадаў прыйсці ў гэты свет і выратаваць яго (як Ён зрабіў у нашым), што б здарылася?» Гэтыя гісторыі — мой адказ. Нарнія — свет Гаваркіх Істотаў, і таму я падумаў, што там Ён стаў бы для іх Гаваркой Істотай, як Ён зрабіўся чалавекам тут. Я адлюстраваў Яго як ільва таму, што:

А) Леў лічыцца царом звяроў.

Б) У Бібліі Хрыста называюць "Ільвом Юды".

В) Мне сніліся дзіўныя сны пра львоў, калі я пачаў пісаць кнігу.

Кожная з кніг раскрывае сваю частку:

"Пляменнік чараўніка" распавядае пра стварэнне свету і пра тое, як зло прыйшло ў Нарнію;

"Леў, Вядзьмарка і гардэроб" — пра ўкрыжаванне і ўваскрасенне;

"Прынц Каспіян" — пра ўзнаўленне сапраўднай веры пасля адступніцтва;

"Конь і яго хлопчык" — пра пакліканне і навяртанне паганца;

"Падарожжа «Заваёўніка світанку»" — духоўнае жыццё (асабліва ў Рыпічыпа);

"Срэбнае крэсла" — працяглая вайна з сіламі цемры;

"Апошняя бітва" — прыход Антыхрыста (Малпы), канец свету і Апошні Суд».

*Клайв Стэйплз Льюіс у лісце да Ан, 5 сакавіка 1961 года.*

## Раздзел 1
# Не тыя дзверы

Гэтая гісторыя пра тое, што адбылося даўнымдаўно, калі ваш дзядуля быў яшчэ немаўляткам. Гісторыя вельмі важная, бо тлумачыць, як пачаліся вандроўкі з нашага свету ў Нарнію і назад.

У тыя часы містар Шэрлак Холмс яшчэ жыў на Бэйкер Стрыт і Бэстаблы[1] яшчэ шукалі скарб на Люішэм Роўд. У тыя часы хлопчыкі штодня мусілі насіць цвёрдыя каўняры, і школы былі горшыя, чым цяпер. Але вось ежа была лепшая, а што да цукерак, то не буду апісваць вам, якія смачныя і танныя яны былі, бо ад гэтага ў вас пацякуць слінкі. І ў тыя часы ў Лондане жыла дзяўчынка, якую звалі Полі Пламэр.

Яна жыла ў адным з дамоў, што стаялі цесным шэрагам, сцяна да сцяны. Аднойчы раніцай яна выйшла ў сад за домам і ўбачыла, як нейкі хлопец залез на плот з боку суседскага саду. Полі вельмі здзівілася, бо раней

[1] Бэстаблы – сям'я з прыгодніцкіх кніг ангельскай аўтаркі Эдзіт Нэсбіт.

у тым доме ніколі не было дзяцей. Там жылі старыя халасцякі: містар Кэтэрлі і міс Кэтэрлі, брат і сястра. Таму яна зацікаўлена паглядзела на хлопца. Яго твар быў вельмі брудны, нібыта ён спачатку выпацкаў рукі ў зямлі, моцна паплакаў і пасля выцер твар рукамі. Сказаць папраўдзе, амаль гэтак і было.

— Вітаю,— прамовіла Полі.

— Вітаю,— азваўся хлопчык.— Як цябе клічуць?

— Полі,— сказала Полі.— А цябе?

— Дыгары,— адказаў хлопчык.

— Ого, якое смешнае імя,— хіхікнула Полі.

— А Полі — яшчэ больш смешнае,— заўважыў Дыгары.

— Няпраўда,— запярэчыла Полі.

— Праўда,— адказаў Дыгары.

— Прынамсі, я ўмываюся,— сказала Полі.— Табе варта было зрабіць тое самае, асабліва пасля...— тут яна змоўкла. Яна збіралася мовіць: “Пасля таго, як ты плакаў,” але падумала, што гэта будзе нявetліва.

— Так, я плакаў! — сказаў Дыгары гучным голасам. Яму было ўсё адно, што пра яго падумаюць, бо ён быў моцна засмучаны.— Ты б таксама плакала,— працягнуў ён,— калі б усё жыццё пражыла за горадам, мела поні, у вас у садзе цякла рака, а пасля цябе прывезлі б жыць у гэтую жудасную дзірку.

— Лондан — зусім не дзірка! — абурылася Полі.

Але хлопчык быў настолькі ўзрушаны, што не звярнуў на яе ніякае ўвагі і працягнуў:

— ... і калі б твой бацька быў далёка ў Індыі, і табе трэба было пераехаць да цёткі і дзядзькі, сапраўднага вар'ята (а каму такое спадабаецца?), і калі б гэта было праз тое, што яны даглядаюць тваю маму, якая вельмі



хворая і... і... памірае.— Тут яго твар скрывіўся, як у чалавека, які спрабуе стрымаць слёзы.

— Я не ведала, прабач...— сказала Полі. І потым, каб перавесці размову на штосьці больш вясёлае, запыталася:

— Містар Кэтэрлі насамрэч вар'ят?

— Ну, ён ці з глузду з'ехаў,— адказаў Дыгары,— ці яшчэ што. Цётка Лэці забараняе мне заходзіць у яго кабінет на гарышчы. Ужо адно гэта падазрона. І вось яшчэ што: кожны раз, калі ён звяртаецца да мяне падчас абеду,— а з ёй ён ніколі нават не спрабуе паразмаўляць,— цётка загадвае яму змоўкнуць. Яна кажа: "Не турбуй хлопчыка, Эндру", або: "Я ўпэўненая, што Дыгары не хоча слухаць пра гэта", або: "Дыгары, ці не пагуляць табе ў садзе?"

— А што ён спрабуе сказаць?

— Я не ведаю. Ён ніколі не паспявае сказаць шмат. Але гэта яшчэ не ўсё. Учора ўвечары, калі я ішоў спаць, то праходзіў міма лесвіцы на гарышча. І мне здалося, што я пачуў ускрык.

— Магчыма, ён замкнуў там звар'яцелую жонку.

— Так, я пра гэта ўжо думаў.

— Або друкуе фальшывыя грошы.

— Ці, можа, ён быў пірат, як той чалавек у пачатку "Выспы Скарбаў", і ўвесь час хаваецца ад сваіх былых сяброў-піратаў.

— Як цікава! — сказала Полі.— Ніколі не думала, што твой дом такі незвычайны.

— Табе, можа, ён і здаецца цікавым,— адказаў Дыгары.— Але ты б так не думала, калі б табе давялося там спаць. Як бы табе спадабалася ляжаць без сну і прыслухоўвацца да крокаў дзядзькі Эндру, які крадзецца да дзвярэй твайго пакоя? І ў яго такія жудасныя вочы.

Так Полі і Дыгары пазнаёміліся. Быў пачатак летніх вакацыяў, ніхто з іх не паехаў на мора, і яны бачыліся ледзь не кожны дзень.

Іх прыгоды пачаліся перш за ўсё таму, што тое лета было адным з самых дажджлівых і халодных за апошнія гады. Таму дзеці даследавалі будынак. Проста дзіва, як шмат можна дазнацца з дапамогай свечкі ў вялікім доме ці ў двух суседніх дамах. Полі ўжо даўно разведала: калі адчыніць невялічкія дзверы ў каморы на гарышчы яе дома, пабачыш бак для вады і цёмны прагал за ім, у які можна асцярожна залезці. Гэты цёмны прагал нагадваў тунэль з цагляным мурам з аднаго боку і схілам даху з іншага. У даху былі невялічкія шчыліны паміж лістамі шыферу, праз якія прабівалася святло. Падлогі ў тунэля не было, даводзілася пераступаць з бэлькі на бэльку, а паміж імі быў толькі гіпс. І калі наступіш на яго, то правалішся наўпрост у пакой.



Прастора за бакам была кантрабандысцкай пячорай Полі. Яна прынесла туды рэшткі скрыняў, сядзенні ад старых крэслаў, іншыя рэчы такога ж кшталту і зрабіла паміж бэлькамі нейкае падабенства падлогі. Тут яна трымала скрынку з рознымі скарбамі, аповед, які яна пісала, і, само сабою, пару яблыкаў. Полі часта піла тут імбірны ліманад: старыя бутэлькі рабілі гэтае месца яшчэ больш падобным да пячоры кантрабандыстаў.

Дыгары спадабалася пячора (свой аповед Полі яму не паказала), але больш яго зацікавіў тунэль.

— Як ты думаеш,— запытаўся ён,— ці доўгі гэты тунэль? У сэнсе — ці ён сканчаецца там, дзе й твой дом?

— Не,— адказала Полі.— Ён цягнецца далей, не ведаю на колькі.

— Тады мы можам прабрацца ўздоўж усяго шэрагу дамоў.

— Так,— сказала Полі.— І... ого, неверагодна!

— Што?

— Мы можам трапіць у іншыя дамы.

— І нас схопяць як злодзеяў! Ну не, дзякуй.

— Разумнік. Я думала пра наступны дом пасля твайго.

— А што ў ім такога?

— Ён пусты. Тата кажа, што, колькі мы тут жывём, ён заўсёды быў пусты.

— Слухай, давай паглядзім, што там,— сказаў Дыгары. Ён быў значна больш узрушаны, чым можна было б меркаваць па яго голасе. Вядома ж, ён (як і вы на яго месцы) думаў пра розныя прычыны, чаму гэты дом так доўга стаяў пусты. Полі таксама разважала пра гэта. Ніхто з іх не вымавіў словаў "дом з прывідамі", і абодва адчувалі: калі ўжо ўзнікла ідэя паглядзець, што ў гэтым доме, было б ганьбай адступіць.

— Як наконт прабрацца туды зараз? — запытаўся Дыгары.

— Давай,— пагадзілася Полі.

— Можам не ісці, калі не хочаш,— сказаў Дыгары.

— Я пайду, калі ты пойдзеш,— адказала яна.

— А як мы даведаемся, што мы менавіта ў тым доме?

Яны вырашылі, што вернуцца на гарышча і памераюць крокамі яго, а таксама адлегласць ад адной бэлькі да наступнай. Так яны даведаюцца, колькі бэлек над адным пакоем. Пасля трэба будзе дадаць яшчэ прыкладна чатыры крокі на адлегласць паміж двума гарышчамі і столькі ж на спальню абслугі. Такім чынам атрымаецца даўжыня аднаго дома. Калі прайсці такую адлегласць двойчы, яны будуць у канцы дома Дыгары. Пасля любыя дзверы прывядуць іх у пусты дом.

— Але я не думаю, што ён сапраўды пусты,— сказаў Дыгары.

— А што ты думаеш?

— Мяркую, там нехта таемна жыве і выходзіць толькі ўначы з ліхтаром. А раптам мы выкрыем банду злачынцаў і атрымаем узнагароду? Не можа быць, каб дом пуставаў усе гэтыя гады. У ім павінна быць нейкая таямніца.

— Тата казаў, што гэта, магчыма, з-за каналізацыі,— прамовіла Полі.

— Пфф! Дарослыя заўсёды знаходзяць нецікавыя тлумачэнні,— сказаў Дыгары.

Цяпер, калі яны размаўлялі пры дзённым святле, а не пры свечках у Кантрабандысцкай Пячоры, ім здавалася значна менш верагодным, што ў пустым доме жывуць прывіды.

Яны памералі крокамі гарышча, узялі аловак і склалі, што ў іх атрымалася. Напачатку ў іх выйшлі розныя адказы, і нават калі яны нарэшце вынайшлі агульны, я не ўпэўнены, што ён быў слушны. Але дзеці спяшаліся распачаць экспедыцыю.

— Трэба ісці ціха,— сказала Полі, пакуль яны ізноў прабіраліся за бак з вадой. Паколькі справа была сур'ёзнай, кожны з іх узяў свечку (у Полінай пячоры іх захоўвалася шмат).

У тунэлі было вельмі цёмна, пыльна, а таксама цягнула пройма. Яны пераступалі з бэлькі на бэльку моўчкі і толькі шапталі адно аднаму: “Мы прайшлі вашае гарышча”, або: “Тут павінна быць сярэдзіна нашага дома”. Ніхто з іх не спатыкнуўся, свечкі не згаслі, і нарэшце яны дабраліся да маленькіх дзвярэй справа ад іх. Вядома, дзверы былі без ручкі ці засаўкі на гэтым баку, бо яны былі зробленыя, каб выходзіць, а не заходзіць. Але меўся шпінгалет (як у гардэробах), і дзеці не сумняваліся, што патрапяць унутр.

— Адчыняць? — запытаўся Дыгары.

— Я пайду, калі ты пойдзеш,— паўтарыла Полі.

Абое адчувалі, што ўсё вельмі сур'ёзна, але ніхто з іх не павярнуў назад. Дыгары з намаганнем адсунуў шпінгалет. Дзверы расчыніліся, і дзеці заміргалі ад нечаканага святла, з вялікім здзіўленнем зразумеўшы, што яны не на закінутым гарышчы, а ў пакоі з мэбляй.



Зрэшты, мэблі тут было няшмат. Панавала ціша. Зацікаўленая пабачаным, Полі задзьмула свечку і бязгучна, як мыш, зайшла ў дзіўны пакой.

Па форме ён быў, вядома, як гарышча, але абстаўлены як гасцёўня. Кожны сантыметр сцен быў заняты паліцамі,

і кожны сантыметр паліц быў застаўлены кнігамі. У каміне гарэў агонь (вы памятаеце, што лета ў тым годзе было вельмі вільготнае і халоднае), перад камінам стаяў фатэль з высокай спінкай. Паміж фатэлем і Полі месціўся, займаючы амаль усю сярэдзіну пакоя, вялікі стол, завалены самымі рознымі рэчамі. Там былі кнігі, нататнікі, бутэлечкі з атрамантам, пёры для пісання, воск і мікраскоп. Але першае, што кінулася ў вочы,— ярка-чырвоны драўляны паднос, на якім ляжалі некалькі пярсцёнкаў. Яны былі парныя: адзін зялёны і адзін жоўты разам, пасля крыху месца, пасля яшчэ адзін жоўты і адзін зялёны. Памерам яны былі як і звычайныя пярсцёнкі. Іх нельга было не заўважыць: так зырка яны блішчалі. Гэта былі самыя цудоўна-бліскучыя дробныя рэчы, якія толькі можна ўявіць. Калі б Полі была крыху меншай, ёй захацелася б пакласці адзін з іх у рот.

У пакоі было настолькі ціха, што чулася, як цікае гадзіннік. Але суцэльнай цішыні не было. Аднекуль даносілася слабое — вельмі-вельмі слабое — гудзенне. Калі б у тыя дні ўжо вынайшлі пыласосы, Полі падумала б, што гэта далёкі гул пыласоса — некалькімі пакоямі далей і некалькімі паверхамі ніжэй. Але гук быў больш прыемны і больш музыкальны, адно што ледзь чутны.

— Усё ў парадку, тут нікога няма,— сказала Полі. Яна ўжо не шаптала. Дыгары, вельмі брудны, як, дарэчы, і Полі, міргаючы, зайшоў у пакой.

— Кепска,— адказаў ён.— Гэты дом зусім не пусты. Лепей нам сысці, пакуль ніхто не прыйшоў.

— Як ты думаеш, што гэта? — запыталася Полі, паказваючы на рознакаляровыя пярсцёнкі.

— Ды кінь ты,— сказаў Дыгары.— Чым хутчэй...

Ён так і не скончыў фразы, бо ў гэты момант нешта адбылося. Фатэль з высокай спінкай, які стаяў перад агнём, раптоўна павярнуўся, і з яго, як дэман у спектаклі, паднялася вусцішная постаць дзядзькі Эндру. Яны былі зусім не ў пустым доме, а ў тым самым кабінеце ў доме Дыгары, куды яму было забаронена заходзіць! Дзеці разам выгукнулі: "Во-о-ой!", зразумеўшы сваю жахлівую памылку. Трэба было раней здагадацца, што яны прайшлі недастаткова!

Дзядзька Эндру быў высокі і вельмі худы. У яго быў доўгі добра паголены твар, востры нос, вельмі яскравыя вочы і зблытаная кучма сівых валасоў.

Дыгары заняло мову, бо цяпер дзядзька Эндру выглядаў у тысячы разоў больш небяспечным, чым калі-небудзь. Полі пакуль што не настолькі спужалася, але хутка ёй стала страшна. Таму што дзядзька Эндру перасёк пакой і замкнуў дзверы на ключ. Потым павярнуўся, паглядзеў на дзяцей сваімі яскравымі вачыма і ўсміхнуўся, паказваючы ўсе зубы.

— Вось так! — сказаў ён.— Цяпер мая бязглуздая сястра не зможа да вас дабрацца!

Звычайна дарослыя так сябе не паводзяць. Сэрца Полі скокнула ў горла, і яны з Дыгары пачалі адступаць да маленькіх дзвярэй, праз якія сюды трапілі. Але дзядзька Эндру быў хутчэйшы. Ён зайшоў ззаду, замкнуў тыя дзверы і стаў перад імі. Потым ён пацёр рукі і храбуснуў костачкамі. У яго былі вельмі доўгія прыгожыя белыя пальцы.

— Рады вас бачыць,— прамовіў ён.— Двое дзяцей — якраз тое, што мне трэба.

— Калі ласка, містар Кэтэрлі,— сказала Полі.— Ужо амаль час абедаць, і мне трэба ісці дадому. Адпусціце нас, калі ласка.

— Не зараз,— адказаў дзядзька Эндру.— Я не магу страціць такую цудоўную магчымасць. Мне якраз не хапала дваіх дзяцей. Разумееце, я праводжу вялікі эксперымент. Я спрабаваў на марскіх свінках, і ўсё спрацавала. Але марскія свінкі нічога не могуць распавесці. Ім не растлумачыш, як вярнуцца.

— Паслухайце, дзязька Эндру,— сказаў Дыгары.— Ужо сапраўды час абедаць, і нас пачнуць шукаць у любы момант. Вы мусіце адпусціць нас.

— Мушу? — запытаўся ён.

Дыгары і Полі паглядзелі адно на аднаго. Яны не наважыліся нічога сказаць, але погляды азначалі: “Гэта жахліва!” і: “Нам трэба яго неяк улагодзіць”.

— Калі вы зараз адпусціце нас на абед,— сказала Полі,— мы вернемся пасля.

— Так, але як вы дакажаце, што вернецеся? — запытаўся дзядзька Эндру з хітрай усмешкай. Ды раптам ён нібыта перадумаў.

— Добра,— пагадзіўся ён.— Калі вам сапраўды трэба ісці, то ідзіце. Не думаю, што двум маладым людзям будзе цікава размаўляць з такім старым дурнем, як я.— Ён уздыхнуў і працягнуў: — Вы нават не ўяўляеце, якім самотным я часам пачуваюся. Аднак неістотна... Ідзіце абедайце. Але я хачу падарыць вам нешта, перш чым вы пойдзеце. Не кожны дзень я бачу ў маім затхлым старым кабінеце маленькіх дзяўчат. Асабліва, калі мне дазволена так казаць, такіх прыгожых маленькіх лэдзі, як вы.

Полі пачала думаць, што, магчыма, не такі ўжо ён, урэшце, і вар'ят.

— Падарыць табе пярсцёнак, мая даражэнькая? — спытаў дзядзька Эндру.

— Вы маеце на ўвазе адзін з гэтых жоўтых і зялёных пярсцёнкаў? — усклікнула Полі.— Як цудоўна!

— Толькі не зялёны,— сказаў дзядзька Эндру.— Баюся, зялёны я падарыць не магу. Але я з задавальненнем і любоўю аддам табе любы жоўты пярсцёнак. Хадзі сюды і надзень адзін з іх.

Полі ўжо не баялася. Вядома, гэты стары чалавек ніякі не вар'ят. А ў гэтых ярkіх пярсцёнках ёсць нешта вельмі прыцягальнае. Яна падышла да стала.

— Нішто сабе! Мне здаецца,— сказала яна,— што гудзенне тут грамчэйшае. Нібыта яно ідзе ад пярсцёнкаў.

— Якая дзіўная думка,— адказаў дзядзька Эндру, усміхнуўшыся. Яго смяшок гучаў вельмі натуральна, але Дыгары ўбачыў прагны, амаль сквапны, выраз на яго твары.

— Полі! Стой! — крыкнуў ён.— Не чапай іх!

Але было занадта позна. Акурат у той час, калі ён крыкнуў гэта, Полі дакранулася да аднаго з пярсцёнкаў і імгненна, без выбліску ці шуму, знікла. Дыгары і яго дзядзька засталіся ў пакоі адны.

## Раздзел 2
# Дыгары і яго дзядзька

Гэта было настолькі нечакана і страшна, нават горш ад начнога кашмару, што Дыгары ўскрыкнуў. Рука дзядзькі Эндру імгненна закрыла яму рот.

— Ціха! — прашыпеў ён на вуха хлопчыку.— Калі ты пачнеш шумець, твая маці пачуе, а ты ведаеш, што з ёй можа здарыцца, калі яна спалохаецца.

Як Дыгары казаў пасля, яму ледзь не стала млосна ад такой жудаснай подласці. Але ён, вядома, больш не крычаў.

— Вось так,— сказаў дзядзька Эндру.— Зрэшты, я цябе разумею. Упершыню пабачыць, як нехта знікае,— гэта сапраўды шок. Нават я ўразіўся, калі марская свінка знікла ўчора вечарам.

— Дык гэта вы тады ўскрыкнулі? — запытаўся Дыгары.

— Ты пачуў? Спадзяюся, ты не шпіёніў за мной?

— Не,— гнеўна адказаў Дыгары.— Але што здарылася з Полі?

— Павіншуй мяне, мой дарагі хлопчык,— мовіў дзядзька Эндру, паціраючы рукі.— Мой эксперымент атрымаўся. Нашая маленькая дзяўчынка знікла з гэтага свету.

— Што вы з ёй зрабілі?

— Адправіў яе, так бы мовіць, у іншае месца.

— Што вы маеце на ўвазе?

Дзядзька Эндру сеў і сказаў:

— Я распавяду табе. Ты чуў калі-небудзь пра старую місіс Лефэй?

— Яна была маёй стрыечнай бабуляй? — запытаўся Дыгары.

— Не зусім,— адказаў дзядзька Эндру.— Яна была мая хросная. Гэта яе партрэт там, на сцяне.

Дыгары паглядзеў і ўбачыў выцвілы фотаздымак старой жанчыны ў каптуры. І цяпер ён узгадаў, што аднойчы бачыў здымак гэтай жа самай жанчыны дома, у старасвецкай камодзе. Ён запытаўся ў маці, хто гэта, але маці не надта хацела пра яе гаварыць. Твар у жанчыны быў непрыемны, падумаў Дыгары. Але па старых фотаздымках ніколі нельга сказаць з упэўненасцю.

— А хіба... Мне здавалася, з ёй было нешта не так? — запытаўся Дыгары.

— Ну,— сказаў дзядзька Эндру,— гэта залежыць ад таго, што ты называеш “не так”. Людзі не ўмеюць мысліць шырока. Яна, вядома, стала вельмі дзіўнай у старасці. Рабіла вельмі неразумныя рэчы. Таму яе і замкнулі.

— У вар’ятні, вы маеце на ўвазе?

— О не-не,— адказаў дзядзька Эндру,— зусім не. Яе проста пасадзілі ў турму.

— Ого! — усклікнуў Дыгары.— Што яна зрабіла?

— Бедная жанчына,— уздыхнуў дзядзька Эндру.— Паводзіла сябе вельмі неабачліва. Шмат было рознага, не мае сэнсу корпацца ва ўсім. Яна заўсёды была вельмі добрай да мяне.

— Але паслухайце, якое дачыненне гэта мае да Полі? Я б вельмі хацеў, каб…

— Усё ў свой час, мой хлопчык,— сказаў дзядзька Эндру.— Старая місіс Лефэй выйшла з турмы перад смерцю, і я быў сярод тых нямногіх, каго яна прымала. Яна не любіла звычайных, прымітыўных людзей, разумееш. Я сам іх не люблю. Нас з ёй цікавілі адны і тыя ж рэчы. За некалькі дзён да смерці яна загадала мне падысці да старой камоды, адчыніць патаемную шуфлядку і дастаць куфэрачак, які там быў. Як толькі я ўзяў яго, у мяне закалола ў пальцах, і я зразумеў, што трымаю ў руках нейкую вялікую таямніцу. Яна аддала куфэрак мне і змусіла паабяцаць, што я не буду



заглядаць унутр і спалю яго, як толькі яна памрэ. Я не стрымаў гэтае абяцанне.

— Ведаеце, вы зрабілі кепска,— зазначыў Дыгары.

— Кепска? — перапытаў дзядзька Эндру, збянтэжана глянуўшы на хлопца.— А, зразумеў. Ты маеш на ўвазе, што маленькія хлопчыкі мусяць выконваць абяцанні. Вельмі слушна, і я рады, што цябе гэтаму навучылі. Але ты павінен зразумець, што правілы такога кшталту, якімі б высакароднымі яны ні здаваліся маленькім хлопчыкам, ці слугам, ці жанчынам, ці нават людзям наогул, не могуць стасавацца да выбітных навукоўцаў, вялікіх мысляроў і мудрацоў. Не, Дыгары. Такія, як я, што валодаюць таемнымі ведамі, вольныя ад агульных правілаў і адрэзаныя ад агульных радасцяў. Нам прыгатаваны вышэйшы і самотны лёс, мой хлопчык.

Сказаўшы гэта, ён уздыхнуў, выглядаючы так урачыста, высакародна і загадкава, што на секунду Дыгары

падумаў: дзядзька Эндру сапраўды сказаў нешта слушнае. Але потым хлопец узгадаў агідны выраз на дзядзькавым твары за імгненне да таго, як знікла Полі, і адразу зразумеў, што хавалася за пафаснымі словамі. "Гэта азначае,— сказаў Дыгары сам сабе,— што ён думае, нібыта яму дазволена рабіць усё, каб атрымаць, што ён хоча".

— Вядома,— працягваў дзядзька Эндру,— я доўгі час не наважваўся адчыніць той куфэрачак, бо ведаў, што ў ім можа быць нешта вельмі небяспечнае. Мая хросная была асаблівай жанчынай. Рэч у тым, што яна была адной з апошніх смяротных у гэтай краіне, якія мелі ў сваім родзе фей. Яна казала, што ў яе час было яшчэ дзве такіх. Адна — герцагіня, а другая — прыбіральшчыца. Насамрэч, Дыгары, ты зараз размаўляеш з апошнім чалавекам, у каго хросная была фея. Вось так! Табе будзе што ўзгадаць, калі станеш стары.

"Яна была злая фея",— падумаў Дыгары і прамовіў:

— Але што наконт Полі?

— Ды што ты прычапіўся да гэтай тэмы! — усклікнуў дзядзька Эндру.— Гэта ж неістотна! Спярша я, вядома, вывучыў сам куфэрак. Ён быў вельмі старажытны. Ужо тады я ведаў дастаткова, каб зразумець, што ён не з Грэцыі, не са старажытнага Егіпта, Вавілона, Хецкай дзяржавы ці Кітая. Ён быў

куды старэйшы за ўсе гэтыя нацыі. О, гэта быў вялікі дзень, калі я спазнаў праўду. Куфэрак быў са зніклай выспы Атлантыда. Гэта азначала, што ён існаваў на стагоддзі раней за любыя рэчы з каменнага веку. І ён не быў падобны да гэтых грубых недасканалых вырабаў. Бо на пачатку часоў Атлантыда ўжо была вялікім горадам з палацамі, храмамі і адукаванымі людзьмі.

Ён спыніўся на імгненне, нібыта чакаючы, што пляменнік нешта скажа. Але дзядзька Эндру з кожнай хвілінай падабаўся Дыгары ўсё меней і меней, таму ён нічога не сказаў.

— Прайшоў час,— працягваў дзядзька Эндру,— і рознымі шляхамі (было б няправільна адкрываць іх дзіцяці) я даведаўся пра Магію агулам. Гэта значыць, што я меў даволі выразнае ўяўленне пра тое, што магло быць у куфэрку. Праводзячы розныя эксперыменты, я змог звузіць колькасць варыянтаў. Мне давялося пазнаёміцца з некаторымі, ну... некаторымі надзвычай дзіўнымі людзьмі і прайсці праз некаторыя страшэнна непрыемныя рэчы. Ад гэтага ў мяне пасівелі валасы. Бо нельга проста так узяць і стаць чараўніком. У выніку маё здароўе было падарванае. Але я ачуняў. І вось урэшце я пра ўсё даведаўся.

І хаця ніхто не мог іх пачуць, ён нахіліўся і амаль прашаптаў:

— У скарбонцы з Атлантыды было штосьці з іншага свету, прынесенае тады, калі наш свет толькі пачынаўся.

— Што? — запытаўся Дыгары, які нечакана для сябе моцна зацікавіўся.

— Толькі пыл,— адказаў дзядзька Эндру.— Дробны сухі пыл. Нічога асаблівага. Але калі я паглядзеў на яго (я прыклаў усе намаганні, каб да яго не дакранацца) і падумаў, што кожная пылінка была ў іншым свеце,— я не маю на ўвазе іншую планету, ведаеш, бо яны — частка нашага свету і да іх можна дабрацца, калі паляцець дастаткова далёка,— у сапраўдным Іншым Свеце, іншай Прыродзе, недзе, куды б ты не здолеў дабрацца, нават калі б ляцеў скрозь космас вечна; у свеце, куды можна трапіць толькі з дапамогай чараўніцтва,— вось!

Тут дзядзька Эндру пацёр рукі так, што костачкі затрашчалі, як феерверк.

— Я ведаў,— працягнуў ён,— што гэты пыл перанясе цябе туды, адкуль ён быў узяты, калі надаць яму належную форму. Але належную форму было цяжка знайсці. Усе мае ранейшыя эксперыменты ляснулі. Я спрабаваў на марскіх свінках. Некаторыя з іх проста памерлі. Некаторыя выбухалі, як маленькія бомбачкі...

— Гэта вельмі жорстка,— сказаў Дыгары, у якога некалі была марская свінка.

— Не перапыняй! — абурыўся дзядзька Эндру.— Жывёлы існуюць для гэтага. Я сам іх набываў. Так, пра што я казаў? А, вось. Нарэшце ў мяне атрымалася зрабіць жоўтыя пярсцёнкі. Але з'явілася новая праблема. Цяпер я быў упэўнены, што жоўты пярсцёнак адашле любое стварэнне, якое да яго дакранецца, у Іншае Месца. Аднак якая з гэтага карысць, калі адтуль ніхто не вернецца, каб распавесці мне, што там?

— А як жа тыя, што апынаюцца ў Іншым Месцы? — сказаў Дыгары.— У добрую ж сітуацыю яны трапляюць, калі не могуць вярнуцца!

— Ты ўсё яшчэ глядзіш на рэчы з няправільнага боку,— прамовіў дзядзька Эндру нецярпліва.— Ці ты не разумееш, што гэта выбітны эксперымент? Я хачу даведацца, якое яно, Іншае Месца. Таму неабходна кагосьці туды паслаць.

— У такім выпадку чаму вы самі не адправіцеся туды?

Дыгары ніколі не бачыў, каб некага так здзівіла і абразіла такое простае пытанне.

— Я? Я сам?! — усклікнуў дзядзька Эндру.— Ты, напэўна, звар'яцеў! Чалавеку майго ўзросту і стану здароўя зведаць шок ды небяспеку раптоўнага перанясення ў адрозны ад нашага свет? Ніколі ў жыцці не чуў такой бязглуздзіцы! Ты разумееш, што кажаш?

Падумай, што азначае Іншы Свет: ты можаш сустрэць там усё, што заўгодна. Што заўгодна!

— І толькі што вы адправілі туды Полі,— вымавіў Дыгары. Яго шчокі палалі ад гневу.— Нават нягледзячы на тое, што вы мой дзядзька,— дадаў ён,— я магу сказаць толькі адно: адправіць дзяўчыну замест сябе можа толькі баязлівец.

— А ну змоўкніце, малады чалавек! — сказаў дзядзька Эндру, апусціўшы рукі на стол.— Я не збіраюся трываць такога абыходжання ад маленькага мурзатага школьніка. Ты не разумееш! Я — выбітны навуковец, чараўнік, майстар, які праводзіць дослед! Вядома ж, мне патрэбныя суб'екты, на якіх яго праводзіць. Глянь-це на яго! Ты яшчэ скажы, што мне трэба было запытацца дазволу ў марскіх свінак, перш чым іх выкарыстоўваць! Нельга дасягнуць вялікай мудрасці без ахвяраў. Але ідэя пайсці самому — гэта бязглуздзіца. Гэта як прасіць генерала біцца замест звычайнага жаўнера. А калі мяне заб'юць, што стане са справай усяго майго жыцця?

— Ды хопіць ужо,— сказаў Дыгары.— Вы збіраецеся вярнуць Полі?

— Я збіраўся сказаць табе, але ў той момант ты груба мяне перапыніў,— адказаў дзядзька Эндру.— Нарэшце я знайшоў спосаб вярнуцца. Зялёныя пярсцёнкі вяртаюць назад.

— Але ў Полі няма зялёнага пярсцёнка.

— Няма,— прамовіў дзядзька Эндру з бязлітаснай усмешкай.

— Тады яна не зможа вярнуцца! — крыкнуў Дыгары.— Гэта ўсё адно, што вы забілі б яе!

— Яна можа вярнуцца,— адказаў дзядзька Эндру,— калі нехта іншы, надзеўшы жоўты пярсцёнак, пойдзе за ёю і возьме два зялёныя: адзін, каб вярнуцца самому, і адзін, каб вярнуць яе.



Цяпер Дыгары, вядома, зразумеў пастку, у якую яго злавілі. І ён вырачыўся на дзядзьку Эндру, нічога не кажучы і шырока адкрыўшы рот. Яго шчокі збялелі.

— Спадзяюся,— сказаў дзядзька Эндру вельмі важным і ўладарным голасам, нібыта ён быў узорным дзядзькам, які толькі што даў некаму каштоўную падказку і добрую параду,— спадзяюся, Дыгары, што ты не баязлівец. Мне будзе вельмі непрыемна думаць, што нехта з нашай

сям'і не мае дастаткова годнасці і высакароднасці, каб прыйсці на дапамогу — э-гм — даме ў небяспецы.

— Хопіць ужо! — адказаў Дыгары.— Калі б вы мелі хоць які-колечы гонар, вы пайшлі б самі. Але я ведаю, што вы гэтага не зробіце. Добра. Відаць, мне давядзецца пайсці. Вы сапраўдны мярзотнік. Вы ўсё гэта спланавалі, каб яна, не ведаючы, пайшла, і каб пасля я быў вымушаны адправіцца за ёю.

— Вядома,— сказаў дзядзька Эндру з гнюсней усмешкай.

— Выдатна. Я пайду. Але ёсць адна рэч, якую я скажу спярша. Да сённяшняга дня я не верыў у чарадзейства. Цяпер бачу, што яно ёсць. Калі так, значыць, усе старыя казкі больш-менш праўдзівыя, і якраз вы — той зламысны, бязлітасны чараўнік, як у казках. І ведаеце, я ніколі не чытаў гісторыі, у якой такія людзі ў канцы не атрымалі б па заслугах. Магу паспрачацца, што вы таксама атрымаеце. І так вам і трэба.

З усяго, што выказаў Дыгары, гэта сапраўды закранула дзядзьку Эндру. Ён здрыгануўся, і на яго твары з'явіўся такі жах, што, хаця ён і быў страшэннай пачварай, яго амаль што хацелася пашкадаваць. Але праз імгненне ён узяў сябе ў рукі і з даволі-такі змушаным смяшком мовіў:

— Так, так, мяркую, такая думка натуральная для дзіцяці, якога гадавалі жанчыны. Жаночая балбатня,

га? Дыгары, не думаю, што табе трэба хвалявацца аб пакаранні, якое пагражае мне. Ці не лепей падумаць пра небяспеку, у якой знаходзіцца твая сяброўка? Яна знікла ўжо даволі даўно. Калі Там ёсць нейкая пагроза, ведаеш, будзе крыўдна спазніцца на імгненне.

— Нібыта вас гэта моцна турбуе,— агрызнуўся Дыгары.— Але мне ўжо да смерці надакучылі гэтыя размовы. Што трэба рабіць?

— Табе сапраўды варта навучыцца кантраляваць свой тэмперамент, хлопчык мой,— халодна сказаў дзядзька Эндру.— Інакш вырасцеш такім жа, як твая цётка Лэці. Так. Хадзі сюды.

Ён падняўся, надзеў пальчаткі і падышоў да падноса, на якім ляжалі пярсцёнкі.

— Яны працуюць толькі тады,— патлумачыў ён,— калі датыкаюцца непасрэдна тваёй скуры. У пальчатках я магу браць іх — вось так,— і нічога не адбываецца. Калі такі пярсцёнак ляжыць у цябе ў кішэні, нічога не здарыцца. Але, вядома ж, тады трэба быць асцярожным, каб не апусціць руку ў кішэню і выпадкова не дакрануцца да яго. Ты знікнеш з гэтага свету ў той момант, калі дакранешся да жоўтага пярсцёнка. Калі ты будзеш у Іншым Свеце, я мяркую... вядома, гэта яшчэ не даказана, але я мяркую, як толькі ты дакранешся да зялёнага пярсцёнка, ты знікнеш з Таго Свету і зноў з'явішся ў гэтым. Цяпер я бяру два зялёныя пярсцёнкі

і кладу іх у тваю правую кішэню. Добра запомні, у якую. Адзін для цябе і адзін для дзяўчынкі. А зараз вазьмі адзін жоўты пярсцёнак сабе. На тваім месцы я надзеў бы яго на палец. Каб не згубіць.

Дыгары ўжо амаль узяў жоўты пярсцёнак, але раптам узгадаў адну рэч.

— Паслухайце,— сказаў ён.— А як жа мама? Раптам яна запытаецца, дзе я?

— Чым хутчэй ты выправішся, тым хутчэй вернешся,— бадзёра адказаў дзядзька Эндру.

— Але вы не можаце дакладна сказаць, ці змагу я вярнуцца.

Дзядзька Эндру перасмыкнуў плячыма, перасёк пакой, расчыніў дзверы і сказаў:

— Як сабе хочаш. Можаш спускацца ўніз на абед. Пакінь дзяўчынку на з'ядзенне дзікім звярам. Ці хай яна патоне, ці памрэ з голаду, ці згубіцца, калі ты так вырашыў. Мне ўсё адно. Магчыма, перад гарбатай ты можаш забегчы да місіс Пламэр і патлумачыць, што яна ніколі больш не пабачыць сваёй дачкі, бо ты збаяўся надзець пярсцёнак.

— Каб вы толькі ведалі,— сказаў Дыгары,— як бы я хацеў быць дарослым, каб даць вам у нос!

Потым зашпіліўся, глыбока ўздыхнуў і ўзяў пярсцёнак. І падумаў (як заўсёды думаў і пазней), што іншага годнага выйсця не было.

## Раздзел 3

# Лес Паміж Сусветамі

Дзядзька Эндру і кабінет адразу ж зніклі. Потым на імгненне ўсё змяшалася. Пасля Дыгары ўсвядоміў мяккае зялёнае святло, якое тачылася зверху, і цемру ўнізе. Выглядала на тое, што ён ні на чым не стаяў, не сядзеў і не ляжаў. Ён ні да чаго не дакранаўся.

"Думаю, я ў вадзе,— сказаў сам сабе Дыгары.— Ці пад вадой". На секунду гэтая думка спалохала яго, але амаль адразу ён адчуў, што хутка падымаецца наверх. Затым раптоўна вынырнуў і пачаў караскацца на роўны ўтравелы бераг.

Падняўшыся на ногі, ён заўважыў, што з яго не капае вада і ён не аддыхваецца, чаго варта было чакаць. Адзенне было сухое. Ён стаяў у лесе, на краі невялічкага азярка, не больш чым тры метры ад аднаго берага да іншага. Дрэвы раслі блізка адно да аднаго, і на іх было так шмат лістоты, што неба не праглядалася. Святло было зялёнае, бо праходзіла праз лісце, і сонца мусіла

быць вельмі моцным, бо святло было яскравае і цёплае. Гэта быў самы ціхі лес, які толькі можна сабе ўявіць. У ім не было ані птушак, ані кузурак, ані жывёлаў, ані ветру. Здавалася, можна было пачуць, як растуць дрэвы. Азярко, з якога ён толькі што вынырнуў, было не адзінае. Навокал такіх былі дзясяткі: праз кожныя некалькі метраў — наколькі хапала зроку. Можна было амаль адчуць, як дрэвы п'юць ваду каранямі. Гэты лес быў жывы. Калі Дыгары спрабаваў апісаць тое месца пасля, ён заўсёды казаў: "Яно было насычанае, як слівавы пірог".



Але самае дзіўнае было тое, што, нават як след не агледзеўшыся, хлопчык забыўся, чаму сюды трапіў. Прынамсі, ён дакладна не думаў ні пра Полі, ні пра дзядзьку Эндру, ні нават пра маму. Ён не адчуваў ні страху, ні хвалявання, ані цікавасці. Калі б у яго запыталіся: "Адкуль ты?" — ён напэўна сказаў бы: "Я заўсёды тут быў". У гэтым месцы ты адчуваў бы сябе так, нібыта заўжды знаходзіўся тут і табе ніколі не было сумна, хаця тут ніколі нічога не адбывалася. Як казаў Дыгары значна пазней: "Гэта не тое месца, дзе нешта адбываецца. Дрэвы растуць, вось і ўсё".

Пасля таго як Дыгары доўгі час глядзеў на лес, ён заўважыў дзяўчынку, што ляжала на спіне каля дрэва. Яе вочы былі прымружаныя, нібыта яна знаходзілася паміж сном і явай. Ён доўга моўчкі глядзеў на яе. Нарэшце дзяўчынка расплюшчыла вочы і нейкі час глядзела на Дыгары, таксама моўчкі. Потым яна прамовіла сонным і задаволеным голасам:

— Мне здаецца, я бачыла цябе раней.

— Мне таксама так здаецца,— зазначыў Дыгары.— Ты даўно тут?

— О, вечнасць,— сказала дзяўчынка.— Прынамсі, не ведаю, вельмі доўга.

— І я таксама,— адказаў Дыгары.

— Няпраўда,— сказала яна.— Я толькі што бачыла, як ты з'явіўся з таго возера.

— І сапраўды,— збянтэжана пагадзіўся Дыгары.— Я й забыўся.

Потым яны абодва доўга маўчалі.

— Слухай,— сказала дзяўчынка праз некаторы час.— Цікава, мы сапраўды некалі бачыліся? Я ўзгадваю — нібыта малюнак у галаве — хлопчыка і дзяўчынку, падобных да нас, якія жывуць недзе ў зусім іншым месцы і робяць розныя рэчы. Магчыма, гэта проста сон.

— Думаю, мне сніўся такі ж сон,— адказаў Дыгары.— Пра хлопчыка і дзяўчынку, якія жылі ў суседніх дамах… і пра нейкае поўзанне сярод бэлек. Я памятаю, што ў дзяўчынкі быў брудны твар.

— А ты нічога не блытаеш? У маім сне брудны твар быў у хлопчыка.

— Я не памятаю яго твару,— сказаў Дыгары і потым дадаў: — Што гэта там?

— Нішто сабе! Гэта марская свінка,— здзівілася дзяўчынка. І сапраўды — гэта была тлустая марская свінка, якая нешта вынюхвала ў траве. Пасярэдзіне тулава яна была перамотаная стужкай з замацаваным яскравым жоўтым пярсцёнкам.

— Глядзі! Глядзі! — закрычаў Дыгары. — Пярсцёнак! І зірні! У цябе на пальцы такі ж. І ў мяне таксама.

Цяпер дзяўчынка села, нарэшце сапраўды зацікавіўшыся. Яны вельмі пільна паглядзелі адно на аднаго,

спрабуючы ўзгадаць. І потым, у адзін і той жа момант, яна ўсклікнула: "Містар Кэтэрлі!", а ён: "Дзядзька Эндру!" — і дзеці зразумелі, хто яны, і пачалі прыгадваць усю гісторыю. Праз некалькі хвілін жвавай гутаркі ўсё было высветлена. Дыгары распавёў, які́м бесчалавечным аказаўся дзядзька Эндру.

— Што будзем рабіць? — запыталася Полі.— Возьмем марскую свінку і вернемся дамоў?



— Нам няма куды спяшацца,— сказаў Дыгары, шырока пазяхаючы.

— Думаю, ёсць,— адказала Полі.— Тут занадта ціха. Тут так... так сонна. Ты амаль задрамаў. Калі мы абодва заснем, то так і будзем ляжаць і спаць вечна.

— Тут вельмі добра,— запярэчыў Дыгары.

— Так,— пагадзілася Полі.— Але нам трэба вяртацца.

Яна паднялася і асцярожна пайшла да марской свінкі. Але пасля перадумала.

— Лепей пакінем яе тут,— сказала Полі.— Тут яна шчаслівая, а твой дзядзька зробіць з ёй што-небудзь кепскае, калі мы вернем яе.

— Не сумняваюся,— адказаў Дыгары.— Дастаткова ўзгадаць, як ён абышоўся з намі. Дарэчы, а як нам вярнуцца дамоў?

— Скокнуць назад у возера, думаю.

Яны ўдваіх падышлі да краю азярка і спыніліся, гледзячы ў спакойную ваду. Яна адлюстроўвала зялёныя, поўныя лістоты галіны, і таму азярко выглядала вельмі глыбокім.

— У нас няма ў чым плаваць,— сказала Полі.

— А нам нічога і не трэба,— адказаў Дыгары.— Можна нырнуць і ў вопратцы. Ці ты не памятаеш, што мы не намоклі, калі трапілі сюды?

— А ты ўмееш плаваць?

— Крыху. А ты?

— Ну, не зусім добра.

— Не думаю, што давядзецца плысці,— сказаў Дыгары.— Мы ж хочам спусціцца ўніз, так?

Ім абодвум не вельмі падабалася ідэя скокнуць у возера, але ніхто не вымавіў гэтага ўголас. Яны ўзяліся за рукі, сказалі: “Адзін — два — тры — давай!” — і скокнулі. Атрымаўся вялікі ўсплеск, і, вядома, дзеці зажмурыліся. Але, калі Полі і Дыгары расплюшчылі вочы, аказалася, што яны ўсё яшчэ пасярод зялёнага лесу, трымаюцца за рукі і стаяць у вадзе, якая ледзь даходзіць да шчыкалатак. Возера, відаць, было ўсяго некалькі сантыметраў глыбінёй. Яны пашлёпалі назад, на сухую зямлю.

— Чаму ў нас нічога не атрымалася? — спыталася Полі спужаным голасам, але не настолькі спужаным,

як вы маглі б падумаць, бо ў тым лесе было складана сапраўды спужацца. Ён быў такі мірны.

— Зразумеў! — сказаў Дыгары.— Вядома ж, не атрымалася. Жоўтыя пярсцёнкі ўсё яшчэ надзетыя. Яны для перамяшчэння ў Іншае Месца. Зялёныя перанясуць нас дамоў. Трэба памяняць іх. У цябе ёсць кішэні? Добра. Пакладзі жоўты пярсцёнак у левую. У мяне два зялёныя. Вось адзін табе.

Яны надзелі зялёныя пярсцёнкі і вярнуліся да возера, але тут Дыгары ўсклікнуў: “Чакай!”

— Што здарылася? — запыталася Полі.

— Мне ў галаву толькі што прыйшла цудоўная ідэя,— сказаў Дыгары.— А што ва ўсіх іншых азярках?

— Што ты маеш на ўвазе?

— Глядзі: калі мы можам вярнуцца ў наш свет, скокнуўшы ў гэтае возера, мы, пэўна, патрапім кудынебудзь яшчэ, калі скокнем у іншае. Што, калі на дне кожнага возера знаходзіцца іншы свет?

— Але я думала, што мы ўжо ў тым Іншым Свеце, пра які казаў твой дзядзька Эндру, ці Іншым Месцы — як там ён яго называў? Ты хочаш сказаць, што…

— Забудзься на дзядзьку Эндру,— перапыніў Дыгары.— Не думаю, што ён нешта пра гэта ведае. У яго ніколі не хапала мужнасці перанесціся сюды самому. Ён казаў толькі пра адзін Іншы Свет. А што, калі іх дзясяткі?

— Ты думаеш, гэты лес можа быць толькі адным з іх?

— Не, я думаю, што гэты лес — зусім не свет. Мяркую, гэта проста нейкае месца паміж сусветамі.

Полі выглядала збянтэжанай.

— Няўжо ты не разумееш? — сказаў Дыгары.— Паслухай. Узгадай пра наш тунэль пад дахам. Ён не з'яўляецца пакоем аніводнага з дамоў. Яго нават цяжка назваць часткай якога-небудзь дома. Але можна хадзіць па ім і трапляць у розныя дамы. Гэты лес можа быць чымсьці падобным. Месца, якое не знаходзіцца ні ў адным з сусветаў, але вядзе ва ўсе сусветы!

— Нават калі так...— пачала Полі, але Дыгары працягваў, нібыта яе не чуў.

— І тады гэта ўсё тлумачыць,— сказаў ён.— Таму тут так ціха і сонна. Тут ніколі нічога не адбываецца. Як і там, у нас. Людзі ў дамах размаўляюць, робяць свае справы, ядуць. Нічога не адбываецца толькі ў месцах, якія знаходзяцца паміж нечым: паміж сценамі, па-над столлю, пад падлогай ці ў нашым тунэлі. Але калі ты выходзіш з яго, патрапляеш у той ці іншы дом. Я думаю, адсюль мы можам перанесціся куды заўгодна! Мы не абавязаны зараз скокаць у тое ж азярко, праз якое апынуліся тут. Давай паспрабуем іншае.

— Лес Паміж Сусветамі,— сказала Полі з выглядам чалавека, які лунае ў сваіх марах.— Гучыць даволі прывабна.

— Хадзем,— прапанаваў Дыгары.— Якое выберам?

— Слухай,— сказала Полі.— Я не збіраюся скокаць ні ў якое іншае возера, пакуль мы не ўпэўнімся, што можам вярнуцца назад праз гэтае. Мы нават не ведаем, ці гэта ўвогуле працуе.

— Ага,— адказаў Дыгары,— каб нас злавіў дзядзька Эндру і адабраў пярсцёнкі, а мы нават павесяліцца не паспелі. Ну, дзякуй.

— А ці не лепш нам нырнуць часткова, не да канца? — мовіла Полі.— Толькі каб паглядзець, ці атрымаецца. А калі так, мы памяняем пярсцёнкі ды зноў падымемся сюды, перш чым цалкам вярнуцца ў кабінет містара Кэтэрлі.

— А ці зможам мы нырнуць не да канца?

— Ну, спатрэбіўся ж нейкі час, каб падняцца сюды. Мяркую, у нас будзе час і на тое, каб вярнуцца.

Дыгары доўга супраціўляўся гэтай ідэі, але ўрэшце яму давялося пагадзіцца, бо Полі наадрэз адмовілася даследаваць іншыя сусветы, пакуль не пераканаецца, што можна вярнуцца ў іх уласны. Яна была амаль такой жа смелай, як Дыгары, калі справа тычылася небяспекі (напрыклад, восаў), але яе мала прываблівала ідэя даследаваць рэчы, пра якія

ніхто раней не чуў. Дыгары ж быў з тых людзей, якія хочуць ведаць усё, і, пасталеўшы, ён стаў знакамітым прафесарам Кёркам, з якім мы сустрэнемся ў іншых нашых кнігах.

Пасля даволі зацятых спрэчак яны пагадзіліся надзець зялёныя пярсцёнкі ("Зялёны азначае бяспеку,— сказаў Дыгары,— таму ты не пераблытаеш"), узяцца за рукі і скочыць. Як толькі яны заўважаць, што вяртаюцца ў кабінет дзядзькі Эндру ці нават толькі ў іх уласны сусвет, Полі мусіла крыкнуць: "Мяняем!" — і тады яны здымуць зялёныя і надзенуць жоўтыя пярсцёнкі. Дыгары сам хацеў крычаць "мяняем", але Полі не згадзілася.

Яны надзелі зялёныя пярсцёнкі, узяліся за рукі і яшчэ раз крыкнулі: "Адзін — два — тры — давай!" Гэтым разам усё атрымалася. Вельмі складана апісаць, як усё адбылося, бо адбылося гэта вельмі хутка. Спачатку з'явіліся зыркія агеньчыкі, якія рухаліся па чорным небе. Дыгары заўсёды думаў, што гэта былі зоры, і нават кляўся, што даволі блізка бачыў Юпітар — настолькі блізка, што мог разгледзець яго спадарожнікі. І амаль адразу пасля гэтага з'явіліся шэрагі дахаў і комінаў, яны пабачылі сабор Святога Паўла і зразумелі, што глядзяць на Лондан. Дзеці бачылі скрозь муры дамоў. Потым яны заўважылі дзядзьку Эндру. Яго цьмяная постаць з кожным імгненнем

рабілася ўсё больш выразнай і больш рэальнай, нібыта на яе наводзілі фокус фотакамеры. Але, перш чым дзядзька Эндру зрабіўся зусім сапраўдным, Полі закрычала: "Мяняем!" — і яны памянялі пярсцёнкі. Наш сусвет развеяўся, як сон, а зялёнае святло зверху пачало рабіцца ўсё мацнейшым і мацнейшым, пакуль іх галовы не апынуліся на паверхні азярка і дзеці не выбраліся на бераг. Усё гэта заняло менш за хвіліну.

— Вось так! — сказаў Дыгары.— Усё працуе. А зараз — прыгоды. Можам выбраць любое возера. Хадзем. Давай паспрабуем тое.

— Стой! — крыкнула Полі.— Можа, трэба пазначыць гэтае, наша?

Яны паглядзелі адно на аднаго і збялелі ад разумення той страшнай рэчы, якую Дыгары толькі што збіраўся зрабіць. Бо ў лесе была бясконцая колькасць азёр, яны ўсе былі аднолькавыя, і ўсе дрэвы былі аднолькавыя. Такім чынам, калі б яны аднойчы пакінулі тое азярко, што вядзе ў наш сусвет, без аніякай адзнакі, у іх наўрад ці атрымалася б знайсці дарогу дадому.

Дрыготкай рукой Дыгары дастаў кішэнны нож і выразаў доўгую палоску дзірвану на беразе. Зямля смачна пахла, і яе чырванавата-карычневы колер быў добра бачны на зялёным.

— Добра, што адзін з нас мае крыху розуму,— сказала Полі.

— Толькі не надумай увесь час пра гэта ўзгадваць,— адмахнуўся Дыгары.— Хадзем. Я хачу паглядзець, што ў іншых азёрках.

Полі рэзка адказала яму, а ён сказаў нешта ў адказ, яшчэ больш з'едліва. Спрэчка доўжылася некалькі хвілін, але цалкам прыводзіць яе нецікава. Давайце прапусцім яе і пяройдзем да моманту, калі яны, усхваляваныя, з засяроджанымі тварамі, стаялі на беразе незнаёмага азярка, надзеўшы жоўтыя пярсцёнкі і трымаючыся за рукі. Яны зноў сказалі: "Адзін — два — тры — давай!"

Плюх! Ізноў не спрацавала. Гэтае азярко таксама аказалася лужынай. Замест таго, каб апынуцца ў новым сусвеце, яны толькі намачылі ногі другі раз за раніцу (калі гэта была раніца: падобна, у Лесе Паміж Сусветамі заўсёды быў адзін і той жа час).

— Ах ты! — усклікнуў Дыгары.— Што не так гэтым разам? Мы надзелі жоўтыя пярсцёнкі. Ён жа сказаў, што жоўтыя — для вандровак у іншы свет.

Але насамрэч дзядзька Эндру, які нічога не ведаў пра Лес Паміж Сусветамі, меў няправільнае ўяўленне пра пярсцёнкі. Жоўтыя не пераносілі ў іншы свет, і зялёныя не пераносілі дамоў. Прынамсі, не ў тым сэнсе, як ён разумеў. Рэчыва, з якога былі зроблены пярсцёнкі, паходзіла адсюль, з лесу. Рэчыва жоўтых пераносіла ў лес. Яно імкнулася вярнуцца назад, у сваё

месца, што знаходзіцца пасярод сусветаў. А рэчыва зялёных пярсцёнкаў намагалася пакінуць гэтае месца і пераносіла вас з лесу ў іншы сусвет. Разумееце, дзядзька Эндру працаваў з тым, у чым не да канца быў абазнаны; большасць чараўнікоў такія. Вядома, Дыгары таксама да канца не ўсведамляў праўды, прынамсі, да пэўнага часу. Але, абмеркаваўшы ўсё, дзеці вырашылі паспрабаваць скокнуць у новае азярко, надзеўшы зялёныя пярсцёнкі,— проста каб паглядзець, што адбудзецца.

— Я пайду, калі ты пойдзеш,— сказала Полі. Але насамрэч яна сказала так, бо цяпер адчувала, што ніякія пярсцёнкі не спрацуюць на новым азярцы, і ў самым горшым выпадку атрымаецца яшчэ адзін плюх. Я не ўпэўнены, што Дыгары не пачуваўся гэтак жа. У любым выпадку, яны абое надзелі зялёныя пярсцёнкі і вярнуліся да беражка. Цяпер, ізноў узяўшыся за рукі, яны былі значна весялейшыя і менш урачыстыя, чым у першы раз.

— Адзін — два — тры — давай! — сказаў Дыгары.

І яны скочылі.

## Раздзел 4
# Звон і малаток

Гэтым разам не было ніякага сумніву, што творыцца Магія. Яны падалі ніжэй і ніжэй, спачатку скрозь цемру, а пасля скрозь шматлікія размытыя формы, якія круціліся і маглі быць чым заўгодна. Рабілася святлей. Потым яны раптам адчулі, што стаяць на нечым цвёрдым. У наступны момант усё навокал перастала быць размытым, і яны змаглі агледзецца.

— Якое дзіўнае месца! — сказаў Дыгары.

— Мне тут не падабаецца,— мовіла Полі і здрыганулася.

Перадусім яны звярнулі ўвагу на святло. Яно не было падобным да сонечнага ці электрычнага святла, ці святла ад лямпы або свечак, ці да любога іншага святла, якое яны калі-небудзь бачылі. Гэта было прыглушанае, чырванаватае, невясёлае святло. Яно было роўным і не давала бляску.

Дзеці стаялі на брукаванай пляцоўцы, вакол высіліся будынкі. Над галавой не было даху; месца нагадвала ўнутраны двор. Неба было надзвычай цёмнае: сіняга, амаль чорнага колеру. Пабачыўшы такое неба, вы б здзівіліся, што ўвогуле ёсць нейкае святло.

— Якое тут дзіўнае надвор'е,— сказаў Дыгары.— Быццам зараз будзе навальніца ці сонечнае зацьменне.

— Мне тут не падабаецца,— паўтарыла Полі.

Яна абодва, самі не ведаючы чаму, размаўлялі шэптам. І нягледзячы на тое, што больш не было патрэбы трымацца за рукі, яны не адпусцілі адно аднаго.

Муры вакол двара былі вельмі высокія, з вялікімі вокнамі без шыбаў, скрозь якія не было бачна нічога, акрамя цемры. Ніжэй, зеўраючы чарнатою, як уваходы ў чыгуначныя тунэлі, стаялі вялікія аркі на слупах. Было даволі халодна.

Здавалася, што камяні, з якіх збудавана ўсё навокал,— чырвоныя, але так магло толькі здавацца з-за незвычайнага святла. Яны, відавочна, былі вельмі старыя. Шмат якія з плоскіх камянёў у брукаванцы раскалоліся. Ніводзін з іх не прылягаў да іншага шчыльна, і ўсе вострыя вуглы сцерліся. Адзін арачны ўваход быў напалову завалены бітым каменем. Дыгары і Полі ўвесь час паварочваліся, каб бачыць розныя бакі двара. Яны баяліся, што нехта — ці



нешта — глядзіць на іх з вокнаў, калі яны паварочваюцца спінай.

— Як думаеш, тут хто-небудзь жыве? — сказаў нарэшце Дыгары, усё яшчэ шэптам.

— Не,— адказала Полі.— Усё зруйнавана. Мы не чулі ні гуку з таго самага моманту, як трапілі сюды.

— Давай крыху пастаім ціха і паслухаем,— прапанаваў Дыгары.

Яны замерлі і прыслухаліся, але пачулі толькі грукат уласных сэрцаў. Гэтае месца было, прынамсі, такім жа ціхім, як Лес Паміж Сусветамі. Але цішыня тут была іншага кшталту. Цішыня лесу была насычаная, цёплая (амаль можна было пачуць, як растуць дрэвы) і поўнілася жыццём. А тут цішыня была мёртвая, сцюдзёная і пустая. Немагчыма было ўявіць, каб у гэтым месцы нешта расло.

— Давай вернемся дамоў,— сказала Полі.

— Але мы яшчэ нічога не пабачылі,— мовіў Дыгары.— Калі ўжо мы тут, мы проста мусім агледзецца.

— Тут няма абсалютна нічога цікавага.

— Які сэнс знайсці чароўныя пярсцёнкі, якія пераносяць цябе ў іншы свет, а потым баяцца паглядзець на яго?

— Хто сказаў, што я баюся? — запярэчыла Полі, адпускаючы руку Дыгары.

— Мне проста здалося, што табе не вельмі падабаецца ідэя агледзець гэтае месца.

— Я пайду паўсюль, куды ты пойдзеш.

— Мы можам вярнуцца ў любы момант, калі пажадаем,— сказаў Дыгары.— Давай здымем зялёныя пярсцёнкі і пакладзем іх у правыя кішэні. Трэба толькі памятаць, што жоўтыя пярсцёнкі — у левых кішэнях. Трымай руку побач з кішэняй, але толькі не ўнутры, а то кранешся жоўтага пярсцёнка і знікнеш.

Яны паклалі пярсцёнкі і ціха пайшлі да адной з вялікіх арак, што вялі ў будынак. Стоячы на парозе, дзеці зазірнулі ўнутр і пабачылі, што там было не настолькі цёмна, як спачатку здавалася. Уваход вёў у вялікую, змрочную залю, якая аказалася пустой. Але ў далёкім канцы быў шэраг слупоў, злучаных аркамі, і праз гэтыя аркі тачылася такое ж бляклае святло. Дзеці перасяклі залю, ідучы павольна, бо пільнаваліся дзірак у падлозе ці чагосьці, што магло б ляжаць на шляху і аб што можна было спатыкнуцца. Ім здавалася, што ішлі яны вельмі доўга. Калі ж урэшце прайшлі скрозь аркі, то апынуліся ў іншым, большым двары.

— Тут трэба асцярожна,— сказала Полі, паказваючы на месца, дзе мур нахіліўся і выглядаў так, нібы вось-вось абрынецца ў двор. У адным месцы паміж дзвюма аркамі не хапала слупа, і тая частка, дзе аркі

судакраналіся, ледзь трымалася без апірышча. Было зразумела, што гэтае месца пакінулі сотні, а можа і тысячы год таму.

— Калі яно прастаяла дагэтуль, мяркую, пастаіць яшчэ крыху,— зазначыў Дыгары.— Але мы мусім паводзіць сябе вельмі ціха. Часам шум можа нешта абрынуць — ведаеш, як лавіну ў Альпах.

Яны падняліся па высокіх прыступках і прайшлі праз анфіладу велізарных пакояў, такіх велізарных, што ад іх аграмаднасці кружылася галава. Час ад часу дзецям здавалася, што зараз яны выйдуць на адкрытую пляцоўку і пабачаць, што ж за краіна ляжыць навокал гіганцкага палаца. Але кожны раз яны траплялі толькі ў чарговы ўнутраны двор. Пэўна, калі людзі яшчэ жылі тут, гэтыя двары былі велічнымі і пышнымі. У адным з іх калісьці быў фантан. Агромністая каменная пачвара стаяла з распасцёртымі крыламі і разяўленай пашчай. У яе горле ўсё яшчэ тырчэў кавалак трубы, праз якую некалі лілася вада. Цяпер басейн быў сухі, як костка. У іншых месцах можна было заўважыць сцяблінь нейкай паўзучай расліны, якая абвілася вакол слупоў і даўно ўжо засохла. Тут не было ні мурашоў, ні павукоў, ані якіх іншых жывых істотаў, якія звычайна жывуць у руінах. У шчылінах паміж камянямі не было моху ці травы: толькі сухая зямля.

Усё навокал было такім панурым і аднолькавым, што Дыгары падумваў, ці не лепей ім надзець жоўтыя пярсцёнкі і вярнуцца ў цёплы, зялёны, жывы Лес Паміж Сусветамі. Але тут яны падышлі да велічных дзвюхстворкавых дзвярэй, зробленых з нейкага металу, магчыма, золата. Адна створка была прыадчыненая. Дзеці зайшлі ўнутр і застылі ад здзіўлення.

На секунду ім здалося, што пакой поўны людзей — соцень людзей,— якія сядзелі і зусім не рухаліся. Полі і Дыгары, як вы маглі здагадацца, таксама стаялі





нерухома. Але праз нейкі час яны вырашылі, што тыя, на каго яны глядзяць, не могуць быць сапраўднымі людзьмі. Ніхто не варухнуўся, і не чулася дыхання. Гэта былі найбольш дасканалыя васкавыя фігуры, якія камусьці толькі даводзілася бачыць.

Гэтым разам Полі рушыла першай. У пакоі было штосьці, што зацікавіла яе: усе постаці былі апранутыя ў неверагодна прыгожае адзенне. Яскравасць фарбаў гэтага адзення рабіла пакой не тое каб радасным, але, прынамсі, багатым і пышным пасля пылу і пустэчы іншых пакояў. Таксама ў ім было больш вокнаў, а таму нашмат святлей.

Апісаць адзенне даволі складана. Усе фігуры былі апранутыя ў мантыі, і ў кожнай на галаве была карона. Барвовыя, срэбна-шэрыя, насычана-пурпуровыя і яскрава-зялёныя мантыі былі расшытыя ўзорамі,

выявамі кветак і дзівосных звяроў. Каштоўныя камяні неверагодных памераў і зыркасці ззялі на каронах, звісалі на ланцужках з шыяў, выблісквалі адусюль, дзе былі зашпількі.

— Чаму гэтае адзенне даўным-даўно не спарахнела? — запыталася Полі.

— Магія,— прашаптаў Дыгары.— Ты не адчуваеш яе? Магу паспрачацца, што ўвесь гэты пакой проста напоўнены заклёнамі. Я адчуў гэта адразу, як мы ўвайшлі.

— Любы з гэтых строяў каштуе вялізных грошай,— сказала Полі.

Але Дыгары больш цікавілі абліччы. А яны сапраўды былі вартыя ўвагі. Людзі сядзелі на каменных крэслах уздоўж сцен пакоя, а ў сярэдзіне было вольнае месца. Можна было прайсці і разгледзець усе твары па чарзе.

— Думаю, яны былі добрыя людзі,— сказаў Дыгары.

Полі кіўнула. Усе твары, якія яны бачылі, былі, безумоўна, прыемнымі. І мужчыны, і жанчыны выглядалі добрымі і мудрымі, і, відаць, яны былі з прыгожага народу. Але, прайшоўшы некалькі крокаў, дзеці пабачылі твары, якія выглядалі крыху па-іншаму. Яны былі вельмі ўрачыстымі. Сустрэўшы жывых людзей з такімі тварамі, вы адчулі б, што вам трэба сачыць за сваімі паводзінамі. Яшчэ крыху

далей дзеці пабачылі аблiччы, якія ім не спадабаліся: гэта было дзесьці пасярэдзіне пакоя. Тут твары людзей выглядалі ганарыстымі, задаволенымі і жорсткімі. Далей яны сталі яшчэ больш жорсткія. А потым твары сталі выглядаць зусім бязлітаснымі і ўжо нешчаслівымі. Хутчэй на іх была роспач, нібыта гэтыя людзі рабілі жудасныя ўчынкі і прайшлі праз жахлівыя рэчы. Апошняя постаць была найцікавейшай: жанчына, апранутая багацей за іншых, вельмі высокая (а кожны чалавек у гэтым пакоі быў вышэйшы за людзей у нашым свеце), з такім лютым і ганарыстым тварам, што захоплівала дух. І ў той жа час яна была прыгожая. Шмат гадоў пазней, ужо стары, Дыгары сцвярджаў, што ніколі ў сваім жыцці не бачыў такой прыгожай жанчыны. Застаецца толькі дадаць, што Полі заўсёды казала, нібыта не бачыла ў ёй нічога асабліва прыгожага.

Гэтая жанчына, як я сказаў, была апошняя, але за ёю было шмат пустых крэслаў, нібыта пакой быў разлічаны на куды большую колькасць постацяў.

— Як бы мне хацелася ведаць гісторыю ўсяго гэтага,— сказаў Дыгары.— Давай вернемся і паглядзім на тую штуку накшталт стала ў сярэдзіне пакоя.

Рэч тая аказалася не зусім сталом. Гэта быў квадратны слуп прыблізна ў метр вышынёй. На ім стаяла маленькая залатая арка, у якой вісеў невялічкі залаты

звон; а побач з ім ляжаў маленькі залаты малаток, каб званіць.

— Цікава... цікава...— прамовіў Дыгары.

— Здаецца, тут нешта напісана,— заўважыла Полі, нахіліўшыся і разглядаючы бок слупа.

— Нішто сабе, сапраўды! — сказаў Дыгары.— Але, вядома, мы гэтага не прачытаем.

— А можа, і атрымаецца,— адказала Полі.

Яны абодва ўважліва паглядзелі на выразаныя ў камені незнаёмыя літары. І тут здарылася нешта незвычайнае: пакуль яны разглядалі надпіс, хаця форма незнаёмых літар не памянялася, дзеці зразумелі, што могуць прачытаць яго. Калі б Дыгары ўзгадаў свае словы пра тое, што гэты пакой быў зачараваны, ён бы здагадаўся, што заклёны пачалі дзейнічаць. Але Дыгары быў настолькі захоплены, што не думаў пра гэта. Яму ўсё больш і больш карцела даведацца, што напісана на слупе. І хутка яны абодва даведаліся. Там было напісана вось што — прынамсі, агульны сэнс, хаця ў арыгінале верш быў больш паэтычны:

*Абірай, чужак вандроўны:*
*Біць у звон — сцягнуць праклёны —*
*Ці да вар'яцтва з думкай жыць,*
*Што будзе, калі так зрабіць.*

— Яшчэ чаго! — сказала Полі.— Не трэба нам ніякіх праклёнаў.

— Хіба ты не разумееш, што не ўсё так проста? — прамовіў Дыгары.— Мы не можам вось так сысці. Мы заўсёды будзем думаць, што адбылося б, калі б мы пазванілі ў звон. Я не збіраюся вярнуцца дамоў і звар'яцець ад гэтага. Нават і не прасі!

— Не будзь такім дурнем,— запярэчыла Полі.— Нібыта нехта на гэта купіцца! Якая розніца, што адбылося б?

— Думаю, той, хто дайшоў да гэтага моманту, проста асуджаны працягваць гадаць, што здарылася б, пакуль не страціць розум. Тут дзейнічае магія, зразумей. Я пачынаю адчуваць, што яна ўжо на мяне ўплывае.

— А я не адчуваю,— раздражнёна азвалася Полі.— І не веру, што яна дзейнічае на цябе. Ты проста прыкідваешся.

— Нічога іншага я ад цябе і не чакаў,— сказаў Дыгары.— Гэта таму, што ты дзяўчынка. Дзяўчынкі ніколі нічога не хочуць ведаць, акрамя плётак і розных бздураў кшталту хто з кім заручыўся.

— Ты зараз выглядаеш дакладна як твой дзядзька Эндру,— зазначыла Полі.

— Чаму ты ўвесь час пераводзіш размову? — сказаў Дыгары.— Мы казалі пра…

— Тыповы мужчына! — мовіла Полі дарослым голасам, але хутка дадала сваім звычайным тонам: — Толькі не кажы, што я тыповая жанчына, бо гэта будзе звычайным малпаваннем.

— Я і не падумаў бы назваць жанчынай такое дзіця як ты,— фанабэрыста сказаў Дыгары.

— Я — дзіця, так? — вымавіла Полі, якая зараз была сапраўды раз'юшаная.— Ведаеш, тады гэтае дзіця больш не будзе турбаваць цябе сваёй прысутнасцю. З мяне хопіць. З мяне дастаткова гэтага месца. І цябе з мяне таксама хопіць, ты, агідная, ганарыстая, упартая свіння!

— А ну кінь! — сказаў Дыгары голасам, які прагучаў больш пагрозліва, чым ён таго жадаў, бо пабачыў, як Полі пацягнулася да кішэні, каб надзець жоўты пярсцёнак.

Я не магу апраўдаць тое, што ён зрабіў пасля. Мушу хіба адзначыць, што ён вельмі шкадаваў пра гэта потым (і даволі шмат іншых людзей таксама). Раней, чым Полі дацягнулася да кішэні, ён схапіў яе запясце, нахіліўшыся наперад, спінай да яе. Потым, трымаючы другую руку Полі локцем, ён узяў малаток і стукнуў у залаты звон лёгкім спрытным ударам. Затым ён адпусціў Полі, і яны адскочылі адно ад аднаго, пільна гледзячы вочы ў вочы і цяжка дыхаючы. Полі пачала плакаць. Не ад страху і нават не таму, што ён зрабіў

ёй балюча, а ад лютай злосці. Але праз дзве секунды яны ўжо не думалі пра сварку, бо здарылася яшчэ адна незвычайная рэч.

Як толькі ў звон ударылі, ён выдаў ноту. Салодкую, як можна было б чакаць, і не вельмі гучную. Але замест таго, каб сціхнуць, яна працягвалася. І чым даўжэй яна гучала, тым мацнейшай рабілася. Не прайшло і хвіліны, як яна стала ўдвая грамчэйшай, чым у пачатку. І хутка гук стаў настолькі моцным, што, калі б дзеці паспрабавалі нешта сказаць (але яны не думалі пра тое, каб нешта сказаць, проста стаялі з раскрытымі ратамі), то не пачулі б адно аднаго. Вельмі хутка гук стаў такі аглушальны, што дзеці не пачулі б адно аднаго, нават калі б крычалі. І ён рабіўся ўсё мацнейшым — на адной ноце, бясконцы салодкі гук, хаця ў яго салодкасці было штосьці жудаснае. Паветра ў гэтым велізарным пакоі пачало пульсаваць, дзеці адчулі, як каменная падлога дрыжыць пад нагамі.

Потым нарэшце ён пачаў змешвацца з іншым гукам: няясным шумам, які спачатку нагадваў грукат далёкага цягніка, а пасля — гук падаючага дрэва. Тое, што яны чулі, сапраўды было падобна да гуку падзення вельмі цяжкіх рэчаў. Урэшце раптоўна, хутка, з грукатам, скалануўшы ўсё так, што дзеці ледзь утрымаліся на нагах, частка даху ў адным з канцоў пакоя абрынулася ўнутр, агромністыя кавалкі паляцелі на

зямлю, сцены задрыжалі. Звон перастаў гучаць. Аблокі пылу развеяліся. Усё зноў сціхла.

Ці дах абрынуўся праз магію, ці праз тое, што гучны звон патрапіў у такую ноту, якую гэтыя спарахнелыя сцены не змаглі вытрымаць, так і засталося загадкай.

— Выдатна! Спадзяюся, цяпер ты задаволены,— выдыхнула Полі.

— У любым выпадку, усё скончылася,— сказаў Дыгары.

І абодва падумалі, што так і ёсць. Але яны ніколі яшчэ так не памыляліся.

# Раздзел 5
# Непраўнае Слова

Дзеці ўсё стаялі насупраць адно аднаго каля калоны, над якой, усё яшчэ дрыжучы, але без аніякага гуку, вісеў звон. Раптам яны пачулі ціхі гук з непашкоджанага канца пакоя. З хуткасцю маланкі яны азірнуліся, каб паглядзець, што гэта.

Адна з постацяў у мантыі, самая далёкая, жанчына, якая падалася Дыгары такой прыгожай, падымалася з крэсла. Калі яна паднялася, дзеці ўбачылі, што яна нават вышэйшая, чым здавалася напачатку. І было зразумела, не толькі з-за кароны і мантыі, але па ззянні вачэй і выгіне вуснаў, што гэта каралева. Яна агледзела пакой, пабачыла дзяцей, але па яе твары немагчыма было здагадацца, што яна падумала і ці здзівілася. Каралева шырокімі крокамі падышла бліжэй.

— Хто пабудзіў мяне? Хто зняў заклён? — запыталася яна.

— Гэта, напэўна, я,— прамовіў Дыгары.

— Ты! — сказала Каралева, паклаўшы рукі яму на плечы — белыя, прыгожыя рукі, але Дыгары адчуў, што яны моцныя, як сталёвыя абцугі.— Ты? Але ж ты толькі дзіця, звычайнае дзіця. Любому зразумела, што ў тваіх жылах няма і кроплі каралеўскай ці шляхецкай крыві. Як ты наважыўся ўвайсці ў гэты дом?

— Мы прыйшлі з іншага свету дзякуючы магіі,— патлумачыла Полі, якая вырашыла, што Каралеве ўжо час звярнуць увагу і на яе, а не толькі на Дыгары.



— Гэта праўда? — запыталася Каралева, працягваючы глядзець на Дыгары і нават не зірнуўшы на Полі.

— Так, праўда,— адказаў ён.

Каралева ўзяла яго за падбароддзе, каб лепей бачыць ягоны твар. Дыгары паспрабаваў таксама глядзець на яе, але адразу апусціў вочы. У ёй было нешта мацнейшае за яго. Уважліва разгледзеўшы твар Дыгары, Каралева адпусціла яго падбароддзе і вымавіла:

— Ты не чараўнік. На табе няма пазнакі. Ты, пэўна, толькі служка чараўніка. Вы трапілі сюды праз магію кагосьці іншага.

— Гэта быў мой дзядзька Эндру,— сказаў Дыгары.

У гэтае імгненне не ў самім пакоі, але дзесьці зусім блізка пачуўся спачатку грукат, пасля скрыгат, а потым роў падаючых камянёў, і падлога задрыжала.

— Тут небяспечна,— сказала Каралева.— Палац рассыпаецца. Калі мы не выберамся адсюль, то праз пару хвілін будзем пахаваныя пад руінамі.

Казала яна пра гэта вельмі спакойна. “Хадзем”,— дадала яна і ўзяла дзяцей за рукі. Полі, якой Каралева не падабалася, не хацела, каб яе бралі за руку. Але, нягледзячы на тое, што Каралева гаварыла спакойна, рухалася яна вельмі хутка. Раней, чым Полі зразумела, што адбываецца, моцная рука схапіла яе.

“Жудасная жанчына,— падумала Полі.— Яна, калі захоча, зломіць маю руку адным рухам. І цяпер, калі



яна трымае мяне за левую руку, я не магу дастаць жоўты пярсцёнак. Калі я паспрабую дацягнуцца да левай кішэні правай рукой, яна адразу заўважыць і запытаецца, што я раблю. Ні ў якім разе нельга, каб яна даведалася пра пярсцёнкі. Вельмі спадзяюся, што ў Дыгары хопіць розуму маўчаць... Калі б толькі ў мяне быў шанец перамовіцца з ім".

Каралева вывела іх з Залы Пастацяў у доўгі калідор і павяла праз лабірынт залаў, лесвіц і двароў. Зноў і зноў яны чулі, як абрынаюцца часткі вялікага палаца, часам даволі блізка ад іх. Адна з велізарных арак з громападобным грукатам абвалілася, як толькі яны прайшлі праз яе.

Каралева ішла хутка — дзецям даводзілася бегчы, каб паспяваць. Але па ёй было відаць, што яна не баіцца. Дыгары падумаў: "Яна неверагодна смелая. І моцная. Сапраўдная каралева! Я вельмі спадзяюся, што яна распавядзе нам гісторыю гэтага месца".

І яна сапраўды распавядала ім некаторыя рэчы, пакуль яны ішлі.

"Гэтыя дзверы вядуць ў сутарэнні,— казала яна.— Гэты праход вядзе да галоўных камер катаванняў", або: "Тут была старая банкетная зала, куды мой прадзед запрасіў сямсот шляхцічаў на банкет і забіў іх усіх яшчэ да таго, як яны напіліся. У іх быў намер падняць паўстанне".



Нарэшце яны прыйшлі ў найвялікшую і найвышэйшую залю з усіх, якія дзеці дагэтуль бачылі. З-за яе памераў і вялікіх дзвярэй у дальнім канцы Дыгары падумаў, што яны прыйшлі да галоўнага ўваходу. І ён меў рацыю. Дзверы былі цьмяна-чорныя, з чорнага дрэва ці з нейкага чорнага металу, якога ў нашым свеце няма. Яны былі замкнёныя на таўшчэзныя засаўкі, большасць якіх была занадта высока, каб

дастаць. “Як жа яны адчыняюцца?” — падумаў Дыгары.

У гэты час Каралева адпусціла іх рукі і падняла свае. Яна выцягнулася ва ўвесь рост і застыла нерухома. Потым сказала штосьці, чаго яны не зразумелі (але гучалі тыя словы жахліва), і зрабіла рух, быццам нешта кінула ў бок дзвярэй. Высокія і цяжкія дзверы на секунду задрыжалі, а пасля рассыпаліся ўшчэнт, і ад іх не засталося нічога, акрамя купкі пылу на парозе.

Дыгары прысвіснуў.

— Ці мае твой гаспадар чараўнік, твой дзядзька, сілу, як мая? — запыталася Каралева, ізноў моцна схапіўшы Дыгары за руку.— Гэта я дазнаюся пазней. А пакуль запомніце, што вы пабачылі. Так здараецца з рэчамі і людзьмі, якія заступаюць мне дарогу.

Праз дзвярны праём, цяпер пусты, лілося святло, і калі Каралева правяла дзяцей скрозь брамы, яны не здзівіліся таму, што апынуліся на вуліцы. Вецер, сцюдзёны і затхлы, дзьмуў у твар. Яны сталі на высокай тэрасе, а ўнізе ляжала дзівоснае наваколле.

Над самым даляглядам вісела аграмаднае чырвонае сонца, нашмат большае і старэйшае за нашае. Яно быццам бы дажывала свой век, стомленае ад гэтага свету. Злева ад сонца і значна вышэй яскрава свяціла вялікая зорка. Толькі гэтыя дзве рэчы былі на цёмным небе; яны выглядалі гнятліва. А на зямлі ва ўсе бакі,

наколькі хапала зроку, раскінуўся велізарны горад, у якім не было заўважна ніводнай жывой душы. І ўсе храмы, вежы, палацы, піраміды і масты адкідвалі доўгія вусцішныя цені. Некалі праз горад цякла вялікая рака, але цяпер гэта быў проста шырокі канал з шэрым пылам.

— Глядзіце ўважліва на тое, чаго ніхто больш ніколі не ўбачыць,— сказала Каралева.— Гэта быў Чарн, магутны горад, горад Цара Цароў, з якога дзівіўся ўвесь свет, магчыма, усе сусветы. Хлопчык, твой дзядзька кіруе горадам, такім жа вялікім, як гэты?

— Не,— адказаў Дыгары. Ён збіраўся патлумачыць, што дзядзька Эндру не кіруе аніякім горадам, але Каралева працягвала:

— Цяпер тут цішыня. Але я стаяла тут, калі ўсё паветра поўнілася гукамі Чарна: тупатам ног, рыпеннем колаў, шчоўканнем бізуноў і стогнамі рабоў, громам калясніц і боем барабанаў, калі ў храмах прыносіліся ахвяры. Я была тут (гэта быў амаль канец), калі роў бітвы падымаўся над кожнай вуліцай і рака Чарна сталася чырвонай.— Яна замаўчала і дадала: — Але адна жанчына знішчыла ўсё навечна.

— Хто? — запытаўся Дыгары слабым голасам; але ён ужо здагадаўся.

— Я,— адказала Каралева.— Я, Джадзіс, апошняя Каралева, Каралева Свету.

Двое дзяцей стаялі моўчкі, дрыжучы ад сцюдзёнага ветру.

— У гэтым вінаватая мая сястра,— сказала Каралева.— Яна вымусіла мяне гэта зрабіць. Хай праклён усіх сілаў будзе на ёй назаўжды! Я была гатовая да міру ў любы момант! Я нават была гатовая захаваць яе жыццё, калі б яна толькі пакінула мне трон. Але яна не захацела. Яе гонар загубіў увесь свет. З пачаткам вайны было заключана пагадненне, што ніводзін з бакоў не будзе выкарыстоўваць Магію. Але яна парушыла абяцанне, што я магла зрабіць? Дурніца! Нібыта яна не ведала, што ў мяне больш Магіі, чым у яе! Яна нават ведала, што я валодаю сакрэтам Непапраўнага Слова. Ці яна думала, што я не скарыстаю яго?

— А што гэта такое? — запытаўся Дыгары.

— Таямніца з таямніц,— сказала Каралева Джадзіс.— Вялікія каралі нашага роду даўно ведалі, што ёсць слова, якое, калі сказаць яго з патрэбнымі абрадамі, знішчыць усё жывое, акрамя таго, хто яго вымавіў. Але старажытныя каралі былі занадта слабымі ды мяккімі, яны звязалі сябе і нашчадкаў страшнай клятвай: ніколі не шукаць ведання гэтага слова. Я даведалася яго ў таемным месцы і заплаціла за гэта жахлівым коштам. Я не выкарыстоўвала яго, пакуль сястра не змусіла мяне. Я змагалася супраць яе ўсімі іншымі сродкамі. Кроў маіх войскаў лілася, як вада...

“Пачвара!” — падумала Полі.

— Апошняя вялікая бітва,— сказала Каралева,— кіпела тры дні. Тут, у самім Чарне. Тры дні я глядзела на яе якраз адсюль. Я не выкарыстоўвала сваю сілу, пакуль апошні мой жаўнер не загінуў і тая праклятая жанчына, мая сястра, на чале сваіх паўстанцаў не паднялася да сярэдзіны вялікай лесвіцы, якая вяла ад горада да гэтай тэрасы. Яна наблізілася да мяне, зірнула сваімі жудаснымі, подлымі вачыма і сказала: “Перамога!” “Так,— сказала я.— Толькі не твая”. І тады я прамовіла Непапраўнае Слова. У той жа момант я засталася адзінай жывой істотай пад сонцам.

— А як жа людзі? — выдыхнуў Дыгары.

— Якія людзі, хлопчык? — запыталася Каралева.

— Усе простыя людзі,— сказала Полі,— якія нічога ніколі вам не зрабілі: жанчыны, дзеці... І жывёлы.

— Ты не разумееш? — перапытала Каралева (працягваючы размаўляць з Дыгары).— Я была Каралевай. Яны — мае падданыя. Навошта ж яшчэ яны былі, акрамя таго, як спаўняць маю волю?

— Усё ж ім не пашанцавала,— сказаў Дыгары.

— Я забылася, што ты толькі звычайны хлопчык. Ты не ведаеш, што такое дзяржаўныя справы. Ты мусіш зразумець, дзіця: што непрымальнае для цябе ці для іншага звычайнага чалавека, прымальнае для такой вялікай Каралевы, як я. На нашых плячах цяжар

свету. Мы мусім быць вольныя ад усіх правілаў. Нам прыгатаваны вышэйшы і самотны лёс.

Дыгары раптам узгадаў, што дзядзька Эндру ўжыў менавіта такія ж словы. Але яны гучалі значна больш пераканаўча, калі іх вымавіла Каралева Джадзіс. Магчыма, таму, што дзядзька Эндру не быў так асляпляльна велічны.

— І што вы тады зрабілі? — запытаўся Дыгары.

— Я наклала моцны заклён на залу, у якой знаходзяцца постаці маіх продкаў. Таму я заснула сярод іх і магла спаць, хаця б прайшла тысяча год да таго, як нехта прыйдзе, ударыць у звон і абудзіць мяне.

— Гэта Непапраўнае Слова зрабіла сонца такім? — запытаўся Дыгары.

— Якім "такім"? — мовіла Джадзіс.

— Вялікім, чырвоным і халодным.

— Яно заўсёды такое,— адказала Джадзіс.— Прынамсі, сотні тысяч год. Ці ў вашым свеце сонца іншае?

— Так, яно меншае і жаўцейшае. І ад яго нашмат больш цеплыні.

— А-а-а,— працягнула Каралева. І Дыгары заўважыў на яе твары такі ж самы прагны выраз, які нядаўна бачыў на твары дзядзькі Эндру.— Значыцца,— сказала яна,— ваш свет маладзейшы.

Яна замаўчала на імгненне, каб яшчэ раз паглядзець на спустошаны горад. Калі яна і шкадавала пра тое

зло, якое зрабіла, то зусім не паказвала гэтага. Затым сказала:

— Цяпер давайце выпраўляцца. Тут, напрыканцы ўсіх вякоў, занадта халодна.

— Выпраўляцца куды? — удваіх запыталіся дзеці.

— Куды? — здзіўлена перапытала Джадзіс.— У ваш свет, вядома.

Полі і Дыгары ў жаху зірнулі адно на аднаго. Полі з самага пачатку не спадабалася Каралева, і нават Дыгары, пасля таго як пачуў усю гісторыю, адчуваў, што ўжо дастаткова даведаўся пра гэтую дзіўную жанчыну. Ён ніколі не запрасіў бы такога чалавека дадому. Яны хацелі выбрацца самі, але Полі не магла дацягнуцца да свайго пярсцёнка, і, вядома, Дыгары не мог выправіцца без яе. Ён моцна пачырванеў і пачаў заікацца.

— Н-н-наш свет? Я не ведаў, што вы захочаце адправіцца туды.

— А для чаго яшчэ вас паслалі сюды, як не прывесці мяне? — запыталася Джадзіс.

— Я ўпэўнены, вам зусім не спадабаецца наш свет,— сказаў Дыгары.— Так, Полі? Там вельмі сумна, няма на што паглядзець, праўда.

— Хутка там будзе на што паглядзець, калі я стану кіраваць ім,— адказала Джадзіс.

— Але вы не можаце,— сказаў Дыгары.— У нас усё не так. Вам не дазволяць, ведаеце.

Каралева пагардліва ўсміхнулася:

— Шмат якія каралі думалі, што здолеюць выстаяць супраць Дому Чарна. Але яны ўсе палі, і нават іх імёны забытыя. Дурны хлопец! Не міне і года, як я, з маёй прыгажосцю і Магіяй, пакладу ўвесь ваш свет да сваіх ног! Рыхтуйце свае заклёны і перанясіце мяне туды зараз жа.

— Гэта проста жах,— сказаў Дыгары Полі.

— Магчыма, ты баішся за свайго дзядзьку,— адказала Джадзіс.— Але калі ён ушануе мяне, то захавае жыццё і трон. Я не збіраюся змагацца з ім. Ён, відаць, вельмі магутны чараўнік, калі знайшоў, як даслаць вас сюды. Ён кароль усяго вашага свету ці толькі яго часткі?

— Ён увогуле не кароль,— вымавіў Дыгары.

— Ты хлусіш,— сказала Каралева.— Магія заўсёды перадаецца з каралеўскай крывёй. Звычайны чалавек не можа быць чараўніком. Значыць, твой дзядзька — вялікі кароль і вялікі чараўнік твайго свету. Дзякуючы свайму майстэрству ён пабачыў мой твар у нейкім магічным люстры ці зачараваным возеры і, захоплены маёй прыгажосцю, стварыў магутны заклён, які скалануў ваш свет да самых падвалінаў. Ён даслаў вас сюды, праз бездань паміж сусветамі, каб знайсці маю прыхільнасць і прывесці мяне да яго. Адказвай: так і было?

— Ну, не зусім,— сказаў Дыгары.

— Не зусім?! — крыкнула Полі.— Ты што? Гэта ж суцэльная лухта ад пачатку да канца!

— Нягодніца! — закрычала раз'юшаная Каралева, павярнуўшыся да Полі і схапіўшы яе за валасы, блізка да каранёў, дзе найбольш балюча. Але, зрабіўшы так, яна выпусціла рукі абодвух дзяцей.

— Давай! — гукнуў Дыгары, і Полі крыкнула:

— Хутчэй!

Яны засунулі рукі ў левыя кішэні. Як толькі дзеці дакрануліся да пярсцёнкаў, увесь гэты вусцішны свет знік з вачэй. Яны імкліва несліся ўверх, і цёплае зялёнае святло над іх галовамі набліжалася.

## Раздзел 6

# У дзядзькі Эндру пачынаюцца непрыемнасці

Пусці! Пусці! — крычала Полі.

— Я цябе не чапаю! — адказаў Дыгары.

Іх галовы паказаліся на паверхні. Наўкол ізноў была сонечная цішыня Лесу Паміж Сусветамі. Пасля руінаў палаца, якія яны толькі што пакінулі, лес выглядаў яшчэ больш цёплым і мірным. Я думаю, калі б у дзяцей была магчымасць, яны б зноў забыліся, хто яны і адкуль, прылеглі і, напалову заснуўшы, з асалодай слухалі, як растуць дрэвы. Але гэтым разам адна рэч прымусіла іх адкінуць супакой і дрымоту: яны зразумелі, што не адны. Каралева, ці Вядзьмарка (называйце яе, як вам падабаецца), перанеслася з імі, учапіўшыся за валасы Полі. Вось таму дзяўчынка і крычала: "Пусці!"

Дарэчы, гэта выявіла яшчэ адну якасць пярсцёнкаў, пра якую дзядзька Эндру не сказаў Дыгары, бо сам не ведаў. Каб пераскокваць са свету ў свет, не абавязкова самому надзяваць пярсцёнак ці датыкацца да яго. Дастаткова дакрануцца да таго, хто кранаецца пярсцёнка. У гэтым сэнсе яны спрацоўвалі як магніты. Усім вядома: калі падчапіць шпільку магнітам, любая іншая шпілька, якая датыкнецца да першай, таксама прычэпіцца.

Цяпер, у лесе, Каралева Джадзіс выглядала інакш. Яна была значна бялейшая, чым раней. Настолькі, што ад яе прыгажосці амаль нічога не засталося. Яна згорбілася, і, здавалася, ёй было цяжка дыхаць, нібыта паветра гэтага месца душыла яе. Ніхто з дзяцей цяпер зусім яе не баяўся.

— Пусціце! Пусціце мае валасы,— сказала Полі.— Чаго вы за мяне ўхапіліся?

— Так! Пусціце яе валасы! Зараз жа,— загадаў Дыгары.

Яны абодва павярнуліся і пачалі змагацца з ёй. Тут, у гэтым месцы, яны былі мацнейшымі за яе і праз некалькі секунд змусілі яе выпусціць Поліны валасы. Вядзьмарка адхіснулася, цяжка дыхаючы, і ў яе вачах была жудасць.

— Хутчэй, Дыгары! — сказала Полі.— Мяняй пярсцёнак і скочым у азярко, што вядзе дамоў.

— Памажыце! Памажыце! Злітуйцеся! — слабым голасам усклікнула Вядзьмарка, пахістваючыся і спрабуючы ісці за імі.— Забярыце мяне з сабой... Вы не можаце пакінуць мяне ў гэтым месцы... Яно мяне забівае.

— Гэта дзяржаўная справа,— з'едліва адказала Полі.— Як тады, калі вы забілі ўсіх тых людзей у сваім свеце. Давай хутчэй, Дыгары.

Яны надзелі зялёныя пярсцёнкі, але Дыгары прамовіў:

— Ну вось! Што нам рабіць? — Яму было крыху шкада Каралевы.

— Не будзь такім даверлівым! — сказала Полі.— Яна толькі прыкідваецца. Пайшлі!

І дзеці скочылі ў азярко, што вяло ў наш свет. "Добра, што мы пакінулі гэтую адзнаку",— падумала Полі. Але калі яны скочылі, Дыгары адчуў, як вялікія халодныя пальцы схапілі яго за вуха. І чым далей яны занурваліся і чым больш дакладнымі рабіліся размытыя абрысы нашага свету, тым больш мацнела хватка гэтых пальцаў. Сілы вярталіся да Вядзьмаркі. Дыгары вырываўся і брыкаўся, але ад гэтага не было ніякага толку. Праз імгненне яны ўжо былі ў кабінеце дзядзькі Эндру. Там быў сам дзядзька; ён утаропіўся

ў дзіўнае стварэнне, якое Дыгары прынёс з месца, што па-за гэтым светам.

І ён нездарма ўтаропіўся. Дыгары і Полі таксама. Вядзьмарка, без сумніву, ачуняла. Цяпер, калі яна апынулася ў нашым свеце, ад яе выгляду літаральна захоплівала дух. У Чарне яна выглядала небяспечнай; у Лондане пры позірку на яе мурашкі беглі па скуры.

Напрыклад, да гэтага моманту яны не разумелі, наколькі высачэзнай яна была. "Наўрад ці яна чалавек",— падумаў Дыгары, гледзячы на яе. І, магчыма, ён меў рацыю, бо некаторыя казалі, што ў жылах каралеўскага дому Чарна цячэ кроў веліканаў. Але яе рост быў нішто ў параўнанні з яе прыгажосцю і лютасцю. Яна выглядала ў дзесяць разоў жывейшай за большасць людзей у Лондане. Дзядзька Эндру кланяўся, пацірай рукі і быў, папраўдзе, да крайнасці напужаны. Побач з Каралевай Джадзіс ён нагадваў кузурку.

І ў той жа час, як Полі казала пасля, іх твары былі чымсьці падобныя. Яны мелі нейкі аднолькавы выраз. Гэта быў выгляд, які маюць усе злыя чараўнікі, "адзнака", якую Джадзіс не змагла знайсці на твары Дыгары. Ад таго, што яны апынуліся побач, была толькі адна выгада: дзеці ўжо ніколі больш не пабаяліся б дзядзькі Эндру. Як вы не баяліся б чарвяка пасля таго,

як пабачылі гадзюку; ці каровы, сустрэўшыся спачатку з шалёным быком.

"Пффф! — падумаў сам сабе Дыгары.— Які з яго чараўнік! А вось яна — сапраўдная вядзьмарка".

Дзядзька Эндру працягваў паціраць рукі і кланяцца. Ён намагаўся сказаць штосьці вельмі ветлівае, але ў яго зусім перасохла горла. Яго "эксперымент" з пярсцёнкамі, як ён гэта называў, аказаўся больш паспяховым, чым яму хацелася, бо, хоць ён і забаўляўся



магіяй гадамі, ён заўсёды пакідаў усю небяспеку (наколькі было магчыма) іншым людзям. Нічога нават блізка падобнага да гэтага з ім ніколі раней не здаралася.

Джадзіс загаварыла, не вельмі гучна, але ў яе голасе было штосьці, ад чаго ўвесь пакой задрыжаў.

— Дзе чараўнік, які паклікаў мяне ў гэты свет?

— Э… э… Мадам,— задыхнуўся дзядзька Эндру.— Які вялікі гонар… я неверагодна ўсцешаны… такая нечаканая ласка… я… я…

— Дзе Чараўнік, дурань? — паўтарыла Джадзіс.

— Гэта… гэта я, Мадам. Спадзяюся, вы даруеце… эм… гэтым шкадлівым дзецям. Хачу вас запэўніць, што я не меў і намеру…

— Ты — Чараўнік? — запыталася Каралева яшчэ больш страшным голасам. Потым, адным крокам перасекшы пакой, яна схапіла жменю сівых валасоў дзядзькі Эндру і рэзка пацягнула яго галаву назад, каб яго твар глядзеў на яе. Яна пачала вывучаць яго твар, як вывучала твар Дыгары ў палацы Чарна. Дзядзька Эндру ўвесь час міргаў і нервова аблізваў вусны. Нарэшце яна адпусціла яго так раптоўна, што ён адляцеў да сцяны.

— Зразумела,— мовіла яна пагардліва.— Ты чараўнік… у пэўным родзе. Падыміся, сабака, і не развальвайся так, нібыта размаўляеш з роўнымі табе.



Як ты авалодаў Магіяй? У табе няма каралеўскай крыві.

— Ну... эм... магчыма, не зусім каралеўская...— стаў заікацца дзядзька Эндру.— Тым не менш, Кэтэрлі — вельмі старажытны род. Старажытны род з Дорсетшыра, мадам.

— Ціха,— сказала Вядзьмарка.— Я бачу, што ты такое. Ты маленькі нязначны чараўнік, які працуе паводле правілаў і кніг. У тваёй крыві і сэрцы няма сапраўднай Магіі. У маім свеце з такімі, як ты, было скончана тысячу год таму. Але тут я літасціва дазволю табе быць маім слугой.

— Я буду надзвычай усцешаны... быць карысным любым чынам... для мяне гэта задавальненне, паверце.

— Ціха! Ты зашмат размаўляеш. Слухай сваё першае заданне. Я бачу, мы ў вялікім горадзе. Зараз жа знайдзі для мяне калясніцу, ці кілім-самалёт, ці добра навучанага дракона, ці што там выкарыстоўваюць каралеўскія і шляхетныя асобы ў вашай зямлі. А затым адвязі мяне туды, дзе я змагу знайсці адзенне, упрыгожанні і рабоў адпаведна майму статусу. Заўтра я пачну захопліваць гэты свет.

— Я-я-я... пайду і закажу брычку,— задыхаючыся прамовіў дзядзька Эндру.



— Стаяць,— сказала Вядзьмарка, якраз калі ён дайшоў да дзвярэй.— Нават і не думай аб здрадзе. Мае вочы бачаць скрозь сцены і сягаюць у розумы людзей. Мой позірк будзе на табе, куды б ты ні пайшоў. Пры першым жа знаку непадпарадкавання я нашлю на цябе такі заклён, што ўсё, на што ты сядзеш, будзе як гарачае жалеза, а калі ты

пакладзешся ў ложак, каля тваіх ног будуць нябачныя глыбы лёду. А цяпер пайшоў.

Стары выйшаў, нагадваючы сабаку, што падціснуў хвост.

Цяпер дзеці спужаліся: раптам Джадзіс скажа ім штосьці наконт таго, што адбылося ў лесе. Але, як аказалася, яна ніколі не ўзгадвала пра гэта — ні тады, ні пасля. Я думаю (і Дыгары таксама), што розум Вядзьмаркі быў так уладкаваны, што яна не магла ўвогуле запомніць тое ціхае месца. І не важна, як часта і як доўга яна б там была,— яна ўсё адно нічога пра гэта не ўзгадае. Цяпер, калі Вядзьмарка засталася адна з дзецьмі, яна не звяртала на іх аніякай увагі. І гэта таксама было ёй уласціва. У Чарне яна не звяртала ўвагі на Полі (да самага канца), бо хацела скарыстацца Дыгары. Цяпер, калі ў яе быў дзядзька Эндру, яна не заўважала Дыгары. Думаю, большасць вядзьмарак такія. Ім цікавыя рэчы ці людзі, толькі калі іх можна выкарыстаць; вядзьмаркі неверагодна прагматычныя. Таму хвіліну ці дзве ў пакоі стаяла цішыня. Але па тым, як Джадзіс пастуквала нагой, можна было сказаць, што яна траціць цярплівасць.

Праз нейкі час яна сказала, нібыта сама сабе: "Што гэты стары дурань робіць? Трэба было ўзяць бізун". Не кінуўшы нават позірку на дзяцей, яна выйшла з пакоя.

— Фух! — з палёгкай выдыхнула Полі.— А цяпер я мушу ісці дамоў. Позна ўжо. Ну і дастанецца мне!

— Калі ласка, вельмі цябе прашу, вярніся, як толькі здолееш,— узмаліўся Дыгары.— Гэта проста катастрофа. Нам трэба прыдумаць нейкі план.

— Цяпер гэта справа твайго дзядзькі,— сказала Полі.— Гэта ён усё пачаў. Дагуляўся з магіяй.

— Але ты ўсё адно вернешся, так? Каб гэта ўсё правалілася... Ты не можаш пакінуць мяне аднаго.

— Я пайду дамоў праз тунэль,— даволі халодна адказала Полі.— Так будзе найхутчэй. І калі ты хочаш, каб я вярнулася, думаю, табе варта папрасіць прабачэння.

— Папрасіць прабачэння? — усклікнуў Дыгары.— Вы толькі паглядзіце, ну і хіба гэта не па-дзявочаму? Што я зрабіў?

— О, вядома ж, нічога,— саркастычна прамовіла Полі.— Толькі ледзь не адкруціў мне руку ў пакоі з васкавымі фігурамі, як палахлівы хуліган. Проста стукнуў у звон тым малатком, як поўны дурань. Проста павярнуўся назад, калі мы былі ў лесе, так што яна паспела схапіцца за цябе, перш чым мы скочылі ў азярко. Толькі і ўсяго.

— А-а-а...— вельмі здзіўлена сказаў Дыгары.— Ну, добра, я перапрашаю. Я сапраўды прашу прабачэння за тое, што адбылося ў пакоі з васкавымі фігурамі.

Вось, я папрасіў прабачэння. А цяпер, прашу цябе, зрабі ласку, вяртайся. Я апынуся ў жахлівай сітуацыі, калі ты не вернешся.

— Не разумею, што можа з табой здарыцца. Гэта ж містар Кэтэрлі будзе сядзець на гарачых крэслах і спаць у ледзяным ложку, ці не так?

— Я не пра гэта,— сказаў Дыгары.— Я турбуюся за маму. Што, калі гэтая істота зойдзе ў яе пакой? Яна можа да смерці яе спужаць.

— Вох, разумею,— адказала Полі ўжо іншым голасам.— Добра. Абвесцім перамір'е. Я вярнуся, калі атрымаецца. Але цяпер я мушу ісці.— І яна пралезла праз маленькія дзверы ў тунэль. Гэтае цёмнае месца сярод бэлек, якое выглядала такім таямнічым некалькі гадзінаў таму, цяпер было звычайным і знаёмым.

Зараз мы мусім вярнуцца да дзядзькі Эндру. Яго беднае старое сэрца шпарка білася, пакуль ён, пахістваючыся, спускаўся па лесвіцы з гарышча. Ён увесь час выціраў лоб насоўкай. Урэшце дабраўшыся да сваёй спальні, якая была паверхам ніжэй, ён зачыніўся і перш за ўсё адшукаў у шафе бутэльку і келіх, якія заўсёды хаваў там, дзе цётка Лэці не магла іх знайсці. Дзядзька Эндру наліў поўны келіх нейкага агіднага напою, які п'юць дарослыя, і праглынуў усё адным глытком. Потым глыбока ўздыхнуў.

— Шчыра кажучы,— сказаў ён сабе,— я жудасна дрыжу. Гэта вельмі шкодна! У маім веку!

Ён наліў другі келіх і таксама выпіў; потым пачаў пераапранацца. Вы ніколі не бачылі такога адзення, але я яго памятаю. Ён апрануў вельмі высокі, бліскучы, цвёрды каўнер, які прымушаў увесь час высока трымаць падбароддзе. Надзеў белую камізэльку з узорам і ўладкаваў залаты ланцуг для гадзінніка ўпоперак грудзей. Потым апрануў лепшы фрак, які трымаў для вяселляў і пахаванняў. Дастаў лепшы высокі капялюш і пачысціў яго. На туалетным століку стаяла ваза з кветкамі (пастаўленая цёткай Лэці), і ён выцягнуў адну кветку і ўваткнуў яе ў пятліцу. Затым дастаў з маленькай шуфлядкі чыстую насоўку (добрую, зараз такіх не набыць) і крапнуў на яе парфумы. Ён узяў манокль на шырокай чорнай стужцы і ўставіў яго ў вока; пасля паглядзеў на сябе ў люстэрка.

У дзяцей, як вы ведаеце, свая дурнота, у дарослых — свая. У гэты момант дзядзька Эндру пачаў паводзіць сябе па-дурному ў вельмі характэрнай для дарослых манеры. Цяпер, калі ён больш не знаходзіўся ў адным пакоі з Вядзьмаркай, ён забыўся, як яна яго спалохала, і ўсё больш і больш думаў аб яе дзівоснай прыгажосці. Ён паўтараў і паўтараў сабе: "Шалёна прыгожая жанчына, сэр, шалёна прыгожая жанчына. Выбітнае стварэнне". Таксама ён нейкім чынам забыўся, што

гэта дзеці спрычыніліся да з'яўлення тут "выбітнага стварэння": ён пачуваўся, нібыта ён сам з дапамогай сваёй Магіі выклікаў яе з невядомых сусветаў.

— Эндру, даражэнькі,— сказаў ён сам сабе, гледзячы ў люстэрка.— Ты пякельна добра выглядаеш для чалавека твайго ўзросту. Вы — мужчына, які выглядае выключна, сэр.

Бачыце, гэты неразумны стары чалавек сапраўды пачынаў уяўляць, што Вядзьмарка закахаецца ў яго. Напэўна, да гэтага мелі дачыненне два выпітыя келіхі, а таксама яго найлепшая вопратка. Але, так ці іначай, ён быў надзьмуты ад самазахаплення, як паўлін. Менавіта таму ён і стаў чараўніком.

Ён адамкнуў дзверы, спусціўся ўніз, паслаў пакаёўку па экіпаж (усе мелі шмат прыслугі ў тыя дні) і зазірнуў у гасцёўню. Там, як ён і чакаў, была цётка Лэці. Яна засяроджана зашывала матрац, што ляжаў на падлозе ля акна.

— Ах, Летыцыя, мая дарагая,— сказаў дзядзька Эндру.— Мне, э-гм, трэба з'ездзіць у горад. Пазыч мне фунтаў пяць ці каля таго, будзь добрай дзічынкай (так ён вымаўляў "дзяўчынка").

— Не, дарагі Эндру,— адказала цётка Лэці цвёрдым, але ціхім голасам, не падымаючы вачэй ад працы.— Я ўжо безліч разоў паўтарала, што не буду пазычаць грошы.

— Малю цябе, не ствярай праблемы, мая дарагая дзічынка,— мовіў дзядзька Эндру.— Гэта вельмі важная справа. Ты паставіш мяне ў жудасна няёмкае становішча, калі не пазычыш.

— Эндру,— прагаварыла цётка Лэці, гледзячы проста яму ў твар.— Я дзіўлюся, што табе не сорамна прасіць у мяне грошы.

За гэтымі словамі хавалася доўгая нецікавая гісторыя ў стылі дарослых. Калі коротка, то дзядзька Эндру "вёў справы дарагой Лэці", ніколі не працаваў і часта выстаўляў вялікія рахункі на брэндзі і цыгары (якія цётка Лэці аплочвала зноў і зноў). Гэтым ён зрабіў яе значна бяднейшай, чым трыццаць год таму.

— Мая дарагая дзічынка,— сказаў дзядзька Эндру.— Ты не разумееш. У мяне сёння даволі непрадбачаныя выдаткі. Мне трэба зладзіць невялікую забаву. Ну давай, не будзь занудай.

— І каго ж ты збіраешся забаўляць, Эндру? — запыталася цётка Лэці.

— Эм... эм... толькі што да мяне прыбыў надзвычайны госць.

— Надзвычайная лухта! — сказала цётка Лэці.— У дзверы за апошнюю гадзіну ніхто не званіў.

У гэты момант дзверы раптоўна расчыніліся. Цётка Лэці азірнулася і са здзіўленнем пабачыла, што на

парозе стаіць высачэзная жанчына, багата і пышна апранутая, рукі аголеныя, вочы гарацць. Гэта была Вядзьмарка.

## Раздзел 7

# Што здарылася ля ўваходных дзвярэй

— Колькі я мушу чакаць на сваю калясніцу, раб? — загрымела Вядзьмарка. Дзядзька Эндру адступіў. Цяпер, калі яна стаяла тут, усе дурныя думкі, што былі ў яго, калі ён глядзеўся ў люстэрка, выветрыліся. Але цётка Лэці адразу паднялася з каленяў і выйшла на сярэдзіну пакоя.

— Хто гэтая маладая асоба, магу я запытацца, Эндру? — сказала цётка Лэці халодным тонам.

— Відная замежніца, в-вельмі важная асоба,— запыкаў той.

— Бязглуздзіца! — адказала цётка Лэці і, павярнуўшыся да Вядзьмаркі, загадала:

— Зараз жа прэч з майго дому, бессаромная дзеўка, інакш я паклічу паліцыю!

Яна падумала, што Вядзьмарка, напэўна, з цырку, і ёй вельмі не падабаліся аголеныя рукі.

— Што гэта за жанчына? — запыталася Джадзіс.— На калені, нягодніца, пакуль я цябе не пракляла!

— Ніякай кляцьбы ў гэтым доме, юная лэдзі,— сказала цётка.

Як падалося дзядзьку Эндру, Каралева імгненна стала яшчэ вышэй ростам. Агонь жахаў з яе вачэй; яна выпрастала руку з тым жа самым жэстам і жахлівымі словамі, якія нядаўна ператварылі ў пыл брамы палаца ў Чарне. Але нічога не адбылося. Толькі цётка Лэці, мяркуючы, што тыя страшэнныя словы мусілі быць звычайныя, зазначыла:

— Я так і думала. Гэтая жанчына п’яная. П’яная! Яна нават не можа разборліва гаварыць.

Напэўна, гэта быў жахлівы момант для Вядзьмаркі. Яна раптоўна зразумела, што яе ўменне ператвараць людзей у пыл, якое дзейнічала ў яе свеце, не працуе ў нашым. Але яна не разгубілася. Джадзіс рынулася наперад, схапіла цётку Лэці за шыю і калені, падняла над галавой, нібыта яна была не цяжэйшая за ляльку, і кінула яе праз пакой. Цётка Лэці ўсё яшчэ ляцела, калі служанка (у якой выдалася на дзіва захапляльная раніца) прасунула галаву ў дзверы і сказала:

— Выбачайце, сэр, экіпаж прыбыў.

— Вядзі, раб,— загадала Вядзьмарка дзядзьку Эндру. Ён пачаў мармытаць нешта накшталт “недаравальны гвалт… мушу выказаць глыбокую заклапочанасць”, але ад адзінага позірку Джадзіс у яго заняло мову. Каралева рушыла наперад, дзядзька Эндру затэпаў за ёй; Дыгары збягаў па лесвіцы менавіта ў час, калі за імі зачыніліся дзверы.

— Нішто сабе! — сказаў ён.— Яна гуляе па Лондане! З дзядзькам Эндру. Што ж цяпер будзе?

— Ой,— сказала служанка (у якой сапраўды быў надзвычайны дзень).— Здаецца, міс Кэтэрлі выцялася.

Таму яны абодва паспяшаліся ў гасцёўню, каб паглядзець, што адбылося.

Калі б цётка Лэці звалілася на голыя дошкі ці нават на дыван, я мяркую, усе яе косткі былі б пераламаныя, але дзякуючы неверагодна шчасліваму выпадку яна ўпала на матрац. Цётка Лэці была вельмі моцнай старой: цёткі часта былі такія ў тыя дні. Панюхаўшы нашатырнага спірту і пасядзеўшы спакойна пару хвілін, яна сказала, што ў яе ўсё добра, акрамя некалькіх сінякоў. Вельмі хутка яна ўзяла сітуацыю пад кантроль.

— Сара,— загадала яна служанцы (у якой ніколі не было такога цікавага дня).— Зараз жа пайдзі ў паліцыю і скажы, што на свабодзе разгульвае небяспечная звар’яцелая асоба. Я сама занясу абед місіс Кёрк.

Місіс Кёрк была, вядома, мамай Дыгары.



Пасля таго як ёй занеслі абед, хлопец і цётка Лэці паелі самі. Потым Дыгары моцна задумаўся.

Праблема была ў тым, як вярнуць Вядзьмарку ў яе ўласны свет або, прынамсі, прыбраць яе з нашага свету як мага хутчэй. Што б ні адбылося, нельга дазволіць ёй шалець у доме. Нельга дапусіць, каб маці яе пабачыла.

І калі магчыма, нельга дапусціць, каб яна разнесла Лондан. Дыгары не было ў гасцёўні, калі Вядзьмарка спрабавала праклясці цётку Лэці, але ён бачыў, як яна

зруйнавала брамы ў Чарне. Ён усвядоміў яе жудасную моц і не ведаў, што яна яе страціла, з'явіўшыся ў нашым свеце. І ён дакладна ведаў, што Вядзьмарка збіралася захапіць наш свет. У гэты момант яна, напэўна, ужо магла знішчаць Букінгемскі Палац ці Дом Парламента, і можна не сумнявацца, што вялікая колькасць паліцэйскіх паспела ператварыцца ў маленькія купкі пылу. І выглядала на тое, што ён нічога не можа з гэтым зрабіць. "Але пярсцёнкі, здаецца, працуюць як магніты,— думаў Дыгары.— Калі б я толькі мог дакрануцца да яе і надзець мой жоўты пярсцёнак, тады б мы абодва апынуліся ў Лесе Паміж Сусветамі. Цікава, яна там ізноў саслабне? На яе так дзейнічае тое месца ці гэта адбываецца толькі таму, што яе вырвалі з яе ўласнага свету? Мяркую, давядзецца рызыкнуць. І як знайсці гэтую пачвару? Не думаю, што цётка Лэці дазволіць мне сысці, пакуль я не скажу, куды іду. І ў мяне ёсць толькі два пенсы. Не ведаю, колькі спатрэбіцца грошай на аўтобусы і трамваі, калі я збіраюся шукаць па ўсім Лондане. У любым выпадку, у мяне няма ніякай ідэі, дзе шукаць. Цікава, дзядзька Эндру яшчэ з ёй?"

Такім чынам, яму заставалася толькі чакаць і спадзявацца, што дзядзька Эндру і Вядзьмарка вернуцца. Тады ён выбежыць, учэпіцца за Вядзьмарку і надзене свой жоўты пярсцёнак, перш чым яна паспее зайсці

ў дом. Гэта азначала, што Дыгары мусіў пільнаваць галоўныя дзверы, як котка пільнуе каля мышынай нары; нельга пакідаць свой пост ні на хвіліну. Таму ён пайшоў у гасцёўню і, як кажуць, прыляпіўся да акна. Акно было паўкруглым, і з яго можна было пабачыць прыступкі ля ўваходных дзвярэй і ўсю вуліцу. Такім чынам, ніхто не мог падысці да ўваходу незаўважаным. "Цікава, што робіць Полі?" — спрабаваў здагадацца Дыгары.

Ён шмат разважаў пра гэта першыя паўгадзіны, якія ішлі вельмі марудна. Але вам не трэба здагадвацца, бо я распавяду. Полі спазнілася на абед, прыйшла з наскрозь прамоклымі чаравікамі й панчохамі. І калі яе запыталіся, дзе яна была і што ж такое яна рабіла, дзяўчынка адказала, што гуляла з Дыгары Кёркам. У адказ на наступныя пытанні яна сказала, што прамачыла ногі ў азярцы і што азярцо было ў лесе. Калі яе запыталіся, дзе той лес, яна сказала, што не ведае. Калі яе запыталіся, ці быў гэта адзін з паркаў, яна даволі праўдзіва адказала, што, магчыма, гэта можна назваць паркам. З усяго гэтага Поліна маці зразумела, што Полі, не паведаміўшы нікому, пайшла ў невядомую ёй частку Лондана, трапіла ў незнаёмы парк і бавіла там час, скокаючы па лужынах. У выніку ёй сказалі, што яна кепска сябе паводзіла і што ёй больш не дазволяць гуляць з "гэтым Кёркам", калі штосьці

падобнае калі-небудзь адбудзецца яшчэ раз. Потым ёй далі абед, але без аніякіх прысмакаў, і адправілі на цэлыя дзве гадзіны ў ложак. У тыя дні такое здаралася даволі часта.

Такім чынам, пакуль Дыгары назіраў за вуліцай з акна ў гасцёўні, Полі ляжала ў ложку, і абодва думалі, як жахліва павольна можа ісці час. Мяркую, асабіста мне было б лепей на месцы Полі. Ёй толькі трэба было дачакацца канца сваіх дзвюх гадзінаў, а Дыгары кожныя некалькі хвілін чуў за рогам ці фурманку, ці фургон булачніка або мясніка і думаў: "Вось яна",— а пасля высвятлялася, што гэта не так. А паміж гэтымі фальшывымі трывогамі, здавалася, бясконца цікаў гадзіннік, і вялікая муха, вышэй, чым можна было яе дастаць, білася аб шкло. Гэта быў адзін з тых дамоў, у якіх пасля абеду бывае вельмі ціха і дзе заўсёды пахне варанай баранінай.

Падчас гэтага доўгага ўзірання і чакання адбылося маленькае здарэнне, пра якое варта распавесці, бо праз яго нешта істотнае адбылося пазней. Прыйшла лэдзі з вінаградам для маці Дыгары, і паколькі дзверы ў абедзенную залу былі адчыненыя, Дыгары ненаўмысна падслухаў, як цётка Лэці і тая жанчына размаўлялі ў вітальні.

— Які цудоўны вінаград! — пачуўся голас цёткі Лэці.— Ён будзе ёй карысны. Бедная дарагая Мэйбл!

Баюся, ёй цяпер дапамаглі б толькі плады з краю вечнай маладосці. У гэтым свеце ўжо нішто не...

Тут яны абедзве панізілі голас і гаварылі далей, але ўжо не было чуваць.

Калі б Дыгары пачуў словы пра край вечнай маладосці яшчэ пару дзён таму, ён падумаў бы, што цётка Лэці проста кажа, не маючы на ўвазе анічога дакладнага, у стылі дарослых, і гэта яго не зацікавіла б. Ён амаль так жа паставіўся да гэтага і зараз. Але раптоўна ў яго галаве ўспыхнула думка: цяпер ён ведаў (нават калі цётка Лэці не ведала), што іншыя сусветы сапраўды існуюць. І ён нават быў у адным з іх. Такім чынам, дзесьці можа існаваць сапраўдны Край Вечнай Маладосці. Там можа быць усё, што заўгодна. У нейкім іншым свеце могуць расці плады, здольныя ацаліць яго маці. І — ну, вы ведаеце, як гэта бывае, калі вы пачынаеце спадзявацца атрымаць штосьці, чаго вы адчайна прагнеце, і змагаецеся са спадзяваннем, бо так часта расчароўваліся раней. Вось як адчуваў сябе Дыгары. Але задушыць надзею не атрымлівалася. А раптам гэта можа стаць праўдай? Так шмат дзіўных рэчаў ужо адбылося. І ў яго былі чароўныя пярсцёнкі. Праз азёры ў лесе можна трапіць у іншыя сусветы. Ён мог паспытаць іх усе. І потым з маці ўсё ізноў будзе добра. Усё ізноў будзе правільна. Ён і думаць забыў аб паляванні на Вядзьмарку. Яго рука ўжо цягнулася

да кішэні, дзе быў жоўты пярсцёнак, калі ён раптоўна пачуў пошчак капытоў.

“Гэй, што гэта? — падумаў Дыгары.— Пажарныя? Цікава, які дом загарэўся. Не, гук набліжаецца сюды... Вох, гэта яна”.

Мне не трэба казаць вам, каго ён меў на ўвазе.

Спачатку паказалася двухколка. На месцы фурмана нікога не было. На даху — не седзячы, а стоячы,— нахіліўшыся з зайздросным пачуццём раўнавагі, калі двухколка на поўнай хуткасці павярнула з-за рога так, што адно кола апынулася ў паветры, была Джадзіс, Каралева каралеў і Жах Чарна. Яна ашчэрыла зубы, яе вочы ззялі як полымя, а доўгія валасы трапяталіся за спінай, як хвост каметы. Вядзьмарка бязлітасна хвастала каня пугай, яго чырвоныя ноздры шырока раздзімаліся, а бакі былі пакрытыя пенай. Абмінуўшы ліхтар на некалькі сантыметраў, конь шалёна падляцеў да дзвярэй і ўзняўся на дыбкі. Двухколка ўдарылася ў ліхтар і разляцелася. Вядзьмарка так, што ва ўсіх захапіла дых, саскочыла з двухколкі якраз у час і апынулася на спіне каня. Яна ўладкавалася верхам і нахілілася, нашэптваючы нешта ў яго вуха. Напэўна, тое, што яна сказала, было не для таго, каб супакоіць, але каб раз’юшыць. Праз імгненне конь ізноў быў на задніх нагах, і яго іржанне было падобным да крыку; ён быў адным шалёным клубком капытоў, зубоў, вачэй



і растрапанай грывы. Толькі выбітны вершнік здолеў бы ўседзець у яго на спіне.

Не паспеў Дыгары перавесці дух, як адбылося шмат іншага. Другая двухколка з разлёту спынілася ля першай: адтуль выскачылі тоўсты мужчына ў фраку і паліцэйскі. Потым прымчала трэцяя двухколка з яшчэ двума паліцэйскімі. Пасля з'явілася каля дваццаці чалавек на роварах (збольшага рассыльныя). Усе яны званілі ў званкі, крычалі і свісталі. Апошнім з'явіўся натоўп пешых людзей: усе вельмі разгарачыліся ад бегу, але, відавочна, атрымлівалі асалоду. Ва ўсіх дамах на вуліцы зачыніліся вокны, і служанкі ці дварэцкія ўзніклі ля кожных дзвярэй. Яны хацелі паглядзець на шоу.

Тым часам з-пад абломкаў першай двухколкі пачаў выбірацца стары джэнтльмен. Некалькі чалавек кінуліся яму дапамагаць, але паколькі хтосьці цягнуў яго ў адзін бок, а хтосьці — у іншы, то ён хутчэй бы



выбраўся сам. Дыгары падумаў, што стары джэнтльмен — гэта, пэўна, дзядзька Эндру. Але аблічча таго не было відаць; яго высокі капялюш быў насунуты на твар.

Дыгары выбег і далучыўся да натоўпу.

— Гэта тая жанчына, гэта яна! — крычаў тоўсты чалавек, паказваючы на Джадзіс.— Рабіце вашую працу, канстэбль! Яна скрала з маёй крамы рэчы, якія каштуюць тысячы фунтаў. Паглядзіце на перлавыя пацеркі вакол яе шыі. Яны мае! А яшчэ яна ўдарыла мяне ў вока, і там цяпер сіняк.

— Сапраўды, начальнік,— прамовіў нехта з натоўпу.— Выдатны сіняк. Файны мусіў быць удар. Такая моц!

— Вам варта прыкласці да яго сыры біфштэкс, містар, вось што трэба зрабіць,— параіў хлопец з крамкі мясніка.



— Так,— сказаў самы галоўны з паліцэйскіх.— Што тут адбываецца?

— Я распавяду вам, яна...— пачаў таўстун, але нехта крыкнуў:

— Не дайце таму старому тыпу ўцячы! Гэта ён падбухторыў яе.

Стары джэнтльмен, які дакладна быў дзядзькам Эндру, толькі што здолеў падняцца і цёр сінякі.

— Слухайце,— мовіў паліцэйскі, павярнуўшыся да яго.— Што тут адбываецца?

— Вомфі-помфі-шомф,— пачуўся голас дзядзькі Эндру знутры капелюша.

— Хопіць,— строга сказаў паліцэйскі.— Тут вам не жартачкі. Здыміце гэты капялюш.

Гэта было прасцей сказаць, чым зрабіць. Але праз некалькі хвілін няўдалага змагання з капелюшом два іншыя паліцэйскія сцягнулі яго, ухапіўшыся па краях.

— Дзякую, дзякую,— прагаварыў дзядзька Эндру слабым голасам.— Дзякую. Я жудасна пацярпеў. Калі б нехта наліў мне невялічкую шкляначку брэндзі...

— Падыдзіце да мяне, зрабіце ласку,— сказаў паліцэйскі і дастаў вельмі вялікі нататнік і вельмі маленькі аловак.— Ці вы адказваеце за гэтую маладую жанчыну?

— Асцярожна! — крыкнула некалькі галасоў, і паліцэйскі паспеў адскочыць назад. Конь спрабаваў

пацэліць у яго і брыкнуць, што, магчыма, забіла б паліцэйскага. Потым Вядзьмарка развярнула каня так, каб быць тварам да натоўпу. У яе ў руцэ быў доўгі бліскучы нож, якім яна абсякала з каня рэшткі вупражы.

У гэты час Дыгары спрабаваў прабрацца туды, дзе б ён змог дакрануцца да Вядзьмаркі. Было складана, бо перашкаджаў натоўп. А каб падысці з іншага боку, яму давялося б праціснуцца паміж конскімі капытамі і агароджай вакол дома. Калі вы хоць штосьці ведаеце пра коней, і асабліва калі б вы пабачылі, які раз'ятраны быў конь у той момант, вы б зразумелі, наколькі рызыкоўна было так рабіць. Дыгары шмат ведаў пра коней, але ён сцяў зубы і рыхтаваўся рвануць наперад, як толькі будзе зручны момант.

Чырванатвары мужчына ў кацялку пракладваў сабе дарогу праз натоўп.

— Добрага здароўечка! — сказаў ён паліцэйскаму.— Гэна мой конь, і гэна маю брычку яна разнесла ўшчэнт.

— Хвіліначку, калі ласка, хвіліначку! — адказаў паліцэйскі.

— Але хвіліначкі няма,— сказаў вознік.— Я ведаю гэнага каня лепей за вас. Ягоны родны бацька быў баявым канём ахвіцэра кавалерыі, ага. І калі гэная кабеціна і далей будзе злаваць яго, тут станецца забойства. Пусціце мяне туды.

Паліцэйскі быў толькі рады скарыстацца момантам, каб адысці ад каня. Вознік падышоў бліжэй, паглядзеў на Джадзіс і мовіў спакойным голасам:

— Слухайце, паненка, дайце я яго патрымаю, а вы злазьце. Вы ж, відаць, з культурнай сям'і. І нашто вам увесь гэны вэрхал, га? Ідзіце вы лепш дадому, запарце сабе гарбаткі з варэннем, адпачніце — вам адразу палягчэе.

Ён працягнуў руку да галавы каня і прашаптаў:

— Ціха, Агрэсцік, косю. Супакойся.

Тут Вядзьмарка ўпершыню загаварыла.

— Сабака! — яе ледзяны голас зазвінеў над вуліцай.— Сабака, прыбяры рукі ад каралеўскага баявога каня! Я — імператрыца Джадзіс!

## Раздзел 8
# Бітва каля ліхтара

— Глядзі ты, Яе Імператарская Вялікасць! — крыкнуў нехта.

Іншы голас выгукнуў:

— Тройчы "ўра" Імператрыцы!

І даволі шмат галасоў далучылася. Твар Вядзьмаркі крыху паружавеў, і яна ледзь заўважна пакланілася. Але вітальныя крыкі раптам замяніла хваля смеху, і яна зразумела, што з яе проста здзекуюцца. Выраз яе аблічча змяніўся, і яна перакінула нож у левую руку. Потым, без папярэджання, яна зрабіла нешта зусім нечаканае. Лёгка, без высілкаў, нібыта гэта была самая звычайная рэч у свеце, Вядзьмарка выцягнула правую руку і адарвала адзін з прутоў ад ліхтарнага слупа. Калі яна і страціла чароўную сілу ў нашым свеце, дык не страціла сваёй уласнай і магла зламаць жалезны прут, нібыта трысціну.

Яна падкінула сваю новую зброю ў паветра і злавіла яе.

"Вось мой шанец",— падумаў Дыгары.

Ён пачаў прабірацца паміж канём і агароджай. Калі б толькі шалёная жывёла імгненне пастаяла спакойна, каб можна было ўхапіцца за пяту Вядзьмаркі! Пакуль ён прабіраўся, пачуўся агідны трэск і цяжкі глухі ўдар. Вядзьмарка апусціла прут на шалом галоўнага паліцэйскага: той зваліўся, як кегля.

— Хутчэй, Дыгары! Гэта трэба спыніць,— пачуўся голас за ім. Гэта была Полі, якая, як толькі ёй дазволілі ўстаць з ложка, паспяшалася сюды.

— На цябе заўсёды можна спадзявацца,— сказаў Дыгары.— Трымайся побач. Табе трэба будзе паклапаціцца пра пярсцёнак. Жоўты, не забудзься. І не надзявай яго, пакуль я не крыкну.

Трэск пачуўся яшчэ раз, яшчэ адзін паліцэйскі быў скрышаны. Натоўп узняў раз'юшаны роў: "Сцягніце яе ўніз! Бярыце камяні! Выклічце вайскоўцаў!" Але большасць людзей уцякала як мага далей. Вознік аказаўся самым адважным з прысутных, ён заставаўся побач з канём, ухіляючыся ад прута і спрабуючы ўхапіць Агрэста за галаву.

Натоўп свістаў і лямантаваў. Над галавой Дыгары пранёсся камень. Потым пачуўся голас Вядзьмаркі,

зычны, як вялікі звон, які гучаў так, нібыта яна была амаль шчаслівай.

— Вы, смецце! Вы дорага заплаціце за гэта, калі я захаплю ваш свет. Ад вашага гораду не застанецца ні каменя! Ён будзе як Чарн, як Фэлінда, як Сэрлой, як Брэмэндын.

Дыгары нарэшце ўхапіў яе за шчыкалатку. Яна адпіхнулася пятой і ўдарыла яго ў вусны. Ад болю ён адпусціў яе. Вусны былі разбітыя, а рот поўны крыві. Недзе блізка пачуўся голас дзядзькі Эндру: "Мадам, мая дарагая юная лэдзі, малю вас, вазьміце сябе ў рукі!"

Дыгары зноў схапіў Вядзьмарку і зноў быў адкінуты. Усё больш людзей падала ад удараў жалезнага прута. Дыгары паспрабаваў у трэці раз, учапіўся за яе пяту як клешч і крыкнуў Полі: "Давай!". Потым злыя спалоханыя твары зніклі. Злыя спалоханыя галасы сціхлі. Усе, акрамя голасу дзядзькі Эндру. Ён скуголіў зусім побач з Дыгары: "Вох, вох, гэта што, трызненне? Ці гэта канец? Я не магу гэтага вынесці. Гэта несправядліва. Я ніколі не хацеў быць чараўніком. Гэта ўсё непаразуменне. Гэта ўсё мая хросная, я буду гэта аспрэчваць. І пры маім стане здароўя. Вельмі старая сям'я з Дорсетшыра".

"Толькі дзядзькі тут не хапала! — падумаў Дыгары.— Мы не збіраліся яго браць. Вось дык пікнічок атрымаецца".

— Полі, ты тут? — запытаў ён.

— Так, тут. Перастань піхацца.

— Я не піхаюся...— пачаў Дыгары, але не паспеў ён нічога дадаць, як іх галовы з'явіліся ў цёплым зялёным сонечным святле лесу.

І калі яны выбраліся з азярка, Полі закрычала:

— Глядзі! Мы перанеслі сюды і каня. І містара Кэтэрлі! І возніка! Добры ўлоў атрымаўся!

Як толькі Вядзьмарка пабачыла, што яна ізноў у лесе, яна пабялела і нахілілася, уткнуўшыся ў грыву каня. Было відавочна, што ёй смяротна кепска. Дзядзьку Эндру біла дрыготка. Але Агрэст страсянуў галавой, вясёла заржаў і, здавалася, выдатна пачуваўся. Ён супакоіўся ўпершыню з таго часу, як яго пабачыў Дыгары. Яго вушы, якія былі шчыльна прыціснутыя да галавы, выпрасталіся, а з вачэй знік агонь.

— Вось так, хлопча,— мовіў вознік, паляпваючы Агрэста па шыі.— Вось так лепей. Супакойся.

Агрэст зрабіў самую натуральную рэч у свеце. Ён моцна хацеў піць (што не дзіўна) і таму павольна пайшоў да бліжэйшага азярка ды ступіў у яго, каб папіць. Дыгары ўсё яшчэ трымаўся за пяту Вядзьмаркі, а Полі трымалася за яго руку. Вознік дакрануўся адной рукой да Агрэста, а дзядзька Эндру, усё яшчэ моцна дрыжучы, проста ўчапіўся за яго другую руку.

— Хутчэй,— сказала Полі, зірнуўшы на Дыгары.— Зялёныя!

Такім чынам, у каня не атрымалася папіць. Замест гэтага ўсю кампанію зацягнула ў цемру. Агрэст іржаў, дзядзька Эндру хныкаў. Дыгары сказаў: "Нам проста пашанцавала".

На кароткі час стала ціха. Потым Полі сказала:

— Ці мы не павінны былі ўжо апынуцца там?

— Здаецца, мы ўсё-такі недзе апынуліся,— сказаў Дыгары.— Прынамсі, я стаю на нечым цвёрдым.

— О, я таксама! Цяпер я гэта адчуваю,— адказала Полі.— Але чаму тут так цёмна? Ты думаеш, мы патрапілі не ў тое азярко?

— Магчыма, гэта Чарн,— сказаў Дыгары.— Толькі мы вярнуліся ў сярэдзіне ночы.

— Гэта не Чарн,— пачуўся голас Вядзьмаркі.— Гэта пусты свет. Гэта Нічога.

І сапраўды, гэтае месца вельмі моцна нагадвала Ніштo. Не было зор. Было так цёмна, што яны не бачылі адно аднаго і не было розніцы, расплюшчыў ты вочы ці заплюшчыў. Пад іх нагамі было сцюдзёнае плоскае нешта, што магло быць глебай, але дакладна не было травой. Паветра было астылым і сухім, ветру не было.

— Мяне напаткаў мой лёс,— жудасна спакойным голасам сказала Вядзьмарка.

— О, не кажыце так,— прабулькатаў дзядзька Эндру.— Мая дарагая юная лэдзі, малю, не кажыце такіх рэчаў. Усё не можа быць так кепска. Ах, вознік,

дружа мой, ці няма ў цябе з сабой біклажкі? Кропля брэндзі — якраз тое, што мне трэба.

— Гэй, гэй,— пачуўся голас возніка, добры, цвёрды, смелы голас.— Усе супакойцеся. Ніхто нічога не зламаў? Добра. Ну, хаця б за гэна можна падзякаваць. Пасля такога падзення большага нельга і пажадаць. Цяпер, калі мы зваліліся ў нешта выкапанае,— можа, у новую станцыю метро,— хтосьці хутка прыйдзе і выцягне нас! А калі мы памерлі, што, вядома, магло здарыцца, ну, вы мусіце... памятаць, што ў моры яшчэ горшыя рэчы здараюцца... Ды і ўсе калі-небудзь паміраюць. Няма чаго гэтага баяцца, калі вы пражылі прыстойнае жыццё. Як на мяне, лепшае, што мы можам зрабіць, каб заняць час, гэта заспяваць хваласпеў.

Вознік так і зрабіў. Ён адразу ж заспяваў гімн падзякі, які спяваюць падчас збору ўраджаю, пра плады зямлі, "ужо сабраныя з палёў". Гімн не вельмі пасаваў да месца, у якім, здавалася, ад пачатку часоў ніколі нічога не расло. Але гэта быў спеў, які вознік памятаў найлепей. У яго быў прыемны голас, і дзеці далучыліся: гэта вельмі падбадзёрвала. Дзядзька Эндру і Вядзьмарка маўчалі.

Бліжэй да канца гімна Дыгары адчуў, як хтосьці торгае яго за локаць, і па паху брэндзі, цыгар і парфумы ён зразумеў, што гэта дзядзька Эндру. Дзядзька Эндру асцярожна пацягнуў яго ўбок ад іншых. Калі

яны крыху адышлі, стары прашаптаў у самае вуха Дыгары:

— Слухай, хлопчык мой, надзень свой пярсцёнак. Давай адсюль выбірацца.

Але ў Вядзьмаркі быў вельмі добры слых.

— Дурань! — пачуўся яе голас, і яна саскочыла з каня.— Ты забыўся, што я магу пачуць думкі? Адпусці хлопца. Калі ты паспрабуеш здрадзіць мне, мая помста будзе такой, пра якую не чулі ў ніводным сусвеце ад пачатку часоў.

— І,— дадаў Дыгары,— калі вы думаеце, што я такая гнюсная свіння, што магу знікнуць, пакінуўшы Полі, і возніка, і каня ў такім месцы, вы моцна памыляецеся.

— Ты вельмі непаслухмяны і дзёрзкі маленькі хлопчык,— сказаў дзядзька Эндру.

— Ціха! — мовіў вознік. Яны ўсе прыслухаліся.

У цемры нешта адбывалася. Чыйсьці голас заспяваў. Ён быў вельмі далёка, і Дыгары не мог разабрацца, адкуль ён ішоў. Здавалася, што гук чуецца адразу адусюль. Часам Дыгары думаў, што спеў ішоў ад зямлі пад іх нагамі. Ніжэйшыя ноты былі дастаткова глыбокія, каб быць голасам самой зямлі. Словаў не было. Нават мелодыі амаль не было. Але гэта быў непараўнальны, найпрыгажэйшы гук, які ён калі-небудзь чуў. Ён быў такі прыгожы, што Дыгары ледзь

мог яго вытрымаць. Каню, здавалася, спеў таксама падабаўся; ён заржаў так, як заржаў бы конь, які, адпрацаваўшы гады ў двухколцы, вярнуўся назад, на старое поле, дзе ён забаўляўся, калі быў жарабём, і пабачыў, як той, каго ён памятаў і любіў, ідзе да яго праз поле і нясе яму кавалак цукру.

— Уга! — сказаў вознік.— Ці ж не прыгажосць?

Потым адначасова здарылася два цуды. Спачатку да першага голасу раптоўна далучыліся іншыя. Загучала столькі галасоў, што іх немагчыма было палічыць. Яны былі ў гармоніі з першым, але значна вышэйшыя: звонкія, трапяткія, срэбныя галасы. Другім цудам было тое, што чарната над галавой, уся адразу, зазіхацела зоркамі. Яны з'явіліся ў адно імгненне. Толькі што не было нічога — і раптам узніклі тысячы і тысячы кропак святла: зоркі, сузор'і і планеты, ярчэйшыя і большыя за любую ў нашым свеце. Аблокаў не было. Калі б вы бачылі і чулі гэта, як бачыў і чуў Дыгары, вы былі б упэўненыя, што гэта спявалі самі зоры і што менавіта той, глыбокі Першы Голас зрабіў так, каб яны заззялі і заспявалі.

— Вось дык штука! — усклікнуў вознік.— Я б намагаўся пражыць лепшае жыццё, калі б ведаў, што такое існуе.

Першы голас станавіўся грамчэйшы, іншыя галасы пачалі сціхаць. Але цуды не скончыліся.

Далёка, ля самага краю, неба пакрыху шарэла. Пачаў дзьмуць лёгкі, свежы ветрык. Неба павольна і паступова святлела, і на яго фоне вымалёўваліся абрысы ўзгоркаў. Увесь час Голас працягваў спяваць.

У хуткім часе яны ўжо маглі бачыць твары адзін аднаго. Дзеці і вознік стаялі з раскрытымі ратамі, іх вочы ззялі. Яны быццам пілі гук і выглядалі так, нібыта гэты спеў ім штосьці нагадваў. Рот дзядзькі Эндру таксама быў адкрыты, але не ад радасці. У яго проста адвісла сківіца. Ён згорбіўся, а калені дрыжалі. Яму не падабаўся Голас. Калі б дзядзька мог схавацца ад яго, залезшы ў нейкую нару, ён бы так і зрабіў. А Вядзьмарка выглядала так, нібыта яна, у нейкім сэнсе, разумела гэтыя гукі лепш за ўсіх астатніх. Яе рот быў закрыты, вусны сцятыя і кулакі сціснутыя.



Як толькі спеў пачаўся, яна адчула, што ўвесь гэты свет напоўніўся Магіяй, адрознай і мацнейшай за ейную. Джадзіс ненавідзела гэтую Магію. Яна разнесла б увесь гэты сусвет ці ўсе сусветы, каб толькі спеў спыніўся. А конь стрыг вушамі. Раз-пораз ён пырхаў і біў нагой па зямлі. Ён больш не выглядаў як стомлены, стары конь возніка; цяпер бы вы лёгка паверылі, што яго бацька быў баявым канём.

На ўсходзе неба з белага стала ружовым, а пасля залатым. Голас грамчэў і грамчэў, пакуль ад яго не задрыжэла паветра. І калі ён узнёсся да невыразна цудоўнага і найбольш велічнага гуку з усіх, якія чуліся дагэтуль, узышло сонца.

Дыгары ніколі не бачыў такога сонца. Сонца над руінамі Чарна выглядала старэйшым за нашае, а гэтае глядзелася маладзейшым. Можна было ўявіць, што яно, узыходзячы, смяецца ад радасці. І калі яго праменне рассыпалася па-над зямлёй, вандроўнікі ўпершыню пабачылі, да чаго падобнае месца, у якім яны знаходзіліся. Гэта была даліна, праз якую на ўсход, да сонца, вілася шырокая хуткая рака.

На поўдні былі горы, на поўначы — узгоркі. Але ў даліне былі толькі глеба, скалы і вада — ані дрэва, ані кустоўя, ані травінкі. Глеба была розных колераў;

яны былі свежыя, яскравыя і жывыя. Гэты краявід захапіў бы вас, але толькі да той пары, пакуль бы вы не пабачылі Таго, Хто Спяваў, бо пасля вы забыліся б на ўсё ў свеце.

Гэта быў Леў. Велізарны, з пышнай грывай, светлы, ён стаяў, павярнуўшыся да сонца. Яго пашча была шырока адкрытая ў спеве. Ён быў прыкладна ў трохстах метрах.

— Гэта жахлівы свет,— прамовіла Вядзьмарка.— Трэба зараз жа ўцякаць. Падрыхтуйце заклёны.

— Я цалкам згодны з вамі, мадам,— зазначыў дзядзька Эндру.— Наймярзотнейшае месца. Ніякай цывілізацыі. Калі б я быў маладзейшым і меў бы стрэльбу...

— Вы сур'ёзна? — здзівіўся вознік.— Вы ж не думаеце, што змаглі б застрэліць яго?

— Хто ж гэта наважыцца,— сказала Полі.

— Давай, чаруй, стары дурань,— загадала Джадзіс.

— Вядома, мадам,— хітра сказаў дзядзька Эндру.— Трэба, каб дзеці даткнуліся да мяне. Дыгары, надзень пярсцёнак, які прывядзе нас дадому.

Ён хацеў знікнуць без Вядзьмаркі.

— Дык гэта пярсцёнкі, так? — ускрыкнула Джадзіс. Яна б засунула рукі ў кішэні Дыгары хутчэй, чым вы пікнулі, але Дыгары схапіў Полі і закрычаў:

— Назад! Калі нехта з вас дваіх падыдзе хоць на сантыметр бліжэй, мы двое знікнем, і вы назаўсёды застанецеся тут. Так, у мяне ў кішэні пярсцёнак, які перанясе мяне і Полі дадому. І зірніце! Я гатовы ў любы момант гэта зрабіць. Таму трымайцеся падалей. Мне шкада вас (ён паглядзеў на возніка) і каня, але я не магу нічога зрабіць. А што тычыцца вас дваіх (ён паглядзеў на дзядзьку Эндру і Каралеву), вы абодва чараўнікі, таму вам спадабаецца кампанія адно аднаго.

— Ціха вы ўсе,— сказаў вознік.— Я хачу паслухаць музыку.

Бо цяпер спеў змяніўся.

## Раздзел 9

# Узнікненне Нарніі

Леў хадзіў узад-уперад па пустой зямлі і спяваў новую песню. Яна была цішэйшай і мілагучнейшай за тую, якой ён выклікаў зоры і сонца; гэта была пяшчотная бруістая музыка. І падчас таго, як ён хадзіў і спяваў, даліна пакрывалася зялёнай травой. Трава расцякалася ад Ільва, як вада. Нібыта хвалі, яна дасягнула спачатку маленькіх узгоркаў, а затым — ніжніх схілаў далёкіх гор, з кожным імгненнем робячы гэты малады свет усё больш прывабным. Цяпер было чуваць, як лёгкі вецер гойдае траву. Хутка апроч яе з'явіліся іншыя рэчы. Вышэйшыя схілы гор пацямнелі ад верасу. У даліне ўзніклі выспачкі больш шорсткай і шчаціністай зеляніны. Дыгары не разумеў, што гэта, пакуль такая выспачка не пачала з'яўляцца каля іх. Гэта было маленькае завостранае нешта, што раскідвала дзясяткі атожылкаў, якія пакрываліся зелянінай, і расло з хуткасцю прыкладна некалькі сантыметраў

кожныя пару секундаў. Цяпер вакол Дыгары было некалькі тузінаў такіх штук. Калі яны сталі прыкладна ростам з яго, ён зразумеў, што гэта.

— Дрэвы! — усклікнуў ён.

Было шкада, як пасля казала Полі, што ім не далі спакойна на гэта ўсё паглядзець. Як толькі Дыгары сказаў: "Дрэвы!" — яму адразу давялося адскочыць, бо дзядзька Эндру падбіраўся да яго, каб залезці ў кішэню. Нават калі б манеўр атрымаўся, гэта не вельмі б дапамагло. Дзядзька Эндру хацеў залезці ў правую кішэню Дыгары, бо ўсё яшчэ думаў, што зялёныя пярсцёнкі пераносяць дадому. Але Дыгары, вядома, увогуле не хацеў, каб іх скралі.

— Стаяць! — крыкнула Вядзьмарка.— Назад! Не, яшчэ далей. Калі хто-небудзь падыдзе да дзяцей бліжэй чым на дзесяць крокаў, я разнясу яму галаву.

Яна ўзняла жалезны прут, падрыхтаваўшыся кінуць яго. Ніхто не сумняваўся, што яна не спудлуе.

— Дык што,— сказала яна,— ты збіраўся вышмыгнуць у свой свет разам з хлопцам і пакінуць мяне тут?

Нарэшце абурэнне дзядзькі Эндру ўзяло верх над страхам.

— Так, мадам,— адказаў ён.— Вядома, я б так і зрабіў. Я маю на гэта поўнае права. Са мной абыходзіліся самым ганебным, самым агідным чынам. Я зрабіў усё, што мог, каб аказаць вам тыя паслугі, якія былі ў маёй

уладзе. І чым мне адплацілі? Вы абрабавалі — я паўтараю, абрабавалі — вельмі паважанага ювеліра. Вы змусілі мяне пачаставаць вас вельмі дарагім, калі не сказаць выхвальным, абедам, так што мне давялося пакінуць пад заклад мой гадзіннік і ланцужок, каб разлічыцца (і дазвольце вам сказаць, мадам, што ніхто з нашай сям'і не меў звычкі быць частым наведвальнікам ламбардаў, акрамя майго стрыечнага брата Эдварда, а ён быў гусарам). І падчас гэтага невыноснага абеду — цяпер, калі я гэта ўзгадваю, мне яшчэ больш непрыемна — вашыя паводзіны і размовы выклікалі нядобразычлівую ўвагу ўсіх прысутных. Я быў прылюдна асаромлены. Я ніколі больш не змагу паказацца ў той рэстарацыі. Вы напалі на паліцыю. Вы скралі...

— Ды супакойцеся вы ўжо,— сказаў вознік.— Зараз трэба глядзець і слухаць, а не балбатаць.

Навокал дакладна было на што паглядзець і што паслухаць. Дрэва, якое бачыў Дыгары, цяпер стала вялікім разложыстым букам. На прахалоднай зялёнай траве, дзе яны стаялі, рассыпаліся рамонкі і люцікі. Непадалёк, уздоўж рачнога берагу, раслі вербы. З іншага боку іх шчыльна абступалі кусты бэзу, чырвонай парэчкі і шыпшыны. Конь шчыпаў смачную маладую траву.

Увесь гэты час Леў працягваў спяваць і велічна хадзіць узад-уперад. З кожным паваротам ён крыху набліжаўся. Полі ўсё больш і больш захаплялася спевам,

бо пачала разумець сувязь паміж музыкай і тым, што дзеецца навокал.

Калі на гары прыкладна ў ста метрах ад іх выпрастаўся шэраг цёмных елак, яна адчула, што іх выклікалі да жыцця глыбокія, доўгія ноты, якія за секунду да гэтага праспяваў Леў. А калі ён паслядоўна ўзяў некалькі вышэйшых нот, яна не здзівілася, пабачыўшы, як паўсюль з'явіліся першацветы. У невымоўным захапленні яна была амаль упэўненая, што ўсё з'яўлялася (як яна сказала) "з галавы Льва". У яго спеве можна было пачуць рэчы, якія ён выдумляў. Азірнуўшыся навокал, іх можна было пабачыць. Гэта так узрушыла Полі, што ў яе не было часу палохацца. Але Дыгары і вознік адчувалі сябе крыху неспакойна, бо, шпацыруючы ўзад-уперад, Леў пакрысе падыходзіў. Што да дзядзькі Эндру, ён ляскаў зубамі, але калені ў яго так дрыжалі, што ён не мог уцячы.

Раптам Вядзьмарка рушыла насустрач Ільву. Не спыняючы спеў, ён набліжаўся павольнай цяжкой хадой. Ён быў усяго ў дзесяці метрах. Яна падняла руку і шпурнула жалезны прут у яго галаву.

Ніхто, і асабліва Джадзіс, не мог бы прамахнуцца з такой адлегласці. Прут ударыў Ільва наўпрост паміж вачэй і з глухім гукам упаў на зямлю. Леў набліжаўся. Яго хада не стала ані хутчэйшай, ані павальнейшай; нельга было сказаць, ці ён заўважыў, што яго нешта



ўдарыла. Хаця яго мяккія лапы ступалі бязгучна, можна было адчуць, як зямля дрыжыць пад яго вагой.

Вядзьмарка завішчала і пабегла; праз некалькі імгненняў яна знікла за дрэвамі. Дзядзька Эндру павярнуўся, каб зрабіць тое ж, спатыкнуўся аб корань і зваліўся тварам уніз у маленькі ручай, што збягаў да ракі. Дзеці не маглі варухнуцца. Яны нават не былі ўпэўненыя, ці хацелі яны варушыцца. Леў не звярнуў на іх увагі. Яго вялікая чырвоная пашча была адкрытая, але ён спяваў, а не рыкаў. Ён прайшоў так блізка каля іх, што яны маглі б дакрануцца да яго грывы. Дзеці вельмі баяліся, што ён паверне галаву і паглядзіць

на іх. І ў той жа час ім чамусьці вельмі хацелася, каб ён так і зрабіў. Але ён не звярнуў на іх увагі, нібыта яны былі нябачныя і не мелі паху. Мінуўшы іх і прайшоўшы некалькі крокаў далей, ён павярнуўся, абмінуў іх яшчэ раз і працягнуў свой шлях на ўсход.

З ручая, перхаючы, падняўся дзядзька Эндру.

— Слухай, Дыгары,— сказаў ён.— Цяпер мы пазбавіліся гэтай жанчыны і гэты страшэнны леў сышоў. Бярыся за мяне і надзявай пярсцёнак.

— Адыдзіце,— вымавіў Дыгары, адступаючы ад яго.— Трымайся далей ад яго, Полі. Хадзі сюды, стань побач са мной. Цяпер слухайце, дзядзька Эндру, я вас папярэджваю: не падыходзьце нават на крок бліжэй, ці мы проста знікнем.

— Рабі, што табе было сказана! — загадаў дзядзька Эндру.— Ты проста неверагодна непаслухмяны і кепска выхаваны маленькі хлопчык.

— Не,— адказаў Дыгары.— Мы застанемся і паглядзім, што будзе. Я думаў, вы хочаце даведацца пра іншыя сусветы. Ці вам тут не падабаецца?

— Падабаецца? — усклікнуў дзядзька Эндру.— Зірні толькі, у якім я выглядзе! Гэта быў мой лепшы фрак і лепшая камізэлька!

Зараз ён сапраўды ўяўляў сабою нікчэмнае відовішча — бо, зразумела, чым больш святочна вы апранутыя першапачаткова, тым горш выглядаеце

пасля таго, як выберацеся з раструшчанай фурманкі і ўваліцеся ў брудны ручай.

— Я не кажу,— дадаў дзядзька Эндру,— што гэта нецікавае месца. Калі б я быў маладзейшы, то... напэўна, спярша варта было б даставіць сюды якогась спрытнага паляўнічага. З гэтай краіны, можа, нешта і атрымаецца. Клімат тут цудоўны. Ніколі не дыхаў такім паветрам. Думаю, яно пайшло б мне на карысць, калі б... калі б абставіны былі больш спрыяльныя. Калі б у нас была стрэльба.

— Ды кіньце вы гэныя размовы пра стрэльбу,— сказаў вознік.— Пайду я лепш пагляджу, ці не расцерці мне Агрэста. Гэны конь мае больш розуму, чымся некаторыя людзі, я б сказаў.

Ён пайшоў назад да Агрэста, і адтуль пачуўся шоргат, які бывае, калі конюхі расціраюць коней.

— Вы ўсё яшчэ думаеце, што гэтага Льва можна застрэліць? — запытаўся Дыгары.— Ён не асабліва звярнуў увагу на жалезны прут.

— Пры ўсіх яе недахопах,— сказаў дзядзька Эндру,— яна смелая дзічынка, мой хлопчык. Гэта быў мужны ўчынак.

Ён пацёр рукі і шчоўкнуў костачкамі, нібыта ўжо забыўся, як баяўся Вядзьмаркі.

— Гэта быў агідны ўчынак,— зазначыла Полі.— Што кепскага Леў ёй зрабіў?

— Вой, што гэта? — здзівіўся Дыгары. Ён кінуўся наперад, каб разгледзець нешта ўсяго толькі ў некалькіх кроках ад яго.

— Ого, Полі,— паклікаў ён.— Табе варта падысці і паглядзець.

Дзядзька Эндру падышоў разам з ёю. Не таму, што хацеў паглядзець, а таму што хацеў быць бліжэй да дзяцей, бо раптам будзе шанец скрасці іх пярсцёнкі. Але калі ён пабачыў, што разглядаў Дыгары, нават яму стала цікава. Гэта была дакладная маленькая копія ліхтара, каля метра вышынёй, якая выцягвалася і павялічвалася, пакуль яны глядзелі на яе. Насамрэч, яна расла дакладна гэтаксама, як і дрэвы выраслі навокал.

— Ён таксама жывы... у сэнсе, ён гарыць,— сказаў Дыгары.

І гэта сапраўды было так. Хаця, натуральна, маленькі агеньчык унутры ліхтара было цяжка разгледзець пры сонечным святле, але ён быў заўважны, калі на яго падаў цень.

— Неверагодна, проста неверагодна,— прамармытаў дзядзька Эндру.— Нават я ніколі не марыў пра такую магію. Мы ў такім свеце, дзе ўсё, нават ліхтар, ажывае і расце. Цікава, з якога зерня растуць ліхтары?

— Вы не разумееце? — запытаўся Дыгары.— Тут упаў прут, які яна адарвала ад ліхтара. Ён утыркнуўся

ў зямлю, і цяпер з яго расце маленькі ліхтар. (Ліхтар, аднак, быў ужо не такі і маленькі; калі Дыгары гэта казаў, той ужо быў ростам з яго.)

— Дакладна! Цудоўна, цудоўна,— сказаў дзядзька Эндру, пацiраючы рукі яшчэ мацней.— Хо-хо! Яны смяяліся з майго чараўніцтва. Мая дурная сястрыца думае, што я вар'ят. Цікава, што яны цяпер скажуць? Я знайшоў свет, у якім усё поўніцца жыццём і расце. Яны там захапляюцца Калумбам! Але што такое Амерыка ў параўнанні з гэтым? Камерцыйны патэнцыял гэтай краіны бязмежны. Трэба толькі даставіць сюды старыя кавалкі жалезнага лому, закапаць — і з іх вырастуць новенькія рухавікі для цягнікоў, баявыя караблі, усё, што пажадаеце. Яны не будуць каштаваць мне нічога, а я змагу прадаваць іх у Англіі. Я зраблюся мільярдэрам. А яшчэ ж клімат! Я пачуваюся на шмат год маладзейшым. Трэба будзе адчыніць тут курорт. Добры санаторый можа прыносіць шалёныя грошы. Вядома, мне давядзецца адкрыць сакрэт некаторым людзям. Але перш-наперш трэба застрэліць гэтага монстра.

— Вы такі ж самы, як і Вядзьмарка,— мовіла Полі.— Вы толькі і можаце думаць, што пра забойства.

— А што тычыцца мяне,— працягнуў шчаслівыя мары дзядзька Эндру,— хто ведае, колькі я пражыву, калі пасялюся тут. А гэта вельмі істотнае пытанне, калі вам ужо пераваліла за шэсцьдзесят. Я не здзіўлюся,

калі тут я ні на дзень не пастарэю! Неверагодна! Край вечнай маладосці!

— Вох! — усклікнуў Дыгары.— Край маладосці! Вы сапраўды думаеце, што гэта ён?

Бо Дыгары ўзгадаў словы, якія цётка Лэці казала той жанчыне, што прыносіла вінаград. І надзея зноў напоўніла яго.

— Дзядзька Эндру,— сказаў ён.— Як вы думаеце, ці ёсць тут што-небудзь, што магло б ацаліць маці?

— Што ты маеш на ўвазе? — буркнуў дзядзька Эндру.— Гэта табе не аптэка. Але, як я казаў…

— Вам на яе напляваць,— раз'юшана вымавіў Дыгары.— Я думаў, вас хоць крыху гэта турбуе. Яна ж не толькі мая маці, але і вашая сястра, урэшце. Ну, неістотна. Я запытаюся ў самога Льва, ці зможа ён мне дапамагчы.

Ён павярнуўся і хутка пайшоў прэч. Полі пачакала імгненне і пайшла за ім.

— Гэй! Стаяць! Вярніцеся! Гэты хлопец страціў розум,— сказаў дзядзька Эндру.

Ён пайшоў за дзецьмі на бяспечнай адлегласці, бо не хацеў ані занадта аддаліцца ад зялёных пярсцёнкаў, ані занадта наблізіцца да Льва.

Праз некалькі хвілін Дыгары выйшаў на край лесу і спыніўся. Леў усё яшчэ спяваў. Але спеў ізноў памяняўся. Цяпер ён абуджаў жаданне бегаць, скакаць

і караскацца. Хацелася крычаць, падбег-чы да іншых людзей і ці абняць іх, ці пабіцца з імі. Ад яго Дыгары стала горача, і ён пачырванеў. Спеў меў нейкае ўздзеянне і на дзядзьку Эндру, бо Дыгары пачуў, як той сказаў: "Адважная дзічынка. Шкада, што ў яе такі характар, але яна ўсё адно шалёна прыгожая жанчына, шалёна прыгожая".

Але ўздзеянне спеву на двух людзей не магло і параўнацца з тым, як ён дзейнічаў на краіну.

Ці можаце вы ўявіць парослы травой кавалак зямлі, які булькоча, як вада ў рондалі? Бо гэта сапраўды найлепш апісвае тое, што адбывалася. З



усіх бакоў зямля выбухала купінамі. Яны былі разнастайных памераў, некаторыя не большыя за горку, якая застаецца ад крата, некаторыя памерам з бочку, а дзве нагадвалі невялікія дамы. Купіны варушыліся і раслі, а затым пачалі лопацца, і ва ўсе бакі паляцелі груды зямлі. З кожнай такой купіны з'явілася па жывёле. Краты вылезлі так, як і ў Англіі. Потым узніклі сабакі, якія забрахалі, як толькі іх галовы вызваліліся. Яны варушыліся, як звычайна варушацца сабакі, калі лезуць праз вузкую дзірку ў плоце.



Цікавей за ўсё было глядзець на аленяў, бо рогі было відаць раней за іх саміх, таму спачатку Дыгары падумаў, што гэта дрэвы. Жабы, якія ўзніклі побач



з ракой, паскакалі ў ваду з шлёпаннем і гучным кваканнем. Пантэры, леапарды і падобныя да іх адразу ж уселіся вылізваць камякі зямлі з задніх лап і пасля сталі перад дрэвамі, абапершыся на іх, каб навастрыць кіпцюры на пярэдніх лапах. Незлічоныя птушкі зашчабяталі ў дрэвах. Лёталі матылькі. Пчолы пачалі працаваць над кветкамі, нібыта нельга было губляць і секунды. Але самае цікавае адбылося, калі разваліласся найвялікшая купіна: з яе паказалася спачатку пахілая спіна, потым вялікая мудрая галава, і ўрэшце — зморшчаныя ногі слана. Цяпер спеў Ільва быў ледзь чутны: так шмат было каркання, буркавання, кукарэкання, гікання, іржання, брахання, рыкання, бляяння і трубных гукаў сланоў.

І хаця Дыгары больш не мог чуць Ільва, ён яго бачыў. Леў быў такім вялікім і такім заўважным, што



хлопец не мог адарваць ад яго вачэй. Іншыя звяры зусім не баяліся яго. Акурат у гэты самы момант Дыгары пачуў за сабой грукат капытоў, а праз секунду стары конь возніка рыссю прабег зусім побач і далучыўся да іншых жывёлаў. (Паветра відавочна ішло каню на карысць, як і дзядзьку Эндру. Конь больш не выглядаў як бедны стары нявольнік, якім быў у Лондане. Ён ускідваў ногі і высока трымаў галаву.)

І цяпер упершыню Леў змоўк. Ён хадзіў туды-сюды паміж жывёл. Раз-пораз ён падыходзіў да нейкай пары (заўсёды да адной пары за раз) і дакранаўся сваім носам да іх насоў. Ён дакрануўся да двух баброў сярод усіх баброў, да двух леапардаў сярод усіх леапардаў, да аленя і аленіхі сярод усіх аленяў і пакінуў астатніх. Некаторыя віды жывёл ён цалкам прапускаў. Але тыя пары, да якіх ён дакрануўся, імгненна аддзяліліся ад

сваіх суродзічаў і пайшлі за ім. Нарэшце ён спыніўся, і ўсе стварэнні, да якіх ён дакрануўся, прыйшлі і сталі наўкол яго. Іншыя, да якіх ён не дакранаўся, пачалі разыходзіцца. Іх галасы паступова сціхлі ў далечыні. Абраныя звяры, што засталіся, цяпер цалкам суцішыліся. Яны ўсе пільна ўглядаліся ў Ільва. Коткі зрэдку ўзмахвалі хвастамі, але акрамя гэтага ніхто не варушыўся. Упершыню за ўвесь дзень настала поўная цішыня, толькі шумела вада. Сэрца Дыгары шалёна калацілася; ён разумеў, што павінна адбыцца штосьці вельмі ўрачыстае. Ён не забыўся на маці, але выдатна ведаў, што нават дзеля яе не змог бы ўмяшацца ў такое.

Леў, які ні разу не міргнуў, углядаўся ў жывёл так пільна, нібыта збіраўся спаліць іх адным толькі позіркам. І паступова яны сталі змяняцца. Найменшыя — зайцы, краты, і падобныя да іх — вельмі моцна выраслі. Агромністыя жывёлы — асабліва гэта было заўважна са сланамі — крыху паменшалі. Шмат жывёлаў паднялося на заднія ногі. Большасць з іх нахіліла галовы на адзін бок, нібыта яны вельмі намагаліся нешта зразумець. Леў адкрыў пашчу, але з яе не вылецела ані гуку; ён выдыхаў — гэта быў доўгі цёплы выдых. Яго подых ускалыхнуў жывёлаў, як вецер калыша дрэвы.

Высока над іх галовамі, за покрывам блакітных нябёсаў, ізноў заспявалі нябачныя цяпер зоркі: чысты,



халодны, складаны спеў. Потым з'явіўся хуткі выбліск нібыта агню (але ён нікога не апаліў), ці з неба, ці ад самога Льва, кожная кропля крыві ў целах дзяцей задрыжала, і самы глыбокі і дзівосны голас з усіх, якія яны калі-небудзь чулі, прамовіў:

— Нарнія, Нарнія, Нарнія, прачніся! Любі. Думай. Размаўляй. Хай ходзяць дрэвы. Хай гавораць жывёлы. Хай будуць жывымі твае воды.

## Раздзел 10

# Першы жарт ды іншыя рэчы

Гэта быў, вядома ж, голас Ільва. Дзеці даўно былі ўпэўненыя, што ён можа размаўляць, і тым не менш моцна здзівіліся, калі ён загаварыў.

З-за дрэваў выступілі лесуны і лясныя феі, з імі прыйшлі фаўны, сатыры і гномы. З ракі падняліся вадзяныя німфы — наяды. І ўсе яны, і звяры, і птушкі рознымі галасамі — нізкімі, высокімі, глухімі і звонкімі — адказалі:

— Вітаем, Аслан! Мы чуем і слухаемся. Мы прачнуліся. Мы любім. Мы размаўляем. Мы ведаем.

— Але пакуль мы зусім мала ведаем,— вымавіў цікаўны, з пахрапваннем голас. І тут дзеці сапраўды падскочылі, бо гэта загаварыў конь возніка.

— Добры стары Агрэст,— сказала Полі.— Я рада, што ён абраны стаць Гаваркой Істотай.

І возьнік, які цяпер стаяў побач з дзецьмі, прызнаўся:



— Каб мне праваліцца. Я заўсёды ведаў, што гэты конь вельмі разумны.

— Стварэнні, вы належыце самі сабе,— зноў загучаў моцны, шчаслівы голас Аслана.— Я навечна аддаю вам гэтую зямлю — Нарнію. Аддаю вам лясы, пладовыя дрэвы, рэкі. Даю вам зоры, і даю вам сябе. Нямыя Істоты, якіх я не абраў, таксама вашыя. Абыходзьцеся з імі ласкава і клапаціцеся пра іх, але не рабіце, як яны, каб вам не перастаць быць Гаваркімі Істотамі. Бо вы былі абраныя з іх і можаце вярнуцца да іх. Не рабіце так.

— Не, Аслан, мы не будзем! Мы не будзем! — загаманілі ўсе.

І адна жвавая Галка дадала гучным голасам: “Не хвалюйся!” — а ўсе астатнія змоўклі якраз перад тым, як яна сказала гэта, таму яе словы прагучалі вельмі звонка ў поўнай цішыні. Магчыма, вы ведаеце, наколькі гэта бывае няёмка, скажам, на вечарыне. Галка так разгубілася, што схавала галаву пад крыло, нібыта збіралася спаць. А ўсе астатнія жывёлы пачалі выдаваць разнастайныя дзіўныя гукі, якія былі іх смехам і якія, вядома, ніхто ніколі не чуў у нашым свеце. Спачатку яны спрабавалі гэтыя гукі схаваць, але Аслан абвясціў:

— Смейцеся і не бойцеся, стварэнні! Цяпер, калі вы ўжо разумныя, няма патрэбы заўсёды быць сур’ёзнымі. Бо жарты, як і справядлівасць, з’яўляюцца разам з уменнем гаварыць.

Таму яны ўсе разняволіліся і пачалі смяяцца. І стала так весела, што нават Галка ізноў пасмялела, уселася на галаве каня, паміж яго вушамі, і, лопаючы крыламі, сказала:

— Аслан! Аслан! Гэта ў мяне атрымаўся першы жарт? І ўсім заўсёды будуць распавядаць, як у мяне атрымаўся першы жарт?

— Не, маленькае стварэнне,— адказаў Леў.— Гэта не ў цябе атрымаўся першы жарт, ты сама — першы жарт.

Тут усе рассмяяліся яшчэ больш. Але Галка не была супраць і смяялася гэтак жа гучна, пакуль конь не патрос галавой. Яна страціла раўнавагу і звалілася, але ўзгадала пра свае крылы (яны ўсё яшчэ былі новымі для яе), перш чым даляцела да зямлі.

— Нарнія заснаваная,— сказаў Аслан.— І мы мусім падумаць, як зрабіць яе бяспечнай. Я збяру некаторых з вас на маю Раду. Падыдзіце да мяне: ты, галоўны Гном, ты, Вадзянік, ты, Дуб, ты, Сава, абодва Крумкачы і Слон. Нам трэба паразмаўляць. Гэтаму свету



яшчэ няма і пяці гадзінаў, аднак жа зло паспела ўжо з'явіцца ў ім.

Тыя стварэнні, якіх ён назваў, выступілі наперад і пайшлі з ім на ўсход. Астатнія пачалі размаўляць, кажучы рэчы кшталту: "Што, ён сказаў, з'явілася ў свеце? — Ён сказаў: "Аднак Жазло з'явілася".— А што такое Жазло? — Не, ён сказаў не "Жазло", а "аднак жа Слон".

— Слухай,— Дыгары павярнуўся да Полі.— Я мушу пайсці за ім, за Асланам. У сэнсе, за Львом. Мне трэба паразмаўляць з ім.

— Думаеш, нам можна з ім размаўляць? Я б не наважылася.

— Я мушу пайсці,— сказаў Дыгары.— Гэта дзеля маці. Калі нехта і можа даць мне тое, што б ёй дапамагло, дык гэта ён.

— Я пайду з табой,— мовіў вознік.— Мне ён падабаецца. І я не думаю, што іншыя жывёлы нападуць на нас. І я хачу паразмаўляць са сваім старым сябрам Агрэстам.

Такім чынам яны ўтрох — настолькі смела, наколькі маглі — рушылі да групы жывёлаў. Стварэнні былі так занятыя размовамі адно з адным і пачаткам сяброўства, што не заўважылі трох людзей, пакуль тыя не падышлі вельмі блізка; таксама яны не чулі дзядзьку Эндру, які стаяў даволі далёка ад іх і крычаў (але не надта гучна):

— Дыгары! Вярніся! Вярніся зараз жа, табе кажуць! Я забараняю табе ісці далей нават на крок!

Калі яны нарэшце апынуліся сярод жывёлаў, тыя перасталі размаўляць і ўтаропіліся ў іх.

— Ну? — вымавіў нарэшце Бабёр.— Хто, у імя Аслана, гэта такія?

— Калі ласка,— пачаў Дыгары даволі-такі слабым голасам, калі Трус сказаў:

— Я мяркую, што яны — проста вялікая капуста.

— Не, мы не капуста, праўда,— хутка прамовіла Полі.— Мы зусім не надаемся на ежу.

— Ого! — сказаў Крот.— Яны могуць размаўляць. Ці бывае капуста, якая ўмее размаўляць?

— Магчыма, яны — Другі Жарт,— выказалася Галка.

Пантэра, якая ўмывалася, спынілася на імгненне, каб сказаць:

— Ну, калі яны — Другі Жарт, ён нават і блізка не такі добры, як першы. Прынамсі, я не бачу ў іх нічога вельмі смешнага.

Яна пазяхнула і працягнула ўмыванне.

— Калі ласка,— папрасіў Дыгары.— Я так спяшаюся. Я хачу пабачыць Ільва.

Увесь гэты час вознік спрабаваў злавіць позірк Агрэста. Нарэшце ў яго атрымалася.

— Агрэст, сябра,— сказаў ён.— Ты ж мяне ведаеш.

Ты ж не будзеш стаяць і рабіць выгляд, што гэта не так.

— Конь, што кажа гэтая Штука? — запыталася некалькі галасоў.

— Ну,— мовіў Агрэст вельмі павольна.— Я дакладна не ведаю. Мяркую, большасць з нас пакуль шмат чаго не ведае. Але мне здаецца, я бачыў падобных істотаў раней. У мяне такое адчуванне, што я жыў у нейкім іншым месцы — ці быў якімсьці іншым — перад тым, як Аслан абудзіў усіх нас некалькі хвілін таму. Усё вельмі зблытана, нібы сон. Але ў гэтым сне былі такія Штукі, як гэтыя тры.

— Што? — сказаў вознік.— Не ведаеш мяне? Мяне, які прыносіў табе гарачую кашу ў тыя вечары, калі ты хварэў? Мяне, які дасуха цябе расціраў? Мяне, які ніколі не забываўся накрываць цябе гунькай, калі ты стаяў на холадзе? Я ад цябе такога не чакаў, Агрэст.

— Я сапраўды пачынаю ўзгадваць,— задуменна прагаварыў Конь.— Так. Дайце падумаць, дайце падумаць. Так, ты прывязваў ззаду мяне жудасную чорную рэч, а потым хвастаў мяне, каб прымусіць бегчы, і няважна, як далёка я бег, тая чорная рэч заўсёды з грукатам праследавала мяне.

— Нам трэба было зарабляць на жыццё, разумееш,— сказаў вознік.— І на тваё, і на маё. І калі б не было працы і пугі, не было б ні стайні, ні сена, ні

кашы, ні аўса. А ты заўсёды меў авёс, калі ў мяне былі на яго грошы.

— Авёс? — вымавіў Конь, застрыгшы вушамі.— Так, я нешта памятаю. Так, я ўзгадваю больш і больш. Ты сядзеў недзе ззаду, а я бег наперадзе, цягнуў цябе і тую чорную штуку. Я рабіў усю працу.

— Улетку так,— адказаў возьнік.— Гарачая праца для цябе і прахалоднае месца для мяне. А ўзімку, дружа? Табе было цёпла, а я сядзеў там наверсе з нагамі, замёрзлымі як лёд, і мой нос амаль адвальваўся ад ветру, а рукі так нямелі, што я ледзь трымаў лейцы!

— Гэта была жорсткая краіна, там было цяжка,— уздыхнуў Агрэст.— Там не было травы. Толькі цвёрдыя камяні.

— Дакладна, сябра, дакладна! — сказаў возьнік.— То быў суворы свет. Я заўсёды казаў, што гэная брукаванка кепская для любога каня. І гэны горад — там такая цяснота! І смурод — не прадыхнуць... Я не люблю горад гэтак жа, як і ты. Ты не гарадскі конь, а я — не гарадскі чалавек. Раней я спяваў у хоры, ага, дома, у вёсцы. Але там для мяне не было працы.

— Калі ласка, калі ласка,— папрасіў Дыгары.— Дазвольце нам прайсці. Леў адыходзіць усё далей і далей. А я вельмі хачу паразмаўляць з ім, гэта проста неабходна.

— Слухай, Агрэст,— сказаў вознік.— Хлопец хоча пра нешта паразмаўляць з Ільвом; вы клічаце яго Асланам. Можа, ты дазволіш яму праехаць на табе (за што ён будзе вельмі ўдзячны) і давязеш да Льва? А мы з маленькай дзяўчынкай пойдзем за вамі.

— Праехаць? — перапытаў Агрэст.— О, цяпер я ўзгадаў. Гэта азначае, што нехта сядзіць на маёй спіне. Я памятаю, што нейкі маленькі двухногі, як вы, даўным-даўно так рабіў. У яго былі цвёрдыя, квадратныя кавалкі нечага белага, якія ён мне даваў. Па смаку яны былі — о, цудоўныя, саладзейшыя за траву.

— А, гэта быў цукар,— сказаў вознік.

— Калі ласка, Агрэст,— маліў Дыгары.— Вельмі прашу цябе, адвязі мяне да Аслана.

— Ну, я не супраць,— сказаў Конь.— Прынамсі, адзін раз можна. Забірайся.

— Добры стары Агрэст,— мовіў вознік.— Хадзі сюды, хлопча, я цябе падсаджу.

Неўзабаве Дыгары сядзеў на спіне Каня, і яму было даволі зручна, бо раней ён ездзіў без сядла на ўласным поні.

— А цяпер пайшоў, Агрэст,— сказаў ён.

— У цябе выпадкова няма кавалачка той белай штукі, а? — запытаўся Конь.

— Не, на жаль, няма,— адказаў Дыгары.

— Ну, нічога не паробіш,— сказаў Агрэст, і яны выправіліся.

У гэты момант вялікі Бульдог, які вельмі напружана прынюхваўся і прыглядаўся, прагаварыў:

— Глядзіце, здаецца, там, каля ракі, пад дрэвамі, яшчэ адно з гэтых дзіўных стварэнняў.

Усе жывёлы паглядзелі туды і пабачылі дзядзьку Эндру, які сцішана стаяў сярод рададэндранаў і спадзяваўся, што яго не заўважаць.

— Хадзем! — сказала некалькі галасоў.— Давайце пойдзем даведаемся, хто гэта.

Такім чынам, пакуль Агрэст з Дыгары на спіне жвава рысіў у адным кірунку (а Полі і возьнік ішлі за імі пехам), большасць жывёлаў з ровам, брахаННем, рохканнем і разнастайнымі гукамі, якія выказвалі вясёлую цікаўнасць, паспяшалася да дзядзькі Эндру.

Цяпер я мушу крыху вярнуцца назад і патлумачыць, як уся гэтая сцэна выглядала з гледзішча дзядзькі Эндру. Яна зрабіла на яго зусім іншае ўражанне, чым на возніка і дзяцей. Бо тое, што ты бачыш і чуеш, шмат у чым залежыць ад таго, якія ў цябе перакананні, а таксама ад таго, што ты за чалавек.

З таго самага моманту, як з’явіліся жывёлы, дзядзька Эндру ўсё больш і больш адступаў у кустоўе. Вядома, ён вельмі ўважліва назіраў за імі, але яго не надта

цікавіла, што яны робяць, затое цікавіла, ці збіраюцца яны на яго накінуцца.

Як і Вядзьмарка, ён быў да агіды практычны. Ён не заўважыў, што Аслан выбіраў па адной пары з кожнага віду жывёл. Усё, што ён бачыў,— гэта мноства небяспечных дзікіх звяроў, якія бадзяюцца навокал. І ён здзіўляўся, чаму іншыя жывёлы не ўцякаюць ад агромністага Льва.

Калі настаў вялікі момант і Звяры загаварылі, ён усё прапусціў з даволі цікавай прычыны. Калі Леў толькі пачаў спяваць, даўным-даўно, калі было яшчэ цёмна, дзядзька Эндру зразумеў, што гэта спеў. І ён яму вельмі не спадабаўся. Спеў прымусіў яго думаць пра некаторыя рэчы, пра якія ён не хацеў думаць, і адчуваць нешта, чаго ён не хацеў адчуваць. Потым, калі ўзышло сонца і дзядзька Эндру ўбачыў, што гэта спявае леў ("проста леў", як ён сказаў сам сабе), ён з усяе моцы паспрабаваў прымусіць сябе паверыць, што той не спявае — і ніколі не спяваў, а толькі рыкаў, як любы леў у заапарку ў нашым свеце.

"Вядома ж, ён не можа сапраўды спяваць,— думаў ён.— Мне гэта, пэўна, падалося. Я дазволіў нервам расхістацца. Ці хто калі-небудзь чуў, каб леў спяваў?"

І чым даўжэй і прыгажэй Леў спяваў, тым больш намаганняў прыкладаў дзядзька Эндру, каб прымусіць

сябе паверыць, што ён чуе рыканне, і нічога больш. Праблема ў тым, што, калі ты спрабуеш быць менш разумным, чым ты ёсць, гэта вельмі часта атрымліваецца. У дзядзькі Эндру атрымалася. Хутка ён не чуў у спеве Аслана нічога, акрамя рыкання. Праз нейкі час ён не змог бы пачуць нічога іншага, нават калі б пажадаў. І калі нарэшце Леў загаварыў і мовіў: "Нарнія, прачніся",— ён пачуў не словы, а толькі рык. І калі Звяры загаварылі ў адказ, ён пачуў браханне, рохканне і выццё. А калі яны засмяяліся — ну, вы можаце ўявіць. Для дзядзькі Эндру гэта было горшым за ўсё, што адбылося да гэтага моманту. Такога жудаснага крыважэрнага шуму галодных і злых звяроў ён не чуў ніколі ў жыцці. Потым, у дадатак да свайго страху ды злосці, ён пабачыў, як трое іншых людзей пайшлі жывёлам насустрач.

"Дурні! — сказаў ён сам сабе.— Цяпер гэтыя монстры з'ядуць пярсцёнкі разам з дзецьмі, і я ніколі не змагу зноў трапіць дамоў. Што за эгаіст гэты Дыгары! І іншыя не лепей. Калі яны хочуць згубіць свае жыцці, гэта іх справа. Але як наконт мяне? Не падобна, каб яны пра гэта думалі. Ніхто ніколі не думае пра мяне".

Нарэшце, калі ўся грамада жывёл пабегла да яго, ён павярнуўся і панёсся прэч, ратуючы сваё жыццё. І цяпер было дакладна зразумела, што паветра гэтага



маладога свету сапраўды пайшло на карысць старому джэнтльмену. У Лондане ён быў занадта стары, каб бегаць; цяпер ён нёсся з хуткасцю, якой было б дастаткова, каб перамагчы ў стометровым забегу ў любой сярэдняй школе. Хвасты фрака, што матляліся ў яго за спінай, стваралі файнае відовішча. Але, вядома ж, уцёкі не мелі шанцу на поспех. Многія з жывёлаў, што беглі за ім, былі вельмі хуткімі; гэта быў першы бег у іх жыцці, і яны ўсе прагнулі выпрабаваць свае новыя мускулы.

— За ім! За ім! — крычалі яны.— Магчыма, ён і ёсць тое самае Жазло! Хапайце яго! Ва ўсе ногі! Адрэжце яму шлях! Атачайце яго! Так трымаць! Ура!

Праз некалькі хвілін некаторыя з іх ужо апынуліся наперадзе яго. Яны пашыхтаваліся і перагарадзілі яму дарогу. Іншыя атачылі яго ззаду. Ён бачыў

пагрозу, куды б ні паглядзеў. Над ім вежамі ўзносіліся рогі велізарных Ласёў і вялікая галава Слана. Цяжкія, сур'ёзныя Мядзведзі і Дзікі бурчалі ў яго за спінай. Вонкава спакойныя Леапарды і Пантэры з саркастычным (як яму здавалася) выглядам узіраліся ў яго і матлялі хвастамі. Больш за ўсё яго ўразіла колькасць разяўленых пашчаў. Насамрэч жывёлы адкрылі пашчы, каб аддыхацца; ён падумаў, што яны збіраюцца яго з'есці.

Дзядзька Эндру стаяў, дрыжучы і хістаючыся то ў адзін, то ў другі бок. Ён ніколі, нават у лепшыя часы, не любіў жывёл, бо баяўся іх. І, вядома ж, пасля стольkіх год жорсткіх эксперыментаў над жывёламі ён стаў ненавідзець і баяцца іх яшчэ больш.



— А цяпер, сэр,— сказаў Бульдог дзелавітым голасам,— адказвайце: вы жывёла, гародніна альбо мінерал?

Вось што ён насамрэч сказаў, але дзядзька Эндру пачуў толькі: "Гр-р-раррх-аў!"

## Раздзел 11

# У Дыгары і яго дзядзькі непрыемнасці

Вы можаце падумаць, што жывёлы былі не надта разумныя, бо не адразу зразумелі, што дзядзька Эндру — істота такога ж кшталту, як і двое дзяцей ды вознік. Але вы мусіце памятаць, што жывёлы нічога не ведалі пра адзенне. Яны думалі, што сукенка Полі, строй Дыгары і кацялок возніка — такія ж самыя іх часткі, як для звяроў поўсць альбо пер'е. Жывёлы нават не здагадаліся б, што тыя трое былі аднаго віду, калі б такога меркавання не быў Агрэст і калі б тыя не загаварылі да іх. Дзядзька Эндру быў значна вышэйшы за дзяцей і значна худзейшы за возніка. Ён быў увесь у чорным, акрамя белай камізэлькі (ужо не вельмі белай), і вялікая сівая капа ягоных валасоў зусім не была падобная да таго, што яны бачылі ў трох іншых людзей. Таму, натуральна, яны вельмі

збянтэжыліся. Горш за ўсё было тое, што ён відавочна не ўмеў размаўляць.

Хаця дзядзька Эндру намагаўся нешта сказаць. Калі Бульдог звярнуўся да яго (ці, як здалося дзядзьку Эндру,— спачатку ашчэрыўся, а пасля зарыкаў), ён выцягнуў дрыжачыя рукі і, задыхаючыся, прамямліў: “Добры сабачка, добры”. Але звяры разумелі яго не больш, чым ён разумеў іх. Яны не чулі ніякіх словаў — толькі дзіўнае шыпенне. Магчыма, гэта было й да лепшага, бо ніводзін сабака з тых, якіх я ведаю,— і Гаваркі Сабака Нарніі тым больш,— не любіць, калі яго называюць “добры сабачка”. Гэта ўсё роўна, як бы, напрыклад, вас назвалі “мой малыш”.

І тут дзядзька Эндру паваліўся непрытомны.



— Ну вось! — сказаў Дзік.— Гэта проста дрэва. Я заўсёды так думаў. (Памятайце, што звяры яшчэ не бачылі, як нехта падае ў непрытомнасці.)

Бульдог, абнюхаўшы ўсяго дзядзьку Эндру, падняў галаву і выказаўся:

— Гэта жывёла. Дакладна жывёла. І напэўна аднаго віду з тымі іншымі.

— Мне так не здаецца,— сказаў адзін з Мядзведзяў.— Жывёлы так не падаюць. Мы — жывёлы, і мы не падаем. Мы стаім. Вось так.

Ён падняўся на заднія ногі, зрабіў крок назад, спатыкнуўся аб нізкую галінку і зваліўся на спіну.

— Трэці Жарт, Трэці Жарт, Трэці Жарт! — захоплена закрычала Галка.

— Я ўсё адно думаю, што гэта штосьці накшталт дрэва,— сказаў Дзік.

— Калі гэта дрэва,— запярэчыў Мядзведзь,— на ім мае быць пчалінае гняздо.

— Я ўпэўнены, што гэта не дрэва,— сказаў Барсук.— Мне здалося, яно спрабавала размаўляць, перш чым перакулілася.

— Гэта быў вецер у яго галінах,— адказаў Дзік.

— Ты ж не думаеш,— сказала Галка Барсуку,— што гэта Гаваркая Істота? Яно не сказала ні слова.

— І ўсё ж, вы ведаеце,— прамовіла Сланіха (яе мужа, як вы памятаеце, Аслан паклікаў за сабой),—

гэта можа быць нейкая жывёла. Магчыма, белаватая шышка на гэтым канцы — гэта твар? І, можа, гэтыя дзіркі — рот і вочы? Носа, вядома, у яго няма. Але... гмм... не буду дачэпліваццa. Сярод нас вельмі мала хто мае сапраўдны Нос.

Яна са справядлівым гонарам узняла свой хобат.

— Я катэгарычна не згодны з гэтай заўвагай,— мовіў Бульдог.

— Сланіха мае рацыю,— сказаў Тапір.

— Слухайце,— натхнёна прагаварыў Асёл.— Магчыма, гэта жывёла, якая не можа размаўляць, але думае, што можа.

— Ці можна зрабіць так, каб яно стаяла? — задуменна запыталася Сланіха. Яна пяшчотна абвіла хобатам бязвольнае цела дзядзькі Эндру і паставіла яго на адзін з канцоў: на жаль, дагары нагамі, і з яго кішэняў пасыпаліся манеты. Але дзядзька Эндру зноў паваліўся.

— Вось! — сказалі некалькі галасоў.— Гэта зусім не жывёла, яно не жывое.

— Кажу вам, гэта жывёла,— настойваў Бульдог.— Абнюхайце яго самі.

— Нельга спадзявацца толькі на нюх,— сказала Сланіха.

— Але ж,— запярэчыў Бульдог,— калі нельга давяраць свайму носу, то што тады вартае даверу?

— Магчыма, розум,— мякка прамовіла Сланіха.

— Я катэгарычна не згодны з гэтай заўвагай,— адказаў Бульдог.

— Мы мусім з гэтым нешта зрабіць,— сказала Сланіха.— Бо гэта можа быць Жазло, і мы мусім паказаць яго Аслану. Дык што вы ўсё-такі думаеце: гэта жывёла ці нейкае дрэва?

— Дрэва! Дрэва! — пракрычаў тузін галасоў.

— Цудоўна,— сказала Сланіха.— Калі гэта дрэва, яго трэба пасадзіць. Давайце выкапаем яму.

Двое Кратоў выкапалі яе вельмі хутка. Потым адбылося нядоўгае абмеркаванне, якім бокам трэба саджаць дзядзьку Эндру, і ён ледзь пазбегнуў лёсу быць пасаджаным галавой уніз. Некаторыя жывёлы казалі, што ягоныя ногі — гэта галіны, і, адпаведна, шэрае пухнатае нешта (яны мелі на ўвазе яго валасы) — гэта карэнне. Але потым іншыя сказалі, што яго падвоеная частка больш брудная і больш раскінутая, як належыць караням. Такім чынам, яны пасадзілі яго галавой угору. Калі жывёлы ўтрамбавалі зямлю навокал, яна была вышэй за дзядзькавы калені.

— Нейкае яно зусім засохлае,— сказаў Асёл.

— Вядома ж, яго патрэбна паліць,— прамовіла Сланіха.— Думаю, я магу сказаць (не хачу пакрыўдзіць нікога з тут прысутных), што для падобнай працы такі нос, як у мяне...



— Я катэгарычна не згодны з гэтай заўвагай,— запярэчыў Бульдог.

Але Сланіха спакойна пайшла да ракі, набрала хобатам вады і вярнулася назад, каб паклапаціцца пра дзядзьку Эндру. Разумная жывёла працягвала так рабіць, пакуль не выліла на яго дзясяткі літраў. Вада струмянямі сцякала па ягоным фраку, нібыта ён у адзенні прымаў ванну. Урэшце гэта яго ажывіла. Ён ачуняў. Што гэта было за абуджэнне! Але зараз мы мусім пакінуць яго, каб ён падумаў пра свае кепскія ўчынкі (калі ён быў здольны пра гэта задумацца), і вярнуцца да больш істотных рэчаў.

Агрэст рысіў з Дыгары на спіне, пакуль гоман іншых жывёлаў не знік удалечыні. Цяпер невялікі гурток з Аслана і абраных сябраў Рады быў даволі блізка. Дыгары ведаў, што ён ніколі не здолеў бы перапыніць такую ўрачыстую сустрэчу, але ў гэтым не было неабходнасці. Паводле слова Аслана Слон, Крумкачы і астатнія расступіліся. Дыгары саслізнуў са спіны каня і апынуўся твар да твару з Асланам. І Аслан быў больш вялікі, і больш прыгожы, і больш ззяюча-залаты, і больш грозны, чым думаў Дыгары. Хлопчык не наважваўся зірнуць у вялікія вочы.

— Калі ласка... Містар Леў... Аслан... Сэр...— сказаў Дыгары.— Ці маглі б вы... можна мне... калі ласка, ці не дадзіце вы мне які-небудзь чароўны плод з гэтай краіны, каб мая маці ачуняла?

Ён адчайна спадзяваўся, што Леў адкажа: "Так", і жудасна баяўся, што той можа сказаць: "Не". Але ён разгубіўся, калі Леў не сказаў ні "так", ні "не".

— Гэта той хлопец,— сказаў Аслан, гледзячы не на Дыгары, а на сяброў Рады.— Той, які гэта зрабіў.

"Ой,— падумаў Дыгары.— Што я цяпер нарабіў?"

— Сын Адама,— прамовіў Леў,— у маёй новай зямлі Нарніі апынулася злая Вядзьмарка. Распавядзі добрым звярам, як гэта здарылася.

Самыя розныя варыянты адказу пранесліся ў галаве Дыгары, але ў яго хапіла розуму сказаць толькі праўду.

— Я прывёў яе сюды, Аслан,— адказаў ён ціха.

— Для чаго?

— Я хацеў перанесці яе з майго свету назад, у яе ўласны. Я думаў, што пераношу яе ў ейны свет.

— Як яна апынулася ў тваім свеце, сын Адама?

— Праз... праз магію.

Леў нічога не сказаў, і Дыгары ведаў, што адказаў не цалкам.

— Гэта ўсё мой дзядзька Эндру,— патлумачыў хлопчык.— Ён паслаў нас прэч з нашага ўласнага свету з дапамогай чароўных пярсцёнкаў. Прынамсі, я быў змушаны пайсці, бо ён спачатку паслаў Полі, і потым мы сустрэлі Вядзьмарку ў месцы пад назвай Чарн, і яна проста ўхапілася за нас, калі...

— Вы сустрэлі Вядзьмарку? — перапытаў Аслан ціхім голасам, у якім адчуўся рык.

— Яна прачнулася,— у роспачы сказаў Дыгары. А потым, збялеўшы, дадаў: — У сэнсе, я абудзіў яе. Бо я хацеў даведацца, што адбудзецца, калі стукнуць у звон. Полі не хацела, каб я так рабіў. Яна не вінаватая. Я... я змагаўся з ёй. Я ведаю, што не мусіў так рабіць. Думаю, я быў крыху зачараваны надпісам пад звонам.

— Сапраўды? — запытаўся Аслан, усё яшчэ гаворачы вельмі ціхім і глыбокім голасам.

— Не,— сказаў Дыгары.— Цяпер я разумею, што не быў зачараваны. Я толькі прыкідваўся, што гэты надпіс мяне зацікавіў.

Павісла доўгая паўза. І Дыгары ўвесь час думаў: “Я ўсё сапсаваў. Цяпер няма ніякага шанцу здабыць штосьці для маці”.

Калі Леў ізноў загаварыў, ён звяртаўся не да Дыгары.

— Сябры,— сказаў ён.— Новаму чыстаму свету, які я даў вам, няма яшчэ і сямі гадзін, а сілы зла ўжо ўвайшлі ў яго, абуджаныя і перанесеныя сюды сынам Адама.

Усе звяры, нават Агрэст, так паглядзелі на Дыгары, што яму захацелася праваліцца скрозь зямлю.

— Але не бядуйце,— працягнуў Аслан, усё яшчэ звяртаючыся да жывёлаў.— Зло прыйдзе ад гэтага зла, але да таго часу яшчэ далёка, і я прасачу, каб найгоршае ўпала на мяне самога. А пакуль на многія стагоддзі гэта будзе вясёлая зямля і вясёлы свет. І як род Адама зрабіў шкоду, так род Адама дапаможа выправіць яе. Падыдзіце бліжэй, іншыя двое.

Апошнія словы ён сказаў Полі і возніку, якія якраз прыйшлі. Полі, шырока расплюшчыўшы вочы і адкрыўшы рот, узіралася ў Аслана і моцна трымалася за руку возніка. Возьнік паглядзеў на Льва і зняў свой кацялок: ніхто дагэтуль такім яго не бачыў. Цяпер ён стаў больш малады і прыгожы на выгляд. І быў

падобны да вясковага жыхара, а не да лонданскага возніка.

— Сыне,— звярнуўся Аслан да возьніка.— Я даўно ведаю цябе. Ці ведаеш ты мяне?

— Э-гм, не, сэр,— адказаў align возьнік.— Прынамсі, не ў звычайным сэнсе гэных словаў. Але нейкім чынам я адчуваю, калі мне дазволена так сказаць, нібыта мы сустракаліся раней.

— Гэта добра,— сказаў Леў.— Ты ведаеш мяне лепей, чым табе здаецца, і з часам ты пазнаёмішся са мной яшчэ бліжэй. Табе падабаецца гэтая краіна?

— Гэта выдатнае месца, сэр,— прамовіў возьнік.

— Ты хацеў бы жыць тут заўсёды?

— Разумееце, сэр, я жанаты чалавек,— сказаў возьнік.— Калі б мая жонка была тут, ніхто з нас ніколі больш не захацеў бы вярнуцца назад у гэны Лондан. Мы абодва вясковыя людзі.

Аслан ускінуў грывастую галаву, раскрыў рот і выдаў адну доўгую, нягучную, але поўную сілы ноту. Поліна сэрца падскочыла, і яна была перакананая ў тым, што гэта покліч, і той, хто пачуе яго, захоча і (больш за тое) здолее яго паслухацца, незалежна ад таго, колькі сусветаў і стагоддзяў пралягло паміж імі. Яна не была агаломшаная, калі раптоўна зніадкуль з'явілася маладая жанчына з добрым шчырым тварам і стала побач з ёй. Полі адразу зразумела, што гэта

жонка возніка, перанесеная з нашага свету — толькі не абрыдлым магічным пярсцёнкам, а хутка, проста і пяшчотна, як птушка ляціць да свайго гнязда. Відаць, маладую жанчыну адарвалі ад мыцця бялізны, бо на ёй быў фартух, рукавы былі закасаныя да локцяў, і на руках была мыльная пена. Калі б у яе быў час апрануць сваю добрую вопратку (яе лепшы капялюш аздаблялі штучныя вішні), яна б выглядала жахліва. А ў тым, у чым яна была зараз, яна глядзелася даволі прыгожа.

Вядома ж, яна падумала, што спіць. Таму не паспяшалася адразу ж да мужа, каб запытацца, што такое з імі здарылася. Але, зірнуўшы на Льва, яна не была настолькі ўпэўненая, што гэта сон. Аднак з нейкай прычыны ёй не было страшна. Пасля яна зрабіла маленькі паўрэверанс, бо ў тыя дні некаторыя вясковыя дзяўчаты яшчэ ведалі, як яго рабіць. Потым пайшла, узяўшы возніка за руку, стала побач з ім, крыху сарамліва азіраючыся навокал.

— Дзеці мае,— сказаў Аслан, пільна гледзячы на іх дваіх.— Вы станеце першымі Каралём і Каралевай Нарніі.

Візнік адкрыў рот ад здзіўлення, а яго жонка моцна пачырванела.

— Вы будзеце валадарыць і дасцё імёны ўсім гэтым стварэнням, і будзеце чыніць справядлівасць сярод



іх, і абараняць ад ворагаў, калі тыя з'явяцца. А ворагі з'явяцца, бо ў гэтым свеце ёсць злая Вядзьмарка.

Візнік з цяжкасцю зглынуў два ці тры разы і прачысціў горла.

— Вельмі перапрашаю, сэр,— вымавіў ён.— І вельмі дзякую вам, вядома (і мая жонка таксама), але я не надаюся да такой працы. У мяне няма адукацыі, разумееце.

— Гм,— сказаў Аслан.— Ты ўмееш працаваць рыдлёўкай і плугам і вырошчваць ежу?

— Так, сэр, гэна я ўмею рабіць: мяне так выхоўвалі.

— Ці можаш ты кіраваць гэтымі стварэннямі добра і справядліва, памятаючы, што яны не рабы, як нямыя

жывёлы ў свеце, дзе ты нарадзіўся, але Гаваркія Істоты і вольныя асобы?

— Я разумею, сэр,— адказаў вознік.— Я паспрабую рабіць тое, што справядліва.

— І ці навучыш ты сваіх дзяцей і ўнукаў дзеіць гэтаксама?

— Паспрабую, сэр. Я зраблю ўсё, што ў маіх сілах. Так, Нэлі?

— І ў цябе не будзе ўлюбёнцаў ні сярод сваіх дзяцей, ні сярод звяроў, і ты нікому не дазволіш прыніжаць бліжняга альбо абыходзіцца з іншым несправядліва?

— Я ніколі не мог зміравацца, калі такое адбывалася, сэр, і гэна праўда. Яны атрымаюць па заслугах, калі я штосьці такое заўважу,— сказаў вознік. (Цягам размовы ягоны голас рабіўся больш павольны і насычаны, а гаворка пазбаўлялася гарадской рэзкасці і хуткасці і нагадвала вясковую — так вознік размаўляў у дзяцінстве.)

— І калі ворагі пойдуць супраць гэтай краіны (бо ворагі з'явяцца), і пачнецца вайна, ці будзеш ты ў першых шэрагах тых, хто наступае, і апошнім з тых, хто адступае?

— Ведаеце, сэр,— вельмі павольна прамовіў вознік,— чалавек не можа дакладна ведаць гэна, пакуль не паспытае. Наважуся сказаць, што я магу апынуцца такім чалавекам. (Хто ведае, раптам збаюся?) Ніколі

не біўся, акрамя толькі як на кулаках. Я паспрабую — у сэнсе, я спадзяюся, што паспрабую,— зрабіць тое, што ад мяне залежыць.

— Тады,— сказаў Аслан,— ты зробіш усё, што мусіць зрабіць Кароль. Вашая каранацыя адбудзецца ў хуткім часе. І вы, і вашыя дзеці і ўнукі будзеце дабраславёныя. І некаторыя будуць Каралямі Нарніі, а іншыя будуць каралямі Архэнлэнда, які ляжыць далей, за Паўднёвымі гарамі. А цябе, маленькая дачка (тут ён павярнуўся да Полі), вітаю. Ці даравала ты хлопчыку тую крыўду, якую ён учыніў табе ў Зале Выяваў у пакінутым палацы праклятага Чарна?

— Так, Аслан, мы памірыліся,— адказала Полі.

— Гэта добра,— сказаў Аслан.— А зараз — слухай, хлопчык.

## Раздзел 12

# Прыгоды Агрэста

Дыгары сціснуў зубы. Яму рабілася ўсё больш і больш няёмка. Ён спадзяваўся, што не расплачацца і не зробіць штосьці недарэчнае.

— Сын Адама,— мовіў Аслан,— ці ты гатовы выправіць тое кепскае, што зрабіў маёй добрай краіне Нарніі ў самы дзень яе нараджэння?

— Не зусім разумею, што я магу зрабіць,— адказаў Дыгары.— Каралева ўцякла і...

— Я запытаўся: ці ты гатовы? — сказаў Леў.

— Так,— адказаў Дыгары. На імгненне ў яго з'явілася вар'яцкая ідэя сказаць: "Я паспрабую, калі вы паабяцаеце дапамагчы маёй маме",— аднак ён своечасова зразумеў, што Леў зусім не належаў да тых, з кім можна паспрабаваць заключыць здзелку. Але, сказаўшы "Так", ён падумаў пра сваю маці і пра вялікія спадзяванні, якія ў яго былі, і пра тое, як яны

ўсе зніклі. Яго горла сціснула, на вачах выступілі слёзы, і ён выпаліў:

— Калі ласка, калі ласка, ці не дадзіце вы... ці не маглі б вы даць мне штосьці, што аздаравіць маю маму?

Да гэтага моманту ён глядзеў на вялікія лапы Льва і велізарныя кіпцюры, але цяпер, у адчаі, ён паглядзеў на аблічча. Тое, што ён пабачыў, здзівіла яго больш, чым што іншае за ўсё яго жыццё. Бо карычнева-руды твар нахіліўся блізка да яго ўласнага твару, і (цуд з цудаў!) у вачах Ільва стаялі вялікія ззяючыя слёзы. Яны былі такія вялікія і яскравыя ў параўнанні са слязьмі Дыгары, што на імгненне ён адчуў, нібыта Льву насамрэч больш шкада яго маці, чым яму самому.

— Мой сыне, мой сыне,— сказаў Аслан.— Я ведаю. Гора — моцнае пачуццё. Пакуль толькі ты і я ў гэтай краіне ведаем, што гэта такое. Будзьма добрымі адно да аднаго. Але я мушу падумаць пра будучыя стагоддзі ў жыцці Нарніі. Вядзьмарка, якую ты перанёс у гэты свет, ізноў вернецца. Ды час гэтаму яшчэ не настаў. Я хачу пасадзіць у Нарніі дрэва, да якога яна не наважыцца наблізіцца, і гэтае дрэва будзе абараняць ад яе Нарнію шмат год. Такім чынам, на гэтай зямлі будзе доўгі светлы ранак, пакуль аблокі закрыюць сонца. Ты мусіш прынесці мне зярнятка, з якога вырасце гэтае дрэва.

— Добра, сэр,— адказаў Дыгары.

І хоць ён не ведаў, якім чынам, але цяпер быў упэўнены, што здолее гэта зрабіць. Леў глыбока ўздыхнуў, нахіліў галаву яшчэ ніжэй і пацалаваў яго Львіным пацалункам. І Дыгары адразу ж адчуў, што ў яго з'явіліся новыя сілы і смеласць.

— Дарагі сыне,— мовіў Аслан,— я скажу табе, што рабіць. Павярніся, паглядзі на захад і скажы мне, што ты бачыш.

— Я бачу неверагодна вялікія горы, Аслан,— адказаў Дыгары.— Раку, якая падае ўніз са скалаў і ўтварае вадаспад. А за скаламі — высокія зялёныя ўзгоркі, пакрытыя лесам. А за імі — зноў узгоркі, вышэйшыя, якія выглядаюць амаль чорнымі. Потым, далёка,— вялікія заснежаныя горы, згуртаваныя разам, як Альпы на малюнках. А за імі няма нічога, акрамя неба.

— Ты добра бачыш,— сказаў Леў.— Краіна Нарнія заканчваецца там, дзе вадаспад, і, дасягнуўшы вяршыні скалаў, ты пакінеш Нарнію і апынешся ў Заходняй Пустэчы. Ты мусіш ісці праз тыя горы, пакуль не знойдзеш зялёную даліну з блакітным возерам, аточаную сцяной ледзяных гор. За возерам — круты зялёны ўзгорак. На вяршыні гэтага ўзгорка — сад. У цэнтры гэтага саду расце дрэва. Сарві з яго яблык і прынясі мне.

— Добра, сэр,— ізноў адказаў Дыгары.

У яго не было ніякага ўяўлення аб тым, як ён забярэцца на скалу і знойдзе шлях пасярод гор, але ён не захацеў гэтага казаць, бо баяўся, што ягоныя словы прагучаць як апраўданні. Ён прагаварыў:

— Спадзяюся, Аслан, вы не спяшаецеся. У мяне не атрымаецца хутка дабрацца туды і вярнуцца.

— Маленькі сын Адама, у цябе будзе дапамога,— сказаў Аслан.

Ён павярнуўся да Каня, які ўвесь гэты час ціха стаяў побач з імі, абмахваючыся хвастом, каб адагнаць мух, і слухаў, нахіліўшы галаву на адзін бок, як быццам яму было цяжкавата зразумець, пра што ідзе размова.

— Мой дружа,— сказаў Аслан Каню.— Ці хацеў бы ты стаць Крылатым Канём?

Трэба было бачыць, як Конь страсянуў грывай, як раздзьмуліся яго ноздры і як ён прытупнуў адной з задніх ног. Відавочна, ён вельмі б хацеў быць Крылатым Канём. Але вымавіў толькі:

— Калі ты хочаш, Аслан... калі ты сапраўды маеш на ўвазе... не разумею, чаму я... я не надта разумны конь.

— Станься бацькам усіх коней, што лётаюць,— прарыкаў Аслан голасам, які страсянуў зямлю.— Цяпер тваё імя — Крылаты.

Конь шугануўся, як, напэўна, ён шугаўся ў старыя нешчаслівыя дні, калі цягаў экіпаж. Потым заржаў





і выгнуў шыю назад, нібыта муха кусала яго за плечы і ён хацеў іх пачухаць. А потым гэтак жа, як звяры з'явіліся з зямлі, з плячэй Крылатага праклюнуліся крылы, якія выпросталіся і раслі, больш за арліныя, больш за лебядзіныя, больш за крылы анёлаў на царкоўных вітражах. Пер'е ззяла гнядым і медным колерам. Ён магутна ўзмахнуў імі і ўзняўся ў паветра. У пяці метрах над Асланам і Дыгары ён захроп, заржаў і зрабіў заліхвацкі кулёк у паветры. Потым, абляцеўшы наўкол іх яшчэ раз, ён зваліўся на

зямлю, усімі чатырма капытамі разам, выглядаючы надзвычай збянтэжаным і здзіўленым, але вельмі задаволеным.

— Табе падабаецца, Крылаты? — спытаў Аслан.

— Вельмі, Аслан,— адказаў Конь.

— Ты аднясеш сына Адама на сваёй спіне ў тую горную даліну, пра якую я казаў?

— Што? Цяпер? Зараз жа? — узрадаваўся Агрэст, ці Крылаты, як мы мусім цяпер яго называць.— Ура! Хадзі сюды, малы. Я насіў такіх, як ты, на сваёй спіне раней. Даўным-даўно. Калі былі зялёныя палі. І цукар.

— Пра што шэпчуцца дзве дачкі Евы? — запытаўся Аслан, раптоўна павярнуўшыся да Полі і жонкі возніка, якія паспелі пасябраваць.

— Калі на тое вашая ласка, сэр,— прамовіла Каралева Хэлен (бо цяпер Нэлі, жонка возніка, была каралевай),— я мяркую, дзяўчынка таксама хацела б далучыцца, калі гэта не створыць нязручнасцяў.

— Што ты пра гэта думаеш, Крылаты? — запытаўся Леў.

— О, я не супраць дваіх, тым больш, калі яны маленькія,— адказаў Крылаты.— Самае галоўнае, каб Слон таксама не захацеў паляцець.

Слон не хацеў, і новы Кароль Нарніі дапамог абодвум дзецям узлезці: гэта азначала, што ён без

цырымоній закінуў Дыгары і так далікатна і асцярожна пасадзіў на конскую спіну Полі, нібыта яна была з парцаляны і магла разбіцца.

— Вось, яны ўселіся, Агрэст... Крылаты, я меў на ўвазе. Але ж і нечаканы паварот!

— Не ляці занадта высока,— папярэдзіў Аслан.— Не спрабуй падняцца над вяршынямі вялікіх ледзяных гор. Шукай даліны, зялёныя месцы і ляці праз іх. Там заўсёды можна будзе праляцець. А цяпер выпраўляйцеся з маім дабраславеннем.

— О, Крылаты! — сказаў Дыгары, нахіляючыся, каб паляпаць па блішчастай конскай шыі.— Гэта цудоўна! Моцна трымайся за мяне, Полі.

У наступнае імгненне зямля засталася далёка знізу, круцячыся, бо Крылаты, як вялізны голуб, зрабіў кола ці два, перш чым выправіцца ў далёкі палёт на захад. Гледзячы ўніз, Полі ледзь бачыла Караля і Каралеву, і нават сам Аслан быў усяго толькі зыркай жоўтай кропкай на зялёнай траве. Хутка вецер пачаў дзьмуць ім у твар, і Конь прыстасаваўся рытмічна ўзмахваць крыламі.

Уся Нарнія, рознакаляровая, з лужкамі і скаламі, верасам і рознымі дрэвамі, плыла ўнізе. Рака вілася скрозь яе, нібы срэбная стужка. Яны ўжо маглі бачыць, што было за вяршынямі нізкіх узгоркаў, якія ляжалі на поўначы справа ад іх. За тымі ўзгоркамі да



самага далягляду распасціралася велізарная верасовая пустка. Злева ад іх горы былі значна вышэйшыя, але раз-пораз сустракалася пустое месца, калі можна было паміж высачэзнымі сасновымі лясамі мімаходзь пабачыць блакітныя і далёкія паўднёвыя землі.

— Там Архэнлэнд,— сказала Полі.

— Так, але зірні наперад!

Бо цяпер перад імі высачэзным бар'ерам паўсталі скалы, і сонечнае святло, што танчыла на велічным вадаспадзе, асляпіла іх. Рака з ровам і ззяннем абрывалася ў Нарнію з высокіх заходніх земляў, дзе былі яе вытокі.

Яны ўжо ляцелі так высока, што рокат вады чуўся як ціхі і слабы гук, але яшчэ недастаткова высока, каб пераляцець праз вяршыні скал.

— Тут давядзецца крыху палётаць зігзагамі,— зазначыў Крылаты.— Добра трымайцеся.

Ён пачаў лятаць узад-уперад, падымаючыся вышэй пры кожным павароце. Паветра стала больш сцюдзёнае, і далёка ўнізе дзеці пачулі крыкі арлоў.

— Паслухайце, азірніцеся! Азірніцеся! — сказала Полі.

Яны бачылі ўсю даліну Нарніі, распасцёртую да самага небасхілу на ўсходзе. Там блішчэла мора. Цяпер вандроўнікі былі так высока, што змаглі разгледзець маленечкія вострыя горы, што паказаліся

за паўночна-заходнімі верасовымі пусткамі, і шмат нечага, што нагадвала пясок, далёка на поўдні.

— Як бы я хацеў, каб хтосьці распавёў нам, што гэта за мясціны,— вымавіў Дыгары.

— Я не думаю, што там нешта ёсць,— адказала Полі.— У сэнсе, там няма нікога і нічога не адбываецца. Свет з'явіўся толькі сёння.

— Вядома, але людзі дабяруцца туды,— сказаў Дыгары.— А потым у іх з'явяцца гісторыі.

— І гэта проста цудоўна, што цяпер іх няма,— зазначыла Полі.— Бо пакуль нікога не прымушаюць усё гэта вучыць. Бітвы, і даты, і ўсю гэтую лухту.

Цяпер яны пераляцелі праз вяршыню скалы, і праз некалькі хвілін раўнінная краіна Нарнія знікла з вачэй. Яны ляцелі па-над дзікай зямлёй з крутымі ўзгоркамі і цёмнымі лясамі, працягваючы трымацца ракі. Наперадзе былі высачэзныя горы. Але зараз сонца біла вандроўнікам проста ў вочы, і яны не маглі выразна бачыць у тым кірунку. Сонца апускалася ніжэй і ніжэй, пакуль заходняе неба не стала як адзін вялікі горан, напоўнены вадкім золатам. Нарэшце сонца села за востры пік, які на яркім фоне выглядаў такім вострым і плоскім, нібыта быў выразаны з кардону.

— Тут не горача,— сказала Полі.

— І ў мяне пачынаюць балець крылы,— адказаў Крылаты.— Я не бачу даліны з возерам, пра якую

казаў Аслан. Прапаную спусціцца і знайсці прыдатнае месца для начлегу. Мы не дабярэмся да таго саду сёння.

— Так, і, пэўна, ужо час павячэраць? — запытаўся Дыгары.

Такім чынам, Крылаты спускаўся ўсё ніжэй і ніжэй. Чым больш яны набліжаліся да зямлі і наўкол паўставалі ўзгоркі, тым цяплейшым рабілася паветра. І пасля шматгадзіннай вандроўкі, падчас якой не было чуваць нічога, акрамя ўзмахаў крылаў, было прыемна ізноў пачуць знаёмыя і зямныя гукі — шэпт ракі ў каменным рэчышчы, парыпванне дрэваў на лёгкім ветрыку. Ад нагрэтай сонцам зямлі, травы і кветак падымаўся цёплы прыемны пах. Нарэшце Крылаты прызямліўся. Дыгары скаціўся ўніз і дапамог спусціцца Полі. Абодва радаваліся магчымасці размяць здранцвелыя ногі.

Даліна, у якой яны апынуліся, была ў самым сэрцы гор; заснежаныя вяршыні, адна з якіх здавалася ружова-чырвонай у адбітку захаду, узвышаліся над імі.

— Я хачу есці,— сказаў Дыгары.

— Ну дык частуйся,— прапанаваў Крылаты, набіўшы поўны рот травы. Потым ён падняў галаву, усё яшчэ жуючы, з травінкамі, што тырчалі з абодвух бакоў яго рота, як вусы, і прамовіў:

— Давайце, вы двое. Не саромцеся. Тут на ўсіх хопіць.

— Але мы не ямо траву,— адказаў Дыгары.

— Гм, гм,— сказаў Крылаты праз набіты рот.— Тады, гм, не ведаю, што вы будзеце рабіць. Тут вельмі смачная трава.

Полі і Дыгары збянтэжана паглядзелі адно на аднаго.

— Ведаеш, я думаю, хтосьці мусіў паклапаціцца, каб у нас была ежа,— вымавіў Дыгары.

— Упэўнены, Аслан зрабіў бы гэта, калі б вы яго папрасілі,— сказаў Крылаты.

— Хіба ён не ведаў, што нам спатрэбіцца ежа, нават калі мы яго не папрасілі? — сказала Полі.

— Не сумняваюся, што ведаў,— адказаў Конь (усё яшчэ з поўным ротам).— Аднак мне здаецца, што яму падабаецца, калі яго аб нечым просяць.

— Але што нам цяпер рабіць? — запытаўся Дыгары.

— Я не ведаю...— прамовіў Крылаты.— Хіба што пакаштуйце травы. Вам яна можа спадабацца больш, чым вы думаеце.

— Ну, не будзь дурнем,— сказала Полі, тупнуўшы нагой.— Вядома ж, людзі не ядуць траву, як ты не ясі адбіўныя з бараніны.

— Дзеля ўсяго святога, не кажы пра адбіўныя і падобныя рэчы,— папрасіў Дыгары.— Ад гэтага робіцца толькі горш.

Дыгары сказаў, што Полі варта перанесціся дадому з дапамогай пярсцёнка і ўзяць паесці; ён сам не мог

гэтага зрабіць, бо мусіць выканаць тое, што паабяцаў Аслану, і калі ён ізноў з'явіцца дома, можа здарыцца штосьці такое, з-за чаго ён не зможа вярнуцца. Але Полі сказала, што не пакіне яго, і Дыгары зазначыў, што гэта вельмі высакародна з яе боку.

— Ведаеш што? — сказала Полі.— У мяне засталося крыху ірысак у пакеціку ў куртцы. Гэта лепш, чым нічога.

— Нашмат лепш,— пагадзіўся Дыгары.— Але будзь асцярожнай, каб не дакрануцца да пярсцёнка, калі будзеш апускаць руку ў кішэню.

Гэта была складаная і далікатная справа, але ўрэшце ў іх атрымалася. Папяровы пакуначак быў моцна пакамечаны і ліпкі, калі яны нарэшце вынялі яго, таму хутчэй трэба было аддзіраць паперу ад ірысак, чым даставаць іх адтуль. Некаторыя дарослыя (вы ведаеце, які вэрхал яны, бывае, падымаюць з-за справаў кшталту гэтай) лепей бы абышліся зусім без вячэры, чым з'елі тыя ірыскі. Усяго іх было дзевяць. Дыгары прыйшла ў галаву геніяльная ідэя: кожнаму з'есці па чатыры і пасадзіць дзявятую. Бо, як ён сказаў: "Калі прут ад ліхтара ператварыўся ў маленькае ліхтарнае дрэва, чаму ірыска не можа ператварыцца ў ірыскавае дрэва?"

Таму яны выкапалі невялікую ямку і закапалі адну ірыску. Потым з'елі астатнія, спрабуючы есці як мага

павольней. Гэта была сціплая вячэра, нават з улікам усёй прыліплай паперы, якую ім таксама давялося праглынуць.

Крылаты лёг, скончыўшы свой шыкоўны банкет. Дзеці падышлі і селі па баках, прытуліўшыся да яго цёплага цела, а калі ён распасцёр над кожным з іх крылы, ім стала сапраўды ўтульна. Пакуль з'яўляліся яскравыя маладыя зоры гэтага свету, падарожнікі ўсё абгаварылі: як Дыгары спадзяваўся атрымаць нешта для маці і як замест гэтага яго паслалі на заданне. І яны паўтарылі адно аднаму ўсе прыкметы, паводле якіх можна пазнаць месца, якое шукаюць: блакітнае возера і ўзгорак з садам на вяршыне. Размова якраз стала запавольвацца, бо яны пачалі засынаць, калі раптам Полі села, цалкам прачнуўшыся, і сказала:

— Ціха!



Усе прыслухоўваліся так старанна, як толькі маглі.

— Магчыма, гэта быў вецер у галінах дрэваў,— праз некаторы час вымавіў Дыгары.

— Я не ўпэўнены,— сказаў Крылаты.— У любым выпадку... чакай! Вось ізноў. Клянуся Асланам, там нешта ёсць.

Конь шумна ўзняўся на ногі; дзеці таксама падняліся. Крылаты рысіў узад-уперад з пахрапваннем і ржаннем. Дзеці на дыбачках абышлі ўсё навокал, зазіраючы за кожны куст і дрэва. Ім усё здавалася, што яны нешта бачаць, і адзін раз Полі была дакладна ўпэўненая, што заўважыла высокую цьмяную постаць, якая рухалася ў заходнім кірунку. Але яны нічога не знайшлі, і ўрэшце Крылаты зноў лёг, і дзеці ўладкаваліся пад яго крыламі. Яны адразу ж праваліліся ў сон. Крылаты яшчэ доўгі час не спаў, насцярожана прыслухоўваючыся ў цемры, і часам па яго скуры прабягалі дрыжыкі, нібыта на яго села муха. Але ўрэшце ён таксама заснуў.

## Раздзел 13
# Нечаканая сустрэча

— Прачынайся, Дыгары, прачынайся, Крылаты,— пачуўся голас Полі.— Вырасла ірыскавае дрэва! І раніца проста найцудоўнейшая.

Нізкае святло ранішняга сонца бруілася праз лес, трава пашарэла ад расы, і павуцінне было нібыта срэбра. Зусім блізка ад іх расло маленькае дрэўца памерам з яблыню, з вельмі цёмнай карой. Яго белаватае лісце моцна нагадвала паперу і было як у расліны, што называецца "луннік", а шмат дробных карычневых пладоў на ім выглядалі амаль як фінікі.

— Ура! — выгукнуў Дыгары.— Але спачатку я збіраюся акунуцца.

Праз усыпаныя кветкамі зарасці ён пабег да берагу ракі. Ці купаліся вы калі-небудзь у горнай рацэ, плыткія воды якой коцяцца над чырвонымі, блакітнымі і жоўтымі камянямі, што блішчаць на сонцы? У ёй

гэтак жа добра, як у моры; у некаторым сэнсе нават лепей. Вядома, Дыгары давялося зноў апрануцца не абсохнуўшы, але гэта было таго вартае. Калі ён вярнуўся, Полі пайшла да ракі купацца; прынамсі, яна сказала, што купалася, але мы ведаем, што яна не асабліва добра плавала, і, магчыма, лепей не задаваць зашмат пытанняў. Крылаты таксама наведаў раку, але ён толькі пастаяў у сярэдзіне плыні і, нахіліўшыся, доўга піў, а потым патрос грывай ды некалькі разоў заржаў.

Полі і Дыгары падышлі да ірыскавага дрэва. Плады былі вельмі смачныя: не зусім як ірыскі — больш мяккія і сакавітыя,— але нагадвалі іх. Крылаты таксама выдатна паснедаў: ён пакаштаваў адзін з пладоў ірыскавага дрэва, і яму спадабалася. Але Конь сказаў, што ў гэты час яму больш даспадобы трава. Потым, з некаторымі цяжкасцямі, дзеці ўзлезлі яму на спіну, і другая вандроўка пачалася.

Яна была нават лепшай за ўчарашнюю, часткова таму, што кожны пачуваўся такім бадзёрым, а часткова таму, што сонца, якое толькі што ўзышло, было за іх спінамі, і, вядома, усё выглядае прыгажэйшым, калі святло ззаду цябе. Гэта была цудоўная паездка. Вялікія заснежаныя горы высіліся над імі з усіх бакоў. Даліны, нізка пад імі, былі такія зялёныя, і ўсе ручаі, якія цяклі ад ледавікоў да галоўнай ракі, былі такія блакітныя,



што здавалася, быццам яны ляцяць над гіганцкім пано, зробленым з найкаштоўнейшых камянёў. Ім хацелася б, каб гэтая частка прыгоды працягвалася як мага даўжэй. У хуткім часе яны адчулі нейкі пах і сталі пытацца адзін у аднаго: "Што гэта?", "Ты адчуваеш гэты пах?", "Адкуль ён?" Бо нябесны водар, цёплы і залаты, нібыта пах усіх найсмачнейшых пладоў і кветак у свеце, далятаў да іх аднекуль спераду.

— Ён ідзе вунь з той даліны з возерам,— сказаў Крылаты.

— Так,— адказаў Дыгары.— І зірніце! Там, за возерам,— зялёны ўзгорак. І паглядзіце, якая блакітная вада.

— Гэта мусіць быць тое самае Месца,— сказалі ўсе трое.

Крылаты шырокімі коламі спускаўся ніжэй і ніжэй. Абледзянелыя пікі падымаліся ўсё вышэй і вышэй над імі. Паветра з кожным імгненнем рабілася ўсё больш цёплае і духмянае, такое салодкае, што ад яго амаль наварочваліся слёзы. Цяпер Крылаты ляцеў з нерухома распасцёртымі крыламі і шукаў капытамі зямлю. Стромы зялёны ўзгорак хутка набліжаўся. Праз імгненне Конь крыху нязграбна прызямліўся на ягоны схіл. Дзеці скаціліся з конскай спіны, упалі, не выцяўшыся, на цёплую невысокую траву і падняліся, пераводзячы дух.

Яны былі ў трох чвэрцях шляху да вяршыні ўзгорка і адразу ж пачалі ўзбірацца далей. (Я не думаю, што Крылаты змог бы падымацца, калі б у яго не было крылаў для раўнавагі — іх узмахамі ён раз-пораз сабе дапамагаў.) Самую вяршыню ўзгорка атачала высокая агароджа. Унутры раслі дрэвы. Галіны звісалі над агароджай, іх лісце было не толькі зялёнае, але таксама блакітнае і срэбнае,

што было відаць, калі вецер гойдаў галінкі. Дабраўшыся да вяршыні, вандроўнікі абышлі наўкол амаль што ўсю агароджу, перш чым знайшлі браму: высокую браму з золата, моцна замкнёную, звернутую на ўсход.

Да гэтага часу, я мяркую, Крылаты і Полі думалі, што зойдуць у сад разам з Дыгары. Але цяпер яны ўжо так не думалі. Вы ніколі не бачылі месца, якое было б настолькі відавочна адасобленым, асабістым. З першага позірку можна было пераканацца, што сад належыць камусьці іншаму. Дыгары адразу зразумеў, што астатнія не пойдуць ды й не маглі б пайсці з ім. Ён рушыў да брамы адзін.

Падышоўшы зусім блізка, Дыгары пабачыў словы, напісаныя на золаце срэбнымі літарамі, нешта накшталт такога:

*Заходзь у сад праз браму — ці не заходзь зусім,*
*Хутчэй вазьмі для іншых — не для сябе — мой плод.*
*Бо знойдзе ўсё, што хоча,— і роспач разам з тым —*
*Той, хто крадзе падступна і лезе цераз плот.*

“Хутчэй вазьмі для іншых,— сказаў пра сябе Дыгары.— Якраз гэта я збіраюся зрабіць. Значыць, я не мушу есці сам. Не ведаю, пра што гэтае балбатанне ў перадапошнім радку. Заходзь у сад праз браму. Хто

захоча лезці праз агароджу, калі можна ўвайсці праз браму? Але як яна адчыняецца?"

Ён дакрануўся да брамы, і яна адразу ж шырока расхінулася ўнутр, павярнуўшыся на завесах без адзінага гуку.

Цяпер, калі ён мог зазірнуць за агароджу, гэтае месца выглядала яшчэ больш прывабным. Ён увайшоў вельмі ўрачыста, азіраючыся навокал. Унутры было надзвычай ціха. Нават ад фантана, які біў амаль у сярэдзіне саду, далятаў толькі ледзь чутны гук. Навокал разлягаўся цудоўны водар: гэта было радаснае месца, але вельмі сур'ёзнае.

Ён адразу пазнаў патрэбнае дрэва. Часткова таму, што яно стаяла ў самай сярэдзіне, а часткова таму, што яно было абсыпана вялікімі срэбнымі яблыкамі, якія ззялі і адкідвалі святло ўніз на цяністыя месцы, куды не сягала сонца. Дыгары падышоў наўпрост да дрэва, сарваў яблык і паклаў яго ў нагрудную кішэнь. Але ён не ўтрымаўся, разгледзеў і панюхаў яго перад тым, як схаваць.

Лепей бы ён так не рабіў. Яго ахапілі жудасная смага, голад і прагненне пакаштаваць гэты плод. Ён хутка паклаў яго ў кішэню. Але ж на дрэве было яшчэ шмат яблыкаў. Няўжо ён зробіць кепска, калі пакаштуе адзін? Урэшце, падумаў ён, надпіс на браме можа быць і не зусім загадам; гэта можа быць толькі



парада — а каму ёсць справа да парады? А нават калі гэта загад, ці ён парушыць яго, калі з'есць яблык? Ён ужо споўніў частку, у якой кажацца пра тое, каб браць "для іншых".

Разважаючы пра ўсё гэта, Дыгары выпадкова паглядзеў скрозь галіны ў кірунку верхавіны дрэва. Там, на галіне над яго галавой, сядзела, уладкаваўшыся нібыта на седале для сну, цудоўная птушка. Я кажу так, бо здавалася, што яна заснула; магчыма, праўда, не да канца. Адно вока было ледзь прыкметна расплюшчана. Птушка была большая за арла, спераду жоўта-памаранчавая, на галаве пунсовы чубок, а хвост быў пурпуровы.

"І гэта сведчыць,— казаў Дыгары пасля, калі распавядаў сваю гісторыю іншым,— што трэба быць вельмі асцярожнымі ў чароўных месцах. Ты ніколі не ведаеш, хто можа за табой назіраць". Але я думаю, Дыгары не ўзяў бы сабе яблык у любым выпадку. У тыя часы рэчы кшталту "не крадзі" сядзелі ў галовах хлопцаў значна больш надзейна, чым зараз. Хаця, зрэшты, мы не можам быць упэўненыя да канца.

Дыгары якраз разварочваўся, каб ісці да брамы, але спыніўся, апошні раз разглядаючыся навокал. І застыў ад жаху. Ён быў не адзін. Усяго ў некалькіх метрах ад яго стаяла Вядзьмарка. Яна выкінула

агрызак толькі што з'едзенага яблыка. Ягоны сок быў цямнейшым, чым можна было б чакаць, і ад яго вакол Вядзьмарчыных вуснаў з'явілася страшная пляма. Дыгары адразу здагадаўся, што яна, пэўна, пералезла праз агароджу. І ён пачаў разумець, што ў радку, які казаў, што той, хто знойдзе, што хоча, атрымае разам з тым роспач, быў сэнс. Бо Вядзьмарка выглядала больш моцнай і ганарыстай, чым калі-небудзь раней. У нейкім сэнсе нават пераможнай; але яе твар быў змярцвела-белы, як соль.

Усё гэта ў імгненне пранеслася ў галаве Дыгары; затым ён пабег прэч і нёсся да брамы так хутка, як толькі мог; Вядзьмарка кінулася наўздагон. Як толькі ён выбег з саду, брама сама зачынілася за ім. Гэта дало яму фору, але ненадоўга. Да таго моманту, як ён падбег да сяброў і крыкнуў: "Хутчэй, заскоквай, Полі! Падымайся, Крылаты!" — Вядзьмарка пераскочыла праз агароджу і зноў была блізка.

— Стойце там, дзе стаіце! — закрычаў Дыгары, павярнуўшыся тварам да яе.— Ці мы ўсе знікнем. Не падыходзьце ні на крок бліжэй.

— Дурны хлопчык,— сказала Вядзьмарка.— Чаму ты ўцякаеш ад мяне? Я не зраблю табе нічога кепскага. Калі ты не спынішся і не выслухаеш мяне зараз, ты не здабудзеш веды, якія змаглі б зрабіць цябе шчаслівым да канца жыцця.

— Не, я не хачу гэтага чуць, дзякую,— сказаў Дыгары.

Але насамрэч ён хацеў.

— Я ведаю, з якім заданнем ты прыляцеў сюды,— працягвала Вядзьмарка.— Бо гэта я была побач з вамі ў лесе мінулай ноччу і чула ўсе вашыя нарады. Ты сарваў плод у гэтым садзе. Цяпер ён у цябе ў кішэні. І ты, не пакаштаваўшы, збіраешся адвезці яго назад Ільву — каб ён яго з'еў, каб ён ім скарыстаўся. Ты прасцяк! Ты ведаеш, што гэта за плод? Я распавяду табе. Гэта яблык маладосці, яблык жыцця. Я ведаю, бо пакаштавала яго. І я ўжо адчуваю перамены ў сабе, я ведаю, што ніколі не састарэю і не памру. З'еш яго, хлопец, з'еш яго; і мы абодва будзем жыць вечна і будзем каралём і каралевай усяго гэтага свету — ці твайго свету, калі вырашым вярнуцца туды.

— Не, дзякую,— сказаў Дыгары.— Не думаю, што вельмі захачу жыць і жыць, пасля таго як усе, каго я ведаю, згінуць. Я лепей пражыву звычайны час, памру і пайду на Нябёсы.

— Але як жа твая маці, якую ты быццам бы так моцна любіш?

— Якое дачыненне яна мае да гэтага?

— Ці ты не разумееш, дурань, што адзін кавалачак гэтага яблыка ацаліць яе? Яно ў тваёй кішэні. Мы тут адны, і Леў далёка. Выкарыстай сваю магію і

вярніся ў свой свет. Праз хвіліну ты будзеш каля ложка маці і аддасі ёй плод. Праз пяць хвілін ты пабачыш, як колеры вяртаюцца на яе твар. Яна скажа табе, што боль знік, што пачуваецца лепей. Потым яна засне — падумай пра гэта: гадзіны салодкага сапраўднага сну, без болю, без лекаў. Назаўтра ўсе будуць казаць, як цудоўна яна паправілася. Хутка яна будзе зноў здаровая. Усё зноў будзе добра. У тваім доме зноў будзе радасць. Ты будзеш як іншыя хлопчыкі.

— Ох! — выдыхнуў Дыгары, нібыта яго параніла, і паклаў руку на сэрца. Ён зразумеў, што перад ім ляжыць найжахлівейшы выбар.

— Што для цябе зрабіў Леў, каб ты быў яго рабом? — запыталася Вядзьмарка.— Што ён зможа табе зрабіць, калі ты вернешся ў свой уласны свет? І што падумала б твая маці, калі б ведала, што ты мог спыніць яе боль, вярнуць ёй жыццё і ўратаваць сэрца твайго бацькі ад роспачы, а ты вырашыў заняцца справамі дзікай жывёлы ў дзіўным свеце, да якога не маеш ніякага дачынення?

— Я... я не думаю, што ён — дзікая жывёла,— вымавіў Дыгары голасам, які бывае, калі ў вас перасохла горла.— Ён... я не ведаю...

— Тады ён нешта горшае,— сказала Вядзьмарка.— Паглядзі, што ён ужо табе зрабіў: паглядзі, якім

неміласэрным ты стаў. Так ён робіць з кожным, хто слухае яго. Ты — жорсткі, бязлітасны хлопчык! Дазволіш сваёй маці памерці, замест таго каб...

— О, замаўчыце! — адказаў Дыгары ў роспачы, тым жа голасам.— Ці вы думаеце, што я не разумею? Але я... я паабяцаў.

— Але ты не ведаў, што абяцаў. І ніхто тут не змог цябе папярэдзіць.

— Маці самой,— сказаў Дыгары, з цяжкасцю вымаўляючы словы,— не спадабалася б гэта — яна неверагодна строгая наконт стрымлівання абяцанняў... і крадзяжоў... і ўсялякіх такіх рэчаў. Яна б сказала мне не рабіць гэтага — адразу ж, калі б была тут.

— Але ёй не абавязкова пра гэта ведаць,— словы Вядзьмаркі прагучалі больш салодка, чым можна было б чакаць ад кагосьці з такім жорсткім тварам.— Ты не скажаш ёй, як здабыў яблык. Твайму бацьку няма неабходнасці гэта ведаць. Нікому ў тваім свеце не трэба нічога ведаць пра ўсю гэтую гісторыю. І табе не абавязкова браць з сабой назад гэтую дзяўчынку.

Тут Вядзьмарка зрабіла фатальную памылку. Вядома, Дыгары ведаў, што Полі можа вярнуцца з дапамогай уласнага пярсцёнка гэтаксама проста, як ён мог вярнуцца з дапамогай свайго. Але Вядзьмарка гэтага не ведала. І ганебнасць гэтай прапановы — пакінуць

Полі — раптоўна зрабіла ўсе астатнія рэчы, якія Вядзьмарка казала яму, няправільнымі і пустымі. І нават пасярод усёй роспачы яго розум раптам прасвятліўся, і Дыгары сказаў (іншым і значна гучнейшым голасам):

— Паслухайце, а калі гэта ўсё пачало вас цікавіць? Чаму вы раптам так моцна сталі клапаціцца пра маю маці? Якая вам да гэтага справа? Што ў вас за гульня?

— Малайчына, Дыг,— прашаптала Полі яму на вуха.— Хутчэй! Уцякаем.

Яна не наважвалася нічога сказаць на працягу ўсёй размовы, бо, разумееце, гэта не яе маці памірала.

— Тады забірайся,— мовіў Дыгары, падсаджваючы яе на спіну Крылатага, а затым ускараскаўся сам — так хутка, як мог. Конь распасцёр крылы.

— Уцякайце, дурні,— крыкнула Вядзьмарка.— Падумай пра мяне, хлопчык, калі будзеш ляжаць, стары і слабы, і паміраць. Узгадай, як ты адкінуў шанец на бясконцую маладосць! Больш яго не будзе!

Яны былі ўжо так высока, што ледзь-ледзь яе чулі. Вядзьмарка таксама не губляла часу на тое, каб глядзець на іх; яны пабачылі, як яна пайшла на поўнач, уніз па схіле ўзгорка.

У той дзень яны ўсталі вельмі рана, і тое, што адбылося ў садзе, цягнулася нядоўга, таму Крылаты і Полі абодва сказалі, што будзе лёгка вярнуцца назад

у Нарнію да ночы. Дыгары нічога не казаў на зваротным шляху, а іншыя саромеліся размаўляць з ім. Вельмі засмучаны, ён не быў цалкам упэўнены, што зрабіў правільна. Але, узгадваючы слёзы ў вачах Аслана, умацоўваўся ў сваім рашэнні.

Увесь дзень Крылаты нёс іх на ўсход. Крылы яго не стамляліся, а рака паказвала яму шлях праз горы. Яны ляцелі над дзікімі лясістымі ўзгоркамі і потым над вялікім вадаспадам і далей, далей, туды, дзе на лясы Нарніі падаў цёмны цень магутнай скалы. Калі неба пачырванела ад сонца, якое ўжо заходзіла, Крылаты пабачыў месца, дзе каля ракі сабралася шмат істотаў. І хутка ён змог заўважыць пасярод іх самога Аслана. Крылаты слізнуў уніз, расправіў усе чатыры нагі, склаў крылы і прызямліўся лёгкім галопам. Потым ён спыніўся. Дзеці спешыліся. Дыгары пабачыў, як звяры, гномы, сатыры, німфы і іншыя расступіліся ўлева і ўправа, каб даць яму прайсці. Ён падышоў да Аслана, аддаў яму яблык і сказаў:

— Я прынёс вам яблык, які вы прасілі, сэр.

## Раздзел 14
# Пра тое, як пасадзілі дрэва

Выдатная праца,— прамовіў Аслан голасам, ад якога здрыганулася зямля.

І Дыгары зразумеў, што ўсе нарнійцы пачулі словы Аслана і што гэтая гісторыя будзе перадавацца ад бацькі сыну ў новым свеце сотні год і, магчыма, вечна. Але яму не пагражала заганарыцца, бо ён зусім не думаў пра гэта цяпер, калі апынуўся твар у твар з Асланам. Гэтым разам ён адчуў, што можа глядзець Ільву проста ў вочы. Ён забыўся на ўсе трывогі і пачуваўся цалкам задаволеным.

— Выдатна, сын Адама,— сказаў Леў ізноў.— Гэты плод каштаваў табе голаду, смагі і слёз. Толькі твае рукі мусяць пасадзіць зярнятка Дрэва, якое стане абаронай Нарніі. Кінь яблык у бок ракі, дзе глеба мяккая.

Дыгары зрабіў, як яму было сказана. Усе так сцішыліся, што можна было пачуць мяккі гук, з якім яблык упаў у глебу.

— І кінуў ты добра,— мовіў Аслан.— А цяпер пяройдзем да каранацыі Караля Фрэнка Нарнійскага і Хэлен, яго Каралевы.

Дзеці ўпершыню звярнулі ўвагу на гэтых дваіх. Тыя былі апранутыя ў дзіўныя і прыгожыя строі: з іх плячэй бруіліся багатыя мантыі, і чатыры гномы трымалі шлейф Караля, а чатыры рачныя німфы — Каралевы. На галовах у іх нічога не было. Хэлен распусціла валасы і ад гэтага стала выглядаць нашмат прыгажэйшай. Ды не валасы і не вопратка зрабілі іх такімі адрознымі ад тых, *якімі* яны *былі* раней. Іх твары мелі новыя выразы, асабліва твар Караля. Уся вастрыня, хітрасць і звадлівасць, якія прысталі да яго, калі ён быў лонданскім вознікам, здавалася, былі змытыя, і стала прасцей пабачыць адважнасць і дабрыню, якія ў яго былі заўсёды. Магчыма, на яго паўплывала паветра маладога свету ці размова з Асланам, ці тое і іншае.

— Шчыра скажу,— прашаптаў Крылаты на вуха Полі,— мой стары гаспадар змяніўся гэтак жа, як я! Зірніце толькі, цяпер ён сапраўдны гаспадар!

— Так, але не шапчы мне ў вуха,— сказала Полі.— Бо гэта вельмі казытна.

— Зараз,— загадаў Аслан,— хто-небудзь развяжыце вузел, які вы сплялі з тых дрэваў, і давайце паглядзім, што там.

Цяпер Дыгары пабачыў, што непадалёк шчыльна адно да аднаго раслі чатыры дрэвы, і іх галіны перапляліся паміж сабой такім чынам, што ўтварылася нешта накшталт клеткі. Двое Сланоў з дапамогай хобатаў і некалькі гномаў з дапамогай маленькіх сякер хутка ўсё разблыталі. Унутры было тры рэчы. Першая — маладое дрэўца, нібыта з золата, другая — маладое дрэўца, нібыта са срэбра, а трэцяй быў варты жалю суб'ект у бруднай вопратцы, які згорбіўшыся сядзеў паміж тымі дрэўцамі.

— Нішто сабе! — прашаптаў Дыгары.— Дзядзька Эндру!

Каб патлумачыць тое, што здарылася, трэба вярнуцца крыху назад. Звяры, як вы памятаеце, спрабавалі пасадзіць і паліць яго. Вада вярнула дзядзьку да прытомнасці, ён пабачыў, што наскрозь прамоклы, па сцёгны закапаны ў зямлю (якая хутка ператваралася ў бруд) і акружаны большай колькасцю дзікіх звяроў, чым калі-небудзь мог уявіць у сваім жыцці. Таму і не дзіўна, што ён пачаў крычаць і выць. У пэўным сэнсе гэта было добра, бо нарэшце ўсе пераканаліся (нават Дзік), што ён жывы. Таму жывёлы зноў адкапалі яго (штаны былі ў сапраўды жудасным стане). Як толькі дзядзькавы ногі былі вызваленыя, ён паспрабаваў уцячы, але Сланіха адным хуткім рухам абвіла хобат вакол яго таліі. Цяпер усе лічылі, што дзядзьку Эндру

варта дзесьці захаваць да таго часу, пакуль у Аслана будзе магчымасць прыйсці паглядзець на яго і сказаць, што з ім рабіць. Таму звяры сплялі навокал яго нешта кшталту клеткі ці сеткі. Потым яны прапанавалі яму ўсё, што, на іх погляд, было ядомае.

Асёл сабраў вялікі ахапак калючак і кінуў унутр, але не было падобна на тое, што дзядзьку Эндру яны цікавілі. Вавёркі закідвалі яго градам арэхаў, але ён толькі закрываў галаву рукамі і намагаўся схавацца. Птушкі лёталі туды-сюды, старанна скідваючы на яго чарвякоў. Самы шчодры быў Мядзведзь. Днём ён знайшоў гняздо дзікіх пчолаў, і замест таго, каб самому з'есці тое, што там было (а яму вельмі хацелася!), шляхетная істота прынесла гняздо да дзядзькі Эндру. Але гэта была найгоршая памылка. Мядзведзь перакінуў усю ліпкую масу праз вяршыню клеткі, і, на жаль, яна трапіла дзядзьку Эндру проста ў твар (там яшчэ былі жывыя пчолы). Мядзведзь, які зусім не быў бы супраць, калі б яго самога пляснулі сотамі па твары, не мог зразумець, чаму дзядзька Эндру адхіснуўся назад, паслізнуўся і сеў. І дзядзьку проста не пашчасціла, што ён сеў на купу калючак.

— Як бы там ні было,— сказаў Дзік,— шмат мёду трапіла ў рот гэтай істоты. Гэта мусіць прынесці ёй нейкую карысць.

Жывёлам пачынаў сапраўды падабацца іх дзіўны гадаванец, і яны спадзяваліся, што Аслан дазволіць ім пакінуць яго. Самыя разумныя цяпер былі амаль упэўненыя, што некаторыя гукі, якія вылятаі з яго рота, мелі значэнне. Яны ахрысцілі яго "Брэндзі", бо гэта ён паўтараў найчасцей.

Урэшце ім давялося пакінуць яго там на ноч. Аслан быў заняты ўвесь дзень, даючы ўказанні новым Каралю і Каралеве, займаючыся іншымі важнымі рэчамі, і не мог наведаць "беднага старога Брэндзі". З усіх арэхаў, персікаў, яблыкаў і бананаў, якія яму накідалі, атрымалася някепская вячэра, але нельга сказаць, што ён добра правёў ноч.



— Прывядзіце гэтую істоту,— загадаў Аслан. Адзін са Сланоў падняў дзядзьку Эндру хобатам і паклаў яго да лап Ільва. Дзядзька Эндру быў занадта спалоханы, каб варушыцца.

— Калі ласка, Аслан,— папрасіла Полі.— Ці можаш ты сказаць штосьці, каб ён... каб ён перастаў баяцца? І потым — ці мог бы ты сказаць штосьці, каб ён ніколі больш сюды не вярнуўся?

— Ты думаеш, ён захоча? — спытаўся Аслан.

— Ведаеш, Аслан,— сказала Полі,— ён можа паслаць кагосьці яшчэ. Яго так захапіла, што прут ад ліхтара вырас у дрэва-ліхтар, і ён думае...

— Яго думкі — вялікае глупства, дзіця,— мовіў Аслан.— Гэты новы свет пакуль што напаўняецца жыццём, бо спеў, якім я абудзіў яго, усё яшчэ лунае ў паветры і грукоча ў зямлі. Так будзе нядоўга. Але я не магу гэтага сказаць старому грэшніку, і я таксама не магу яго суцешыць; ён сам зрабіў так, што не здольны чуць мой голас. Калі я загавару з ім, ён пачуе толькі рык і роў. О, сыны Адама, як спрытна вы адгароджваецеся ад усяго, што можа пайсці вам на карысць! Але я дам яму адзіны дар, які ён яшчэ можа прыняць.

Леў засмучана нахіліў вялікую галаву і выдыхнуў у скрыўлены страхам твар чараўніка.

— Спі,— сказаў ён.— Спі і на некалькі гадзін адпачні ад усіх пакутаў, якія ты сам сабе стварыў.

Дзядзька Эндру імгненна перакаціўся на спіну, заплюшчыў вочы і спакойна засоп.

— Аднясіце яго ўбок і пакладзіце,— загадаў Аслан.— Цяпер, гномы, пакажыце сваё кавальскае майстэрства! Зрабіце дзве кароны для вашых Караля і Каралевы.

Больш гномаў, чым вы маглі б сабе ўявіць, паспяшаліся да Залатога Дрэва. Яны ў імгненне вока сарвалі ўсё лісце і адламалі некалькі галінак. Цяпер дзеці пабачылі, што дрэва не проста выглядала залатым, але было з сапраўднага мяккага золата. Вядома ж, яно вырасла з дзвюх залатых манетак, якія выпалі з кішэні дзядзькі Эндру, калі яго перавярнулі дагары нагамі; гэтаксама і срэбнае дрэва вырасла са срэбных. Здавалася, з ніадкуль узяліся кучы сухога галля для распальвання, маленькія кавадлы, молаты, абцугі і мяхі. У наступнае імгненне (як гэтыя гномы любілі сваю працу!) палаў агонь, мяхі раўлі, золата плавілася, малаткі грукаталі. Два Краты, якіх Аслан перад тым адправіў капаць (што яны любілі больш за ўсё), высыпалі да ног гномаў горку каштоўных камянёў. Пад спрытнымі пальцамі маленькіх кавалёў дзве кароны набылі форму абручоў, але яны былі не такія пачварныя і цяжкія, як сучасныя еўрапейскія кароны, а лёгкія, далікатныя, дасканалай формы. Яны сапраўды ўпрыгожвалі тых, хто іх надзяваў. Карона



Караля была аздобленая рубінамі, а Каралевы — смарагдамі.

Калі кароны астудзілі ў рацэ, Аслан загадаў Фрэнку і Хэлен апусціцца перад ім на калені і ўсклаў кароны на іх галовы. Потым ён сказаў:

— Падыміцеся, Кароль і Каралева Нарніі, бацька і маці шматлікіх каралёў, якія будуць кіраваць Нарніяй, Выспамі і Архэнлэндам. Будзьце справядлівымі, літасцівымі і мужнымі. Хай з вамі будзе дабраславенне.

Тут усе закрычалі: "Ура!", забрахалі, заржалі, затрубілі і залопалі крыламі, а каралеўская пара стаяла, выглядаючы ўрачыста і крыху сарамяжліва, што рабіла іх яшчэ больш высакароднымі. І калі Дыгары яшчэ вітаў Караля і Каралеву, ён пачуў, як глыбокі голас Аслана побач з ім прамовіў:



— Глядзіце!

Усе ў натоўпе павярнулі галовы і выдыхнулі ад здзіўлення і радасці. Непадалёк яны пабачылі дрэва, што ўзносілася над іх галовамі. Раней яго тут дакладна не было. Мусіць, пакуль усе былі занятыя каранацыяй, яно вырасла — ціха, але хутка, як сцяг, калі яго падымаюць на флагшток. Здавалася, што яго разложыстыя галіны адкідваюць святло, а не цень, і пад кожным лістом, нібы зорка, зіхацеў срэбны яблык. Але нават не ад выгляду, а ад паху, які ад яго ішоў, ва ўсіх заняло дыханне. Нейкі час ніхто не мог думаць ні пра што іншае.

— Сын Адама,— сказаў Аслан.— Ты добра пасеяў. А для вас, нарнійцы, абарона гэтага Дрэва будзе вашым першым абавязкам, бо гэта ваш Шчыт. Вядзьмарка, пра якую я вам казаў, уцякла далёка на поўнач свету, яна будзе жыць там, і яе цёмная магія будзе набіраць моц. Але пакуль гэтае Дрэва буяе, яна ніколі не прыйдзе ў Нарнію. Яна не наважыцца падысці да Дрэва бліжэй, чым на сотні кіламетраў, бо яго пах, які ёсць радасць, жыццё і здароўе для вас,— смерць, жах і адчай для яе.

Усе ўрачыста глядзелі на Дрэва. Раптоўна Аслан павярнуў галаву (калі ён зрабіў гэта, ад яго грывы ўпалі сонечныя блікі святла) і паглядзеў на дзяцей сваімі вялікімі вачыма.

— Што такое, дзеці? — спытаўся ён, бо ўбачыў, што яны перашэптваюцца і штурхаюць адно аднаго.

— О, Аслан, сэр,— адказаў Дыгары, чырванеючы.— Я забыўся сказаць табе. Вядзьмарка ўжо з'ела адзін з такіх яблыкаў, з якіх расце Дрэва.

Ён насамрэч не сказаў усяго, пра што думаў, але Полі адразу ж вымавіла гэта за яго (Дыгары заўсёды значна больш за яе баяўся падацца дурнем).

— Таму мы падумалі, Аслан,— сказала яна,— што тут мусіць быць нейкая памылка, і не можа быць, каб яна сапраўды не выносіла пах гэтых яблыкаў.

— Чаму ты так думаеш, дачка Евы? — запытаўся Аслан.

— Ну, яна з'ела адзін.

— Дзіця,— адказаў ён,— менавіта таму ўсе астатнія цяпер выклікаюць у яе жах. Так адбываецца з тымі, хто зрывае і есць яблыкі ў неналежны час і неналежным чынам. Плод добры, але потым ён выклікае агіду.

— Зразумела,— сказала Полі.— І раз яна сарвала яго не ў час, ён не спрацуе для яе. У сэнсе, не зробіць яе вечна маладой і ўсё такое?

— На жаль,— мовіў Аслан, хітаючы галавой,— зробіць. Рэчы заўсёды працуюць адпаведна іх прыродзе. Яна атрымала тое, чаго прагнула яе сэрца: цяпер яе сіла не паменшыцца, а дні не скончацца, як у багіні. Але калі ў цябе злое сэрца, бясконцыя гады толькі

падаўжаюць роспач, і яна пачынае гэта разумець. Усе атрымліваюць тое, чаго прагнуць, і ім не заўсёды гэта падабаецца.

— Я… я сам ледзь не з'еў адно, Аслан,— прызнўся Дыгары.— Ці я б…

— Так, дзіця,— сказаў Аслан.— Бо плады заўсёды дзейнічаюць, як мусяць дзейнічаць, але яны не ідуць на дабро нікому, хто зрывае іх, ідучы за ўласнымі жаданнямі. Калі б любы нарніец, без просьбы, скраў яблык і пасадзіў яго тут, каб абараніць Нарнію, ён бы абараніў. Але ператварыў бы Нарнію ў яшчэ адну моцную і жорсткую імперыю, як Чарн. І тады Нарнія не была б той добрай зямлёй, якой я яе задумаў. І Вядзьмарка спакушала цябе зрабіць інакш, сынок, ці не так?

— Так, Аслан. Яна хацела, каб я ўзяў яблык дадому, для маці.

— Зразумей, тады б яно ацаліла яе, але ні ты, ні яна не былі б шчаслівыя. Прыйшоў бы дзень, калі вы абодва азірнуліся б назад і сказалі б, што лепей бы яна памерла ад той хваробы.

І Дыгары не мог адказаць нічога, бо яго душылі слёзы, і ён пакінуў усе спадзяванні на тое, што можа захаваць жыццё сваёй маці; але ў той жа час ён разумеў: Леў ведаў, што магло б здарыцца і што могуць быць рэчы, больш жахлівыя за смерць дарагога чалавека. Але цяпер Аслан ізноў загаварыў, амаль шэптам:

— Вось што здарылася б, дзіця, калі б ты скраў яблык. Але зараз такога не адбудзецца. Тое, што я дам табе, прынясе радасць. У тваім свеце яно не дасць бясконцага жыцця, але дасць ацаленне. Ідзі. Сарві для яе яблык з Дрэва.

На секунду ўсе думкі Дыгары зблыталіся. Ён пачуваўся так, нібыта ўвесь свет перавярнуўся дагары нагамі. А потым, быццам у сне, ён пайшоў да Дрэва. Кароль і Каралева і астатнія стварэнні падбадзёрвалі яго. Ён сарваў яблык і паклаў у кішэню. Потым вярнуўся да Аслана.

— А ці можам мы цяпер адправіцца дамоў? — запытаўся ён.

Ён забыўся сказаць: "Дзякую",— але ён меў гэта на ўвазе, і Аслан зразумеў.

## Раздзел 15

# Канец гэтай гісторыі і пачатак усіх астатніх

— Вам не спатрэбяцца пярсцёнкі, калі я з вамі,— мовіў голас Аслана.

Дзеці міргнулі і азірнуліся. Яны зноў апынуліся ў Лесе Паміж Сусветамі. Дзядзька Эндру ляжаў на траве і ўсё яшчэ спаў; Аслан стаяў побач з імі.

— Хадзем,— сказаў Аслан.— Вам час вярнуцца назад. Але спачатку я хачу паказаць вам дзве рэчы: засцярогу і прыказанне. Паглядзіце сюды, дзеці.

Яны паглядзелі і ўбачылі ямінку з сухім дном, зарослым травой.

— Калі вы апошні раз былі тут,— загаварыў Аслан,— гэтае паглыбленне было азяркам, і, скокнуўшы ў яго, вы трапілі ў свет, дзе паміраючае сонца ззяла над руінамі Чарна. Цяпер азярка няма. Гэтаму свету

прыйшоў канец, нібыта ён ніколі і не існаваў. Хай нашчадкі Адама і Евы сцерагуцца.

— Добра, Аслан,— адказалі дзеці.

Полі дадала:

— Але наш свет не такі кепскі, як той, праўда, Аслан?

— Пакуль не, дачка Евы,— сказаў ён.— Пакуль не. Але вы робіцеся ўсё больш падобнымі да яго. І нельга выключыць, што нейкі злодзей з вашай расы вынайдзе сакрэт, такі ж жахлівы, як Непраўнае Слова, і выкарыстае яго, каб знішчыць усё жывое. І хутка, вельмі хутка, да таго, як вы пастарэеце, вялікімі народамі ў вашым свеце будуць кіраваць тыраны, якіх шчасце, справядлівасць і літасць турбуюць не больш, чым імператрыцу Джадзіс. Хай ваш свет сцеражэцца. А цяпер прыказанне. Так хутка, як толькі здолееце, забярыце ў свайго дзядзькі магічныя пярсцёнкі і закапайце іх, каб ніхто не змог ізноў імі скарыстацца.

Пакуль Леў казаў гэтыя словы, дзеці глядзелі яму ў твар. І раптоўна (яны так ніколі і не зразумелі, як гэта адбылося) ягоны твар стаў падобным да залатога мора, у якім яны плылі. І гэткая ласка і магутнасць ахінулі і напоўнілі іх, што дзеці адчулі, быццам ніколі дагэтуль яны не былі насамрэч шчаслівыя, ці мудрыя, ці добрыя, ці нават жывыя і прытомныя. Успамін пра той момант застаўся з імі назаўсёды. Таму ўсё сваё

жыццё, калі яны былі засмучаныя, ці напалоханыя, ці злосныя, яны думалі пра гэтую залатую дабрыню. І адчуванне, што яна ўсё яшчэ тут, зусім побач, дзесьці за паваротам ці за нейкімі дзвярыма, вярталася, і глыбока ўнутры яны ўпэўніваліся, што ўсё добра. У наступную хвіліну ўсе трое (дзядзька Эндру якраз прачнуўся) зваліліся ў шум, гарачыню і рэзкія пахі Лондана.

Яны стаялі на ходніку каля дзвярэй дома Кэтэрлі, і, за выключэннем таго, што Вядзьмаркі, возніка і каня больш не было, усё было дакладна такім жа, як і ў момант іх знікнення. Стаяў ліхтар без аднаго прута, валяліся рэшткі двухколкі, і заставаўся натоўп. Усе яшчэ размаўлялі, і людзі станавіліся на калені побач з параненым паліцэйскім, кажучы ўсялякія рэчы кшталту: "Ён зараз ачуняе", ці "Як ты, сябра?", ці "Доктар будзе тут вось-вось".

"Неверагодна! — падумаў Дыгары.— Уся прыгода зусім не заняла часу".

Большасць людзей шалёна азіраліся навокал, спрабуючы знайсці Джадзіс і каня. Ніхто не звярнуў аніякай увагі на дзяцей, бо ніхто не бачыў, як яны зніклі, і ніхто не заўважыў, як яны вярнуліся. Што да дзядзькі Эндру, з-за стану яго вопраткі і мёду на твары яго ніхто не мог бы пазнаць. На шчасце, уваходныя дзверы ў дом былі адчыненыя, і ў іх стаяла служанка,

якая назірала за відовішчам (ну і дзень быў у гэтай дзяўчыны!), таму дзецям было няцяжка запхнуць дзядзьку Эндру ўнутр яшчэ да таго, як хтосьці пачаў задаваць нейкія пытанні.

Дзядзька панёсся наверх па лесвіцы, і спачатку дзеці вельмі спужаліся, што ён адразу пойдзе на гарышча і захоча схаваць астатнія пярсцёнкі. Але ім не варта было хвалявацца. Ён думаў пра бутэльку, што была ў яго шафе, і адразу ж знік у сваім пакоі, замкнуўшы дзверы. Дзядзька Эндру зноў выйшаў адтуль у халаце (варта зазначыць, вельмі няхутка) і пайшоў наўпрост у ванную.

— Можаш узяць астатнія пярсцёнкі, Полі? — запытаўся Дыгары.— Я хачу пайсці да маці.

— Добра. Пабачымся пазней,— сказала Полі і загрукатала абцасамі па лесвіцы на гарышча.

Дыгары пачакаў хвілінку, каб аддыхацца, і ціха зайшоў у матчын пакой. Яна ляжала такая, як ён бачыў яе шмат разоў, абапіраючыся на падушкі, з тонкім, бледным тварам, гледзячы на які хацелася плакаць. Дыгары дастаў з кішэні Яблык Жыцця.

І дакладна як Джадзіс у нашым свеце выглядала не так, як у сваім, так і садавіна з горнага саду таксама выглядала інакш. Вядома, у пакоі было шмат каляровых рэчаў: каляровая капа на ложку, шпалеры, сонечнае святло з вакна і матчына прыгожая блакітная

начная кашуля. Але ў той момант, калі Дыгары выняў Яблык з кішэні, здалося, што ўсе рэчы ў параўнанні з ім зусім бляклыя. Усё, нават сонечнае святло, выглядала слабым і цьмяным. Яблык адкідваў зайчыкі на столь. Нішто іншае проста не было вартае ўвагі. І пах Яблыка Жыцця быў такі, нібыта ў пакоі было акно, што адчынялася ў Нябёсы.

— О, дарагі мой, які цудоўны яблык,— усміхнулася маці Дыгары.

— Ты з'ясі яго, праўда? Калі ласка,— сказаў Дыгары.

— Я не ведаю, што сказаў бы доктар,— адказала яна.— Але, думаю... ён бы дазволіў.

Дыгары пачысціў яблык, парэзаў і стаў даваць маці лустачку за лустачкай. І, толькі з'еўшы яго, яна



ўсміхнулася, адкінулася назад на падушку і заснула: сапраўдным, лагодным сном, якога яна прагнула больш за ўсё на свеце, без усялякіх гэтых агідных таблетак. І цяпер Дыгары быў упэўнены, што яе твар выглядаў крыху па-іншаму. Ён нахіліўся, вельмі асцярожна пацалаваў яе і выслізнуў з пакоя, забраўшы сарцавіну яблыка з сабой. Усю рэшту дня, калі ён глядзеў на рэчы навокал і бачыў, якія звычайныя і нечароўныя яны былі, ён амаль траціў надзею, але калі ўзгадваў твар Аслана, надзея вярталася да яго.

У той вечар ён закапаў сарцавіну ад Яблыка ў садзе за домам.

Наступнай раніцай, калі доктар прыйшоў на звычайны агляд, Дыгары перагнуўся праз парэнчы, каб паслухаць. Ён пачуў, як доктар выйшаў з цёткай Лэці і сказаў:

— Міс Кэтэрлі, гэта самы незвычайны выпадак, які я сустракаў за ўсю сваю медыцынскую практыку. Гэта... гэта як цуд. Зараз я нічога не буду казаць хлопчыку, не трэба абуджаць марных спадзяванняў. Але як на мяне...— тут яго голас стаў занадта ціхім, каб яго можна было пачуць.

Пасля абеду Дыгары спусціўся ў сад і прасвістаў сакрэтны сігнал, пра які яны дамовіліся з Полі (у яе не атрымалася вярнуцца ўчора).

— Як маецеся? — спыталася Полі, гледзячы паверх мура.— Я маю на ўвазе тваю маці.

— Я думаю, усё будзе добра,— адказаў Дыгары.— Але, калі ты не супраць, я не хацеў бы пакуль гаварыць пра гэта... А што з пярсцёнкамі?

— Я забрала ўсе,— сказала Полі.— Глядзі, усё добра, я ў пальчатках. Давай закапаем іх.

— Так, давай. Я пазначыў месца, дзе закапаў учора сарцавіну ад Яблыка.

Полі перапезла праз мур, і яны разам пайшлі туды. Але, як высветлілася, Дыгары не трэба было нават пазначаць месца. Там нешта праклюнулася. Яно не расло так хутка, як новыя дрэвы ў Нарніі, але ўжо добра паднялося над зямлёй. Яны ўзялі рыдлёўку і закапалі ўсе чароўныя пярсцёнкі, разам са сваімі, вакол дрэва.

Прыкладна праз тыдзень пасля гэтага стала дакладна зразумела, што маці Дыгары становіцца лепш. Праз два тыдні яна магла сядзець у садзе. А праз месяц увесь дом стаўся іншым. Цётка Лэці рабіла ўсё, што падабалася маці Дыгары: вокны расчынілі, затхлыя фіранкі адсунулі, каб асвятліць пакоі, паўсюль былі новыя кветкі, на абед гатавалі смачныя стравы, старое фартэп'яна наладзілі, і маці ізноў пачала спяваць і так гуляла з Дыгары і Полі, што цётка Лэці казала:

— Кажу табе, Мэйбл, з вас траіх ты найбольшае дзіця!

Калі справы ідуць кепска, вы заўважаеце, што звычайна яны ідуць усё горш і горш на працягу пэўнага часу, але, калі аднойчы справы пачынаюць ісці добра, яны часта становяцца ўсё лепей і лепей, не абмяжоўваючыся ў часе. Недзе праз шэсць тыдняў такога цудоўнага жыцця прыйшоў доўгі ліст ад бацькі з Індыі, у якім былі дзівосныя навіны. Стары стрыечны дзед Кёрк памёр, і гэта азначала, што бацька зрабіўся вельмі заможны. Ён збіраўся сысці на пенсію і назаўжды вярнуцца з Індыі дадому. І цяпер старажытны вялікі дом за горадам, пра які Дыгары чуў усё сваё жыццё, але ніколі не бачыў, будзе належаць ім; вялікі дом з рыцарскімі даспехамі, стайнямі, псярнямі, ракой, паркам, аранжарэямі, вінаграднікамі, лясамі і гарамі за імі. Так што Дыгары адчуваў, як адчуваў бы і кожны на яго месцы, што жыць яны цяпер будуць доўга і шчасліва. Але, магчыма, вы хацелі б даведацца яшчэ пра тое-сёе.

Полі і Дыгары заўсёды заставаліся добрымі сябрамі, і амаль кожныя вакацыі Полі прыязджала ў цудоўны загарадны дом Кёркаў; там яна навучылася ездзіць верхам, плаваць, даіць кароў, пячы і лазіць па дрэвах.

У Нарніі звяры жылі ў вялікім супакоі і радасці, і ані Вядзьмарка, ані які іншы вораг не турбаваў гэтую добрую зямлю шмат стагоддзяў. Кароль Фрэнк, Каралева Хэлен і іх дзеці шчасліва жылі ў Нарніі, і іх другі сын стаў Каралём Архэнлэнда.

Хлопцы жаніліся з німфамі, а дзяўчаты выходзілі замуж за лясных і рачных багоў.

Ліхтар, які пасадзіла Вядзьмарка (не ведаючы пра тое), ззяў у нарнійскім лесе дзень і ноч, таму тое месца, дзе ён рос, сталі называць Ліхтарнай Прагалінай, і калі праз шмат год іншая дзяўчынка з нашага свету трапіла ў Нарнію снежным вечарам, ліхтар усё яшчэ гарэў. І гэтая прыгода была ў нейкім сэнсе звязаная з тымі, пра якія я вам толькі што распавёў.

Гэта было так. Дрэва, якое вырасла з Яблыка, што пасадзіў Дыгары ў садзе за домам, стала вялікае і прыгожае. Яно расло ў глебе нашага свету, далёка ад гуку голасу Аслана і маладога паветра Нарніі, таму не прынесла яблыкаў, што маглі б вярнуць да жыцця смяротна хворую жанчыну, як гэта адбылося з маці Дыгары. Тым не менш, яго яблыкі былі прыгажэйшымі за ўсе іншыя яблыкі ў Брытаніі і былі надзвычай карысныя, нягледзячы на тое, што не былі цалкам чароўныя. Але ўнутры, у самай сваёй сарцавіне, дрэва (калі можна так сказаць) ніколі не забывалася на тое іншае дрэва ў Нарніі, ад якога яно

паходзіла. Часам яно загадкава варушылася, калі не было ветру. Я мяркую, гэта здаралася тады, калі ў Нарніі дзьмулі моцныя вятры, і ангельскае дрэва дрыжэла, бо нарнійскае дрэва гайдалася і гнулася пад моцным паўднёва-заходнім штармавым ветрам. Як бы там ні было, пазней высветлілася, што ў яго драўніне ўсё яшчэ была магія. Бо калі Дыгары быў даволі-такі сталага ўзросту (да таго часу ён стаў вядомым навукоўцам, прафесарам і вялікім вандроўнікам) і стары дом Кэтэрлі стаў належаць яму, па ўсім поўдні Ангельшчыны быў моцны шторм, які зламаў дрэва. Дыгары не мог дапусціць, каб яблыню проста пасеклі на дровы, таму зрабіў з часткі дрэва шафу, якую паставіў у сваім вялікім доме. І хаця ён сам не адкрыў чароўныя якасці той шафы, гэта зрабіў нехта іншы. Вось такі быў пачатак усіх вандровак туды і назад паміж Нарніяй і нашым светам, пра якія вы можаце прачытаць у іншых кнігах.

Пераехаўшы жыць у вялікі дом за горадам, Дыгары і яго сям'я забралі з сабой дзядзьку Эндру, бо бацька Дыгары сказаў: "Мы мусім паспрабаваць утрымаць старога ад шкоды, і гэта несправядліва, што бедная Лэці заўсёды мусіць клапаціцца пра яго". Дзядзька Эндру ніколі больш не спрабаваў аніякай магіі да канца свайго жыцця. Ён вывучыў урок і ў старым узросце стаў больш прыемным і менш эгаістычным

чалавекам, чым раней. Але ён заўсёды любіў завесці гасцей у більярдны пакой і распавядаць ім гісторыі пра загадкавую лэдзі, замежную каралеўскую асобу, з якой ён ездзіў па Лондане.

— У яе быў д'ябальскі характар,— казаў ён.— Але яна была шалёна прыгожай жанчынай, сэр, шалёна прыгожай жанчынай.

УДК 821.111-31
ББК 84(4Англ)-44
Л91

Серыя заснавана ў 2016 годзе
Заснавальнікі серыі Аляксей Шэін і Андрэй Кім

Пераклад з англійскай мовы Надзеі Кім

Lewis C.S.
The Magician's Nephew
G. B. : The Bodley Head, 1955.

Ілюстрацыі П. Бэйнс

ISBN 978-985-6983-76-7

© 1955 by C.S. Lewis Pte. Ltd.
© Кім Н.В., пераклад на беларускую мову, 2016
© Афармленне. ПВУП «Пазітыў-цэнтр», 2016

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Серыя «Добрая кніга»

**Льюіс** Клайв Стэйплз

**Хронікі Нарніі. Пляменнік чараўніка**

Аповесць

Адказны за выпуск С.В. Карнюшка
Рэдактары А.Г. Шэін, Н.І. Шэіна
Афармленне вокладкі Р.М. Сустаў
Камп'ютарны дызайн Ю.А. Прышывалка
Карэктар Н.Б. Кучмель

Падпісана да друку 29.07.2016.
Фармат 84х108/32. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,55. Ул.-выд. арк. 6,85. Тыраж 2000 экз.
Заказ 1986.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
Прыватнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Пазітыў-цэнтр».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў
№ 1/343 ад 05.09.2014, № 2/140 ад 28.05.2014.
Вул. Бельскага, 15-210/9, 220092, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
Тэл./ф. +375 17 380-00-24.

Пры ўдзеле Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюдніка друкаваных выданняў №2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.